Максім КЛІМКОВІЧ,
Уладзімір СЦЯПАН



*Максім Клімковіч нарадзіўся ў 1958 годзе ў Мінску. Аўтар і сааўтар кніг «Каханка Д'ябла, або Карона Вітаўта Вялікага», «Сцэнарый смерці», «Мяжа на даляглядзе» і інш... у тым ліку п'ес, сцэнарыяў дакументальных і мастацкіх фільмаў.*



*Уладзімір Сцяпан (Сцепаненка) нарадзіўся ў 1958 годзе ў г. п. Касцюкоўка на Гомельшчыне. Скончыў мастацкае вучылішча і тэатральна-мастацкі інстытут. Піша вершы, прозу, драматургію, кінасцэнарыі. Аўтар кніжак прозы «Вежа», «Сам-насам».*

# ЦЕНЬ АНЁЛА

***Раман***

## ЧАСТКА ПЕРШАЯ

## САРМАЦКІ ПАРТРЭТ

**Стрэлка спідометра калацілася адразу за лічбай «сто дзесяць». Фелікс смяяўся, як дзіця, ляпаў далонню па прыборнай панелі і ніяк не мог супакоіцца, дыхаў перарывіста, быццам паветра не хапала. А голас яго ледзь заўважна трымцеў.**

**— Ганна, мы іх уходалі. Увесь свет адкрыўся перад намі. Ён належыць толькі нам з табой. Усё атрымалася.**

**— Накінь рэмень, вар'ят, прышпіліся, — Ганна Мятліцкая мружыла вочы, углядалася ў цямрэчу начной шашы, прашытую перарывістай брудна-белай ніткай разметкі, але насцярожана-шчаслівая ўсмешка не сыходзіла і з яе твару.**

**Фелікс палез цалавацца.**

**— Не замінай, потым, усё потым...**

**Пацалунак трапіў у шчаку, потым за вуха. Перарывістая паласа ад хуткасці падавалася ўжо суцэльнай.**

**— А ты казала. Усё сышлося.**

**Ганна выціскала са старога опеля ўсё магчымае. Стрэлка перапаўзла лічбу «сто дваццаць». Фелікс расціснуў парожні пачак і павярнуўся, каб узяць з задняга сядзення куртку.**

**— Табе прыпаліць цыгарэту? — спытаў ён.**

**— Найн.**

**Фелікс зірнуў у задняе шкло і застыў.**

**— Што гэта там? Хто?**

**Ганна адразу патушыла фары і габарыты.**

**— Бачу.**

**— Гэта яны? — голас Фелікса выдаў спалох.**

**— А хто ж яшчэ?**

**— Недзе павінна быць гравійка, — прашаптаў Фелікс, і пачак выпаў з яго пальцаў.**

— Праехалі.

Далёка ззаду пульсавала, разрасталася сіняя кропка мігалкі. Фелікс глядзеў у задняе шкло на мігатлівае святло. Опель калаціўся на вузкай паласе асфальту, як самалёт перад самым узлётам.

— Давай жа, давай, — прасіла Мятліцкая сваю машыну і ціснула педаль газу. — Ды накінь ты рэмень! Я ж прасіла. Зараз павернем! — насустрач пабеглі пабеленыя слупкі, мільгануў знак «скрыжаванне», у полі цёмнай плямай прамалявалася вялікае дрэва.

Фелікс пацягнуў рэмень, зазірнуў Мятліцкай у твар і сур'ёзна прамовіў:

— Ганна, ты самае лепшае, што ў мяне ёсць. Чуеш? Нашто мне анёл? У мяне ж ёсць ты.

— Трымайся, паварочваем, — Ганна правяла далонню па вачах і ўчапілася ў руль.

І тут з цемры на ўратавальнае скрыжаванне выпаўз, стаў, не аб'ехаць, цяжкі вайсковы аўтамабіль з кунгам, доўгія антэны хіснуліся і застылі.

— Пся крэў, — выгукнула Ганна, можа, першы раз у жыцці, і сама здзівілася, адкуль прыйшлі да яе гэтыя словы.

Мятліцкая крутанула руль управа, легкавік кінула, пукатыя фары грузавіка мільганулі за бакавым шклом, дзверца з віскам дзеранулася аб магутны бампер, толькі жарынкі паляцелі. Пад коламі храбуснуў гравій. Опель не ўтрымаўся на ўзбочыне і паляцеў з адхону. Два разы перакуліўся і ляснуўся дзверцай у старое дрэва, што самотна стаяла пры дарозе. Таполю, аднаму не абхапіць, страсянула. На пакарабачаную машыну, як манеты на дамавіну, пасыпалася залатое лісце.

Стала ціха-ціха, быццам анёл праляцеў...

З кабіны грузавіка саскочыў на асфальт дужы мужчына ў чорным строі і ў кароткай скуранцы. Мужчына рвануў верхні гузік белай кашулі, брудна вылаяўся, кінуўся на поле да перакуленага легкавіка. Чаравікі на тонкай скуранай падэшве глыбока правальваліся ў свежую раллю.

Па фарбаваным метале кунга прабегліся мігатлівыя сінія цені, бліснула акенца. Мікрааўтобус істэрычна віскнуў тармазамі, спыніўся. Ён ледзь не ўплішчыўся ў борт грузавіка. Мігалка працягвала пульсаваць. Дзверца ад'ехала. Да перакуленага опеля падбеглі трое мужчын у доўгіх шэрых плашчах. Сівавалосы, які бег апошнім, крычаў у рацыю:

— «Хуткую», «хуткую» давай на пяцьдзясят трэці кіламетр. На скрыжаванне! Убачыце! Там нашы машыны!

Неўзабаве са скавытаннем сірэны прыімчала «хуткая», а за ёй «аварыйная». Завішчэў алмазны дыск пілы, паляцелі зыркія жарынкі, заклацалі гідраўлічныя абцугі, пасыпаліся рэшткі выбітага шкла. Скрываўленага мужчыну з пакарабачанай машыны дасталі хутка. Ён быў нежывы.

Гідраўлічныя абцугі перацялі дзвярныя стойкі. Медык нажніцамі перарэзаў рэмень. Сівавалосы прытрымаў заляпанае гразёй крысо плашча, прысеў, зірнуў на збялелы жаночы твар, на якім застыла здзіўленая ўсмешка. Сівавалосы ўзяў цёплую руку Ганны і намацаў пульс. На яго твары адбілася непаразуменне. Вочы Мятліцкай былі нерухомыя.

Медыкі — два мужчыны і жанчына, абярэжна паклалі Ганну на насілкі. Медык запхаў у нагрудны кішэнь стэтаскоп.

— Што скажаце, доктар? — асуджана прамовіў сівавалосы.

— Я не Гасподзь Бог. У машыну яе! Хутчэй! Паспрабуем.

Насілкі подбегам панеслі на шашу, дзе стаяў рэанімабіль.

— Марат, Макс, за справу, — сівавалосы аддаў загад сваім людзям і пакрочыў следам, ногі гразлі ў вільготнай раллі, ён цяжка задыхаў у мабільнік.

— Мы іх узялі. Фелікс Рэй загінуў. Адно дрэва ў полі было, а яны яго «злавілі». Будзем шукаць.

**Знявечаны опель паставілі на колы. Рабочым у сініх камбінезонах загадалі адысціся ажно на шашу.**

**Мужчыны скінулі плашчы, запалілі ліхтарыкі, узяліся няспешна і старанна абшукваць машыну, бессаромна перабіраць жаночыя апранахі. На кроў у салоне не зважалі, як быццам і не бачылі яе.**

**Рэанімабіль пранізліва скавытнуў сірэнай, паімчаў да горада.**

**— Яна павінна жыць, — сказаў, як загадаў, сівавалосы, ён сядзеў у куце рэанімабіля на маленькім адкідным крэсле і круціў у пальцах мабільнік.**

**З трэцяй спробы сэрца Ганны Мятліцкай тахнула — адказала на электрычны разрад.**

**— Ёсць! Пайшло! Вашыя б словы, ды... — азартна азваўся медык.**

**— Я не веру. Рабіце ўсё магчымае і немагчымае.**

**Доктар зрабіў Ганне ін'екцыю, паставіў кропельніцу, далі кіслarод. Са шпіталя паведамілі, што рэанімацыйны бокс падрыхтаваны ўжо.**

**— ...выпадак цяжкі. У непрытомнасці. Пульс няпэўны, перарывісты. Знешніх пашкоджанняў няма. Нават драпіны ніводнай. Але ціск падае, няўстойлівы, — паведаміў у рацыю доктар.**

**— А мозг? — выдушыў з сябе пытанне сівавалосы.**

**— Не магу сказаць дакладна. Імпульсы ёсць.**

**За жыццё Ганны змагаліся да рання. Рэаніматолага хістала. Ён выйшаў у калідор, прыціснуўся спінай да сцяны, потым сеў на падлогу і выпрастаў ногі ў бліскучых пластыкавых чунях. Медсястра падала яму запаленую цыгарэту і вільготнай сурвэткай абцёрла заліты потам твар. Сівавалосы чакаў, шэры плашч ляжаў на самотным пластыкавым крэсле. Медык дапаліў цыгарэту да паловы, страсянуў попел на падлогу.**

**— Баба маладая — жыць будзе. Хадзіць не зможа — сто пудоў. Відаць, цэнтральны нерв пашкоджаны.**

**— А гаварыць?**

**— Гэтага я не ведаю. Тут ужо як карта ляжа, дарагі мой чалавек.**

**— А калі яе ў сталіцу перакінуць? У інстытут да прафесуры?**

**— Ну хіба пад вашу адказнасць. Але не раіў бы. Упэўнены, не даедзе. Яна зараз паміж жыццём і смерцю целяпаецца.**

**— А тое, што хадзіць не зможа... — сівавалосы хмыкнуў. — Не ўцячэ.**

**— Што яна ўтварыла?**

**— Чалавека забіла.**

**— Дарэчы, з ёй не ўсё так проста. Жанчына цяжарная. На трэцім месяцы.**

**— Гэта нічога не мяняе.**

**Сівавалосы павярнуўся, надзеў плашч, узяўся гаварыць па мабільніку. Медык паглядзеў на яго крыху здзіўлена, размова ішла па-нямецку. Дзверы рэанімацыйнага бокса адчыніліся. Санітары і дактары пакацілі каталку. Сівавалосы саступіў, прыціснуўся да сцяны, і яму падалося, што тонкія бяскроўныя пальцы Ганны Мятліцкай ледзь заўважна рухаюцца, пастукваюць па прасціне, быццам кранаюць кнопкі нябачнай клавіятуры.**

*...цяпер, калі ён побач, калі я гавару з ім, то разумею, што здарылася тады — у 1926-м годзе і нават тое, што раней. Але ён не расказвае, што будзе потым. Хаця, напэўна, ведае... Я збіралася ў Мсціслаў даўно. Але адна справа збірацца, зусім іншая — усё кінуць і паехаць. Я памятаю той вечар. Сядзела дома. На вуліцы сыпаў дождж, нікуды не хацелася ісці. Міргнула і згасла святло, згарнуўся экран тэлевізара, сцямнеў манітор камп'ютэра. Усё страціла колеры. І толькі стары партрэт на сцяне, залітай жоўтым святлом ліхтара, выдаваў жывым, глядзеў на мяне. Ён адзінае матэрыяльнае, што засталося мне ў спадчыну ад продкаў. Я не ведаю, хто намаляваны на дошцы. Але бабуля казала, што ён вельмі падобны да майго прадзеда Станіслава, якога яна*

*ніколі не бачыла. Я кранула далонню гладкую паверхню, адчула цеплыню, што сыходзіла з сярэдзіны, нібыта пад фарбай, як пад скурай, бегла гарачая кроў. Такое бывае, калі бярэш у рукі фотаздымак роднага і дарагога табе чалавека. Я кінула ўсе справы: пільныя і не вельмі, выгодныя і стратныя. Легла спаць шчаслівая і спакойная. А на раніцу прахапілася без званка будзільніка. Хутка паснедала. А праз гадзіну ўжо выязджала з Мінска па Магілёўскай трасе. Восень, ранішні туман, слізкая дарога, засыпаная мокрым лісцем, а мне было добра. Гэта здарылася напярэдадні Дзядоў. Ніякай містыкі ў тым, што адбываецца, я тады не згледзела. Я ехала на ўсход у той горад, адкуль восемдзесят гадоў таму...*

На сцяне кармеліцкага касцёла, збудаванага ў Мсціславе ў гонар Дзевы Марыі, ёсць дзве фрэскі. На адной невядомы жывапісец, мяркуючы па стылі, італьянец, намаляваў захоп горада Мсціслава ў 1654 годзе войскамі князя Трубяцкога. На другой — жахлівай у сваёй выразнасці — разню мсціслаўскіх ксяндзоў. Ворожыя войскі, калі захапілі і падпалілі горад, выразалі ўсіх, ці не да апошняга, каталіцкіх святароў. Катавалі, шукалі схаваныя імі скарбы. Перастараліся каты князя Трубяцкога, занадта шчыравалі, сэрца апошняга немаладога манаха-езуіта не вытрымала. Зайшоўся чалавек ад нясцерпнага болю, сканаў.

Скарб шукалі доўга і ўпарта. І хто толькі не шчыраваў у спадзяванні на зменлівую ўдачу. І мясцовыя рупліўцы, і з ваколіц людзі, і прыезджая набрыдзь. Нават гісторыкі з імператарскай акадэміі навук на тое золата езуіцкае надзею мелі. Абстуквалі муры малаточкамі зграбнымі, дзіркі ў каменні свідравалі, тынкоўку адкалупвалі, планы кляштараў наноў малявалі, падлікі рабілі, дзе ён, той ход падземны, можа знаходзіцца-хавацца, які да скарбаў прывядзе. Супакоіла скарбашукальнікаў, астудзіла галовы гарачыя рэвалюцыя, а за ёй следам — грамадзянская вайна. Тады не да скарбаў, не да золата ксяндзоўскага рызыкантам стала. Пра сваё ўласнае жыццё прыйшоў час паклапаціцца. Якія тут скарбы могуць быць, калі ў любы момант самога заб'юць і нават імя не спытаюць...

За доўгія гады беспаспяховых пошукаў — фактаў, якія б абвяргалі існаванне вялікага скарба, не дадалося. А вось тых, якія пераконвалі ў існаванні езуіцкага золата, адно толькі пабольшала.

Падзеі 1654 года адсунуліся ў часе далёка-далёка, але не забыліся...

*...пакуль афіцыянт-турак не пачаў нахабна ўсміхацца, ён здаваўся мне прыемным. І чаму гэта людзі так радуюцца, калі ў іншых канчаюцца грошы? Ён вярнуў маю картку так, быццам яна выпэцкана кетчупам. Добра, што засталося крыху наяўных. Больш у гэтае кафэ не пайду. Хоць кава там і лепшая, чым у гатэлі. Немцы каву гатаваць не ўмеюць, у адрозненне ад італьянцаў... Варта было набраць нумар. «Кілбаснік» схапіў слухаўку імгненна. І праз паўгадзіны я ўжо спакойна расплачвалася за новыя пальчаткі той жа крэдыткай. Схема працуе, і гэта прыемна. Заўтра пасля архіва спецыяльна прыйду ў тую кавярню, замоўлю келіх рэйнскага. Заслужыла. Буду піць яго доўга-доўга, а калі падам картку, то нахабна ўсміхнуся, гледзячы проста ў твар. І калі турак нешта вякне, падзяру, як той Тузік шапку...*

Скарб, а гэта два пуды золата, ды камяні каштоўныя ў дубовым куфэрку з абабітымі меднай бляхай кантамі і з жалезнымі каванымі ручкамі, знайшоўся выпадкова. Восень. Дажджы. Вада ў Віхры пацямнела, зрабілася рудой, каламутнай і паднялася. Хуткаплынная Віхра злосна надзьмулася, забулькацела на вірах... Падмыла высокі бераг непадалёку ад касцёла ў гонар Дзевы Марыі. Стромы бераг ракі абрынуўся. Куфэрак вытыркнуўся, аказаўся навідавоку. Стаў бачны, рыхтык тая разынка, бяры не хачу. Вечка адвалілася — золата заблішчэла, заззяла...

Стрыечныя браты Маліноўскія — Якуб з Раманам — аказаліся побач, калі абсыпалася, валілася зямля. Шукалі рабую цялушку на беразе ў хмызах. Убачылі той куфэ-

рак — на цялушку забыліся. Звар'яцелі мужчыны. Пачалі хапаць, дзяліць, біцца. Усчаліся гвалт, крык. Пацякла крывя з разбітых насоў, рассечаных броваў...

Не, каб па-разумнаму, па-людску... Ціхенька ды спакойненька сабраць, без ляманту і лаянкі, згрэбці, спарадкаваць, а потым хуценька занесці чым далей ад зайздросных вачэй. А там, у зацішку, на дзве гурбы раскласці. Золата таго ксяндзоўска-езуіцкага — два пуды, падняць цяжка. Але засціў вочы братам Маліноўскім шалёны бляск манетаў, крыжоў, кубкаў, ланцужкоў — забраў розум, асляпілі ззяннем ліхаманкавым камяні каштоўныя.

Мсціслаўскія чэкісты ў рудых шынялях і з чорнымі наганамі схапілі скрываўленых братоў на беразе, калі тыя качаліся па зямлі, ірвалі адзін аднога, як тыя сабакі шалёныя. Прыцягнулі ў прапахлыя порахам і махоркай кабінеты. Доўга не гаманілі. Нават не білі Маліноўскіх. Браты і так да смерці пералякаліся, усё, што трэба было, хутка падпісалі, не спрачаліся. У сутарэннях загадалі Маліноўскім да сподняга распрануцца. А калі распрануліся — прымусілі басанож тупаць па каменнай падлозе ў далёкі канец, да сцяны, пасечанай кулямі, спрэс у брудных пісягах. Грымнулі стрэлы, раскаціліся рэхам пад скляпеннямі. Маглі Язэп з Раманам займець па шаснаццаць кілаграмаў золата на брата, атрымалі толькі па дзевяць грамаў свінца ў патыліцы...

Нават сваякам целы расстраляных чэкісты не аддалі, каб хоць пахавалі няшчасных па-людску. Паведамілі толькі, што быццам выправілі Маліноўскіх з канвоем у Ходасы, а адтуль, цягніком, завязуць у Смаленск да начальства.

* * *

Высокі мужчына ў накінутым на плечы чорным бушлаце стаяў пры акне і глядзеў праз каламутнае шкло на вуліцу. Ён быў нявыспаны, стомлены, і ўсё яму не падабалася. Ні гарадок на беразе Віхры, ні восеньскае надвор'е, ні памочнікі-падначаленыя, нішто не радавала яго душу.

Ён паставіў на шырокае падаконне шклянку ачахлай гарбаты і правёў далонямі па твары, быццам слёзы выціраў. Зашаргацела пад пальцамі трохдзённая шчэць. Мужчына, а яму было гадоў пад сорак, зморшчыўся, прыпухлая шчака тарганулася. Нясцерпна балеў зуб, а мсціслаўскага доктара, немаладога і ветлівага, які б мог дапамагчы, два тыдні таму — расстралялі. Мужчына запаліў, зацягнуўся. Дым пачаў есці вочы. Ён сам і падпісваў той загад. Махануў хімічным алоўкам у правым верхнім рагу — дантыста як ворага пралетарскай рэвалюцыі і ліквідавалі. А калі б не расстралялі, у гэтым сумневу не было, дантыст са сваім золатам збег бы з Мсціслава далёка-далёка. Атрымліваецца — правільна зрабілі. Не зусім, бо вельмі баліць зуб, і пайсці няма да каго. Галоўны мсціслаўскі чэкіст расціснуў недапалак аб донца парцалянавай попельніцы і пакратаў пальцамі хворы зуб. Застагнаў ад нясцерпнага вострага болю.

— Слухаю! — заскочыў у кабінет начальніка з перадпакоя малады чэкіст у рыпучай скуранцы і брудных ботах.

Галоўны чэкіст глядзеў на падначаленага няўцямна, як на знаёмую, але не вельмі патрэбную рэч.

— Што, ніяк не адпускае? — пацікавіўся падначалены і хацеў было скрушна ўздыхнуць, каб дадалося ў голасе яшчэ больш спачування і спагады да начальніка.

— Каб ён праваліўся. Моцны — нават не хіснецца. Тырчыць сабе, нібы слуп. Ні есці няма як, ні гаварыць, — расцягваў словы начальнік.

— Эх! — пачулася ў адказ.

— З Масквы тэлеграма ёсць? — прашаптаў галоўны чэкіст, пагрукаў кулаком па падаконні і застагнаў.

— З Магілёва з віншаваннямі адна, з Ходасаў дзве, а з Масквы няма, таварыш Маркаў.

— А са Смаленска бранявік выйшаў? Ці, можа, яны думаюць, што я золата тое ксяндзоўскае на калёсах павязу, ці на карку пацягну!

— Адстукалі ж, быццам сёння і пашлюць да нас браніраванае аўто, — хуценька, каб не злаваць начальніка, адказаў і вінавата ўсміхнуўся малады чэкіст.

— Што яны сабе там думаюць... Ы-Ы-Ы! — чмялём загудзеў-закруціўся па кабінеце і раптам змоўк, прыцiснуў далоні да сцюдзёнага шкла, тварам прыпаў да шыбіны, пачаў мружыць ніцаватыя вочы, міргаць.

Па другім баку вуліцы ўпэўнена крочылі трое мужчын — усе нетутэйшыя. Два вышэзныя, у доўгіх шынялях і скураных кепках-васьміклінках. Паперадзе малайцавата, як на парадзе, адбіваў крок шнураванымі чаравікамі, на калюгі не зважаў, падцягнуты малады чалавек. Чорнае скураное паўпаліто, кепка, на правым баку жоўтая драўляная кабура, а твар бледны, як мукой прыцярушаны.

— Хто такія ёсць? — прашаптаў Антон Маркаў да падначаленага.

Пытанне прагучала крыху спалохана.

— Не нашыя таварышы. Такіх у нас няма. Сюды кіруюцца.

— Не сляпы, пакуль яшчэ бачу. — Начальнік мсціслаўскіх чэкістаў на свой хворы зуб перастаў зважаць — так напружыўся і зацікавіўся.

Неўзабаве грымнулі цяжкія дзверы, і на брудны паркет кабінета ступіў мужчына ў каштанавым скураным паўпаліто і шнураваных фарсістых ангельскіх чаравіках. У перадпакоі забразгала зброя, загрукацелі табурэткі.

— Станіслаў Краеўскі, — незнаёмец зрабіў крок, уздыхнуў і спыніўся.

Ён назваўся так, быццам пра яго павінны былі ведаць, колка глянуў у вочы Антону Маркаву, як выпрабоўваў. — Ад таварыша Дзяржынскага Фелікса Эдмундавіча, з Масквы.

Усё сказанае прагучала з ледзь заўважным польскім акцэнтам.

Гаспадара кабінета як токам працяла. Ён падхапіўся, да госця падляцеў. Парукаліся моцна. Як даўно знаёмымі былі. Пальцы мсціслаўскага чэкіста захрубасцелі, як той сухі венік

Пакуль мсціслаўскі чэкіст прыходзіў у сябе, Станіслаў Краеўскі спрытна выхапіў з кішэні паліто паперку і падаў яе.

Гаспадар кабінета вывучаў той мандат і пячаткі новага ўзору з размашыстымі подпісамі доўга, адно што на лямпу глядзець не стаў.

— Даруйце, таварыш дарагі, самі разумееце.

— Тэлеграму з Масквы атрымалі? — Краеўскі паправіў кабуру.

— Каторую?

— Што ж яны сабе думаюць, свята святам, разумею... Відаць, прабіцца не могуць. Тэлеграму вам, таварыш Маркаў, павінны былі яшчэ ўчора даслаць, — незадаволена і крыху нервова прамаўляў Краеўскі.

Маркаў прыдзірліва працягваў вывучаць дакумент, адно не нюхаў. Станіслаў Краеўскі незадаволена паглядзеў на гадзіннік у куце кабінета.

— Так, — прамовіў і перавярнуў паперку Маркаў.

На адваротным баку мандата, акрамя бэзавай плямкі, нічога цікавага не знайшлося. Маркаў глянуў на маскоўскага госця, як выбачаўся позіркам.

— Не хвалюйцеся, глядзіце. Хто ж пярэчыць?

— І я кажу сваім падначаленым заўсёды. Ад Фелікса Эдмундавіча яшчэ да рэвалюцыі аднойчы чуў. Больш паперы — чысцей задніца. Даверлівыя яны, маладыя... горкага вопыту пакуль не назапасілі, як мы.

— Між іншым. Задумаўся. А як пра таварыша Дзяржынскага згадалі... Вам ліст. Прасілі ў рукі аддаць.

Гаспадар кабінета наструніўся, калі атрымаў заклееную капэрту са сваім прозвішчам, паднёс бліжэй да святла і далей ад вачэй.

— Што, зуб спакою не дае? — прагучала пытанне, спачуванне ў голасе Краеўскага адсутнічала цалкам.

— Звар'яцець можна, трэцюю ноч заснуць не магу, — таропка паскардзіўся і ўзяўся раздзіраць капэрту чэкіст.

Пальцы ад хвалявання заўважна калаціліся.

— Таварышаў накарміць трэба. Латышскія стралкі, з крамлёўскай аховы. Па-нашаму амаль не гавораць, а яно можа і лепш. Адданыя справе да апошняга, — сказаў падкрэслена гучна госць і агледзеў кабінет, вялізны, як той школьны клас.

Станіслаў Краеўскі нібыта шукаў, дзе можна прылегчы адпачыць.

— Сядайце, дзе зручней, як дома, не зважайце. Я хоць вокам ліст той хуценька прабягу, — узбуджана прапанаваў гаспадар кабінета.

З кожным радком, з кожным словам яго стомлены твар святлеў, як гады зляталі з яго, нават зморшчынкі паразгладжваліся. Госць стаяў перад люстэркам і касцяным грабеньчыкам прыводзіў да ладу сваю фрэзуру, разглядаў бледны твар і сачыў, як хутка мяняецца выраз твару гаспадара вялізнага і халоднага кабінета. Краеўскі падышоў да аднаго з вокнаў і пачаў разглядаць незнаёмы краявід.

— Прашу прабачэння, таварыш Маркаў, а што гэта там такое за дрэвамі гарыць? — Станіслаў Краеўскі ўглядаўся ў паўзмрок.

— Агітатары да нас прыехалі. Паветраны шар спрабуюць надзімаць. Аказваецца, што справа складаная вельмі, — галоўны мсціслаўскі чэкіст нават ад ліста вачэй не адвёў, калі казаў пра агітатараў.

— Хто такія? — у голасе Станіслава Краеўскага прагучалі сапраўдная жорсткасць, насцярожанасць і заклапочанасць.

— Не хвалюйцеся, сам дакументы прагледзеў-праверыў, з палівам нават таварышам дапамог для іхняга прымуса, і з харчамі...

— Упэўненыя?

— Так. Сапраўды надзейных мала, на франтах палеглі, — пасміхаўся гаспадар кабінета сваім прыемным успамінам. — А вы даўно з ім знаёмыя?

— Даўно. Яны з маім бацькам разам катаргу адбывалі. Ён мяне на руках нёс, калі я з каня паляцеў і нагу зламаў.

— Зразумела. Зайздрошчу, нават вельмі.

*...рабіць падарункі самой сабе — апошняя справа. Але хто лепш за мяне ведае пра мае мары?! Вось і пачуваюся гідка, калі даводзіцца нешта «выпрошваць» у іншых. Знайсці б таго, хто б ведаў мае патаемныя жаданні. Вось, як прадавачка Грэта — памылілася адно з памерам. А станік — тое, што трэба. Я ўсміхнулася і нават нічога не сказала. І яна тут жа прынесла мой памер. Неўзабаве з'язджаць. Прывязу копію акта куплі-продажу дома ў саксонскім Schaunfeld ад 1801 года. Прозвішча амаль такое ж: Fastman — Фасманскі. Кілбаса — Wurst. Мой «кілбаснік» фольксдойчэ будзе задаволены. І дорага ж гэты падарунак яму стане — «алістакрат галімы»...*

— Сокал! — раптам гукнуў чэкіст свайго памочніка.

— Слухаю, — падляцеў, спыніўся сярод пакоя падначалены.

На шыі, як у краўца-габрэя метр, вілася папяровая стужка. Ён паглядзеў спачатку на свае брудныя боты, потым на шыкоўныя чаравікі госця, а потым на павесялелы твар начальніка.

— Вам. З Масквы, — сказаў і перадаў стужку.

— Краеўскі, Пельш, Ліндэрган... — варушыў вуснамі мсціслаўскі чэкіст.

— Заўтра раніцай выйдзе машына, — маладзён перадаў другую стужку.

— Арганізуй латышскім таварышам вячэру добрую і начлег спраўны, і глядзі мне — каб клапоў не было.

— А таварышу...

— Не твой клопат, Сокал. Таварыш Краеўскі ў мяне спыніцца.

Малады чэкіст выскачыў з кабінета і прычыніў цяжкія дзверы.

— Мянушка такая геройская — Сокал? — пацікавіўся Краеўскі.

— Чаму мянушка? Прозвішча — сапраўднае, мясцовае.

— Я хацеў бы адразу спіс глянуць, калі не цяжка. Уласна кажучы, дзеля гэтай спра-

вы мяне сюды і выправілі з паўнамоцтвамі. Ад іншых аператыўных мерапрыемстваў адарвалі. Сам не зробіш, ніхто не зробіць.

— Яно так. Але ж вы з дарогі, можа, арганізуем вячэру, пасядзім, а потым і да справаў. Пра Маскву хацелася б пачуць, як ды што там, якія змены.

— У Маскве халодна і нястача. Але заводы і фабрыкі працуюць, а цяжкасці — з'ява часовая. Тут у вас з Масквы ці ёсць хто? Можа, нашыя знаёмыя таварышы? — спытаўся Станіслаў Краеўскі і паправіў цяжкую кабуру.

Ён працягваў глядзець у акно на зыркае полымя.

— А я ўсё думаю, галаву кручу, тэлеграмы ці загада з Масквы чакаю. Каб вы не прыехалі, заўтра б з раніцы чарговую склаў і адправіў. Самі ж разумееце, як яно з золатам сядзець у няведанні, — Маркаў выцягнуў з шафы кардонную тэчку і паклаў на стол. — Тут усё да месца. З паперамі ў мяне заўжды поўны парадак.

Яму хацелася зноў згадаць Дзяржынскага, але чэкіст гэтым разам стрымаўся. Маркаў калупнуў матузкі нязграбнымі пальцамі і паспрабаваў развязаць зубамі. Ускрыкнуў рэзка, нервова, як кіпенем на руку плёхнулі.

Краеўскі наблізіўся і загадаў Маркаву сесці. Той паслухмяна апусціўся ў крэсла і паклаў рукі на калені.

— А вы што, доктар? Разумееце ў гэтай справе? — насцярожана пацікавіўся.

— Досвед такі-сякі маю, але не доктар. Вам дапамагчы паспрабую. Які зуб?

— Гэты, — шырока разявіў рот чэкіст.

— Закрыйце вочы і сядзіце нерухома. Калі атрымаецца, праз чвэрць гадзіны вы пра боль забудзеце, але раю да спецыяліста звярнуцца і не зацягваць.

— Ыгы... Рас — тра — ля — ўўўў....

Дужыя пальцы Краеўскага прайшліся спачатку па шыі, спыніліся, нешта намацалі і цісканулі. Боль быў рэзкі, але імгненны. Як падалося Маркаву, ён на завяршэнне працэдуры атрымаў пстрычку ў лоб.

— Як, усё? — хворы страсянуў галавой, з недаверам, але без рэвалюцыйнай пададзронасці, зыркнуў на Краеўскага, той раскрыў партсігар і задумаўся.

— Калі ласка, паліце. Вось спіс.

Краеўскі пакруціў у пальцах крамную цыгарку, але паліць перадумаў. Узяў спіс і сеў да стала. Побач паклаў зброю. Гаспадар пстрыкнуў выключальнікам, прайшоўся ад сцяны да сцяны. Колькі разоў узмахнуў рукамі.

— Наладзяць шар абавязкова. Свята ж заўтра, мітынг, аркестр, а між іншым, зуб адпусціла... Як гэта вы так? Цісканулі і гатова... — Маркаў хаўкаў ротам, плямкаў, як рыбіна, выпрабоўваў сківіцы.

— Трэба ведаць дзе ціскануць — і ўся навука. Золата дзе знаходзіцца?

— Пад надзейнай аховай, можна не хвалявацца, дарагі вы мой таварыш, чацвёра чэкістаў другі тыдзень пры ім, на крок не адыходзяць, а ключы пры мне. Спецыяльна з зямельнага банка сейф сюды перавезлі. Там ён не трэба. Зямля сялянам, а заводы, вядома ж, пралетарыяту... Эх! Як добра ўсё раней было, я на бронецягніку камісарам быў. З Феліксам Эдмундавічам у Гомлі мяцеж душылі... Хоць пагалюся з вашай дапамогай да свята. Шэсць гадоў праляцела, як адзін дзень, — летуценна прамовіў мсціслаўскі чэкіст і праз плячо зазірнуў на паперы, якія застылі ў руцэ Краеўскага. — Нешта не так?

Спіс каштоўнасцяў уяўляў сабой шэсць старонак друкаванага тэксту. На апошняй, у самым нізе — шэсць подпісаў і пячатка. Друкарская машынка прабівала літару «о» наскрозь, а таму папера выглядала як тое сіта, бо слова золата сустракалася ў кожным радку.

— Выдатна, — прамовіў Станіслаў Краеўскі.

— Не сядзім, рукі склаўшы. Так і перадайце таварышам. Робім усё, што можам. Бывае, і па тыдню боты не здымаем. Спім стоячы.

— Заўтра раніцай, — амаль шэптам вымавіў Краеўскі. — Спадзяюся... Разумееце, што ніводны чалавек ведаць пра гэта не павінен.

У адказ Маркаў задаволена кіўнуў. Зуб не балеў абсалютна, і яму хацелася зрабіць Краеўскаму што-небудзь добрае, прыемнае, запамінальнае. Але ён не паспеў нават прыдумаць. У кабінет імкліва ўвайшоў Сокал.

— Ну? — агледзеў падначаленага Маркаў.

— Тэлеграф не працуе.

Краеўскі паглядзеў на Маркава з непаразуменнем, нібыта той вінаваты.

— Не хвалюйцеся, такое ў нашым горадзе бывае. Не часта, але здараецца. Магчыма, вецер. Да заўтрашняга дня наладзім, — гэтая фраза хутчэй адносілася да падначаленага і прагучала як загад. — А з таварышамі як?

— Пасяліў, размясціў, забяспечыў, але яны вырашылі прайсціся...

* * *

Агітатары сядзелі за вячэрай, калі да іх у пакой увайшлі без папераджальнага груката ў дзверы трое ўзброеных мужчын: адзін у скураным паўпаліто, а двое маўклівых і пахмурных у доўгіх шынялях. Размова атрымалася кароткай і добразычлівай, гаварыў пераважна малады маскоўскі чэкіст. Ён найперш праверыў дакументы агітатараў, а потым пачаў распытваць пра шар, паліва да яго, і якую вагу іхні шар зможа падняць у паветра. Агітатары тлумачылі з сапраўдным энтузіязмам... Чэкіст з бледным тварам аказаўся надзіва дасціпным і даволі дасведчаным. З размовы вынікала, што шар трэба надзьмуць як мага паўней, каб рэвалюцыйнае свята атрымалася.

* * *

Маўклівыя, як каменныя слупы, латышскія стралкі перанеслі езуіцкі скарб з сутарэнняў у кабінет Антона Маркава. Паставілі дзве скрыні на стол, паднялі накрыўкі. Краеўскі ўзяў у правую руку аловак, а спіс у левую. Пералічылі, перабралі і перагледзелі кожную рэч — усё сышлося да апошняга. Краеўскі і Маркаў з палёгкай уздыхнулі.

— А з дошкай што рабіць? — спытаў Маркаў.

Краеўскі ўзяў невялікую дошку, сцёр рукавом пыл. З яе пазіраў сцямнелы ад часу вусаты шляхціч.

— Хто такі?

— Не святы, — адказаў Маркаў. — Я гэтую дошку нават у спісы не ўносіў. Якая з яе каштоўнасць для рэвалюцыі?

Латышы пачалі парадкаваць скарб па скураных сакваяжах з замочкамі. Стол, які яшчэ паўгадзіны таму ільсніўся і зіхцеў, зрабіўся пустым і сумным, як пакой, з якога выцягнулі ўсё — да апошняга дзіцячага зэдліка.

За вокнамі на пляцы чуліся ўзбуджаныя крыкі. Вецер трапаў кумач сцягоў і лозунгаў, якімі бальшавікі паўпрыгожвалі старажытны, але занядбаны горад. Праз пляц урачыста і пакуль маўкліва прайшоў аркестр.

Антон Маркаў, паголены, у новай гімнасцёрцы, з ордэнам на грудзях задаволена паціраў рукі, калі схаваў у тэчку распіску на скарбы, атрыманую ад Краеўскага.

— А цяпер на мітынг. Народ чакае, — як гаспадар гасцінна запрасіў Маркаў.

Краеўскі замкнуў карычневыя важкія сакваяжы, схаваў ключыкі ў кішэнь.

— Затрымацца, на жаль, не зможам. Як прыйдзе ваш бранявік, то едзем на станцыю... — шэптам паведаміў Краеўскі. — Як тэлеграф, працуе?

— Пакуль яшчэ не зрабілі, але хутка наладзяць, — азваўся ўсмешлівы маладзён у наваксаваных ботах.

— Справы ёсць справы, — прагучала ў адказ. — Сокал, таварышам паёк у дарогу.

Падначалены паставіў на стол пляцачок. Латыш закінуў яго на дужае плячо.

— Чым багатыя, таварышы.

Латышскія стралкі стрымана кіўнулі. Краеўскі глядзеў з дзіцячым захапленнем на вялізны паветраны шар за акном, па шчоках прабягала сутарга.

У передпакоі, калі ўсе выйшлі на калідор і рушылі да сходаў, Маркаў крыху затрымаўся, паклаў далонь на плячо свайго падначаленага, сціснуў.

— Тут заставайся. Як толькі тэлеграф запрацуе, дашлеш вось гэта, — на вуха прашаптаў галоўны мсціслаўскі чэкіст. — Больш паперы — чысцей... Сам разумееш, не дзіця. Няхай сустракаюць там герояў.

— Зраблю, — Сокал схаваў у кішэнь перакладзеную на чатыры паперку.

— Калі што якое, я на мітынгу, там і шукай.

— Гэта ж два пуды таго золата, — цокнуў малады чэкіст услед латышам і свайму начальніку, які подбегам рушыў даганяць Краеўскага.

*...цікава, а Ванда Мятліцкая таксама любіла вішнёвае варэнне з костачкамі? Чаму ў нашай сям'і ўсе яго так любяць? Вось і мама варыла, і бабуля. А немцы так не ўмеюць, усё нейкія джэмы, канфіцюры, мармелады. Салодкае, і ўсё. А там жа самае галоўнае не смак — водар. І костачкі павінны быць абавязкова. Бабуля так казала. Усё. Хачу дахаты. Але бачыць Алекса няма ніякага жадання. Трэба сябе прымусіць. Хачу ў Мінск на свой ложак, у свой фатэль, хачу сунуць ногі ў свае пантофлі... Як мала табе трэба — Ганна Мятліцкая. А магла б быць і Краеўская. Калі гэта толькі сапраўднае прозвішча. Трэба будзе падумаць, што сказаў Станіслаў Краеўскі, калі дэфензіва схапіла яго ў варшаўскім казіно. Цікава, а ён ужо ведаў, што Ванда цяжарная, ды на трэцім месяцы?.. Яна ляжала на канапе, яе блажыла — таксікоз. Пад канапай скураны сакваяж. Цяжкі, жанчыне не падняць. А пад падушкай наган. Станіслава ўсё не было. Можа, ён шукаў каго ў тым казіно? А, можа, хаваўся? Білі яго моцна, відаць, крыкнуў ім, ці прашаптаў: «Пся крэў». А Ванду сваю ён «кропелькай» называў. Хаця, на фота, зробленым у Віндаве, зусім і не дробненькая жанчына. Прыкладна, такая, як я, і валасы светлыя. Чаму менавіта Аргенціна? Слова прыгожае? Ці дабрацца туды было прасцей?..*

Мітынг у гонар шостай гадавіны рэвалюцыі зацягваўся.

Як заўсёды здаралася на мітынгах, таварыш Маркаў хваляваўся. І толькі калі ўзышоў на гулкую, абцягнутую кумачом трыбуну, сабраўся, напяўся, як струна, плечы шырока разгарнуў, хапануў сырога паветра і пачырванеў, на паперку забыўся, як і не было яе ў кішэні. Ордэн на святочнай гімнасцёрцы гарэў, як свежая рана. Ён гаварыў палымяна, кідаў у натоўп мсціслаўцаў — пахмурных, як восень, гарачыя словы пра сусветную рэвалюцыю, якую прынеслі працоўным бальшавікі-ленінцы і каторую ніякія ворагі, як не будуць высільвацца, спыніць не здолеюць...

А глядзеў прамоўца не на людзей на плошчы, а на раздзьмуты паветраны шар. На чырвоныя серп з молатам, якія калыхаліся над натоўпам. Ён ускідваў правую руку з заціснутай кепкай. Абяцаў, што ворагаў савецкай улады вынішчыць, усіх да апошняга, каб не заміналі будаваць працоўным Мсціслава светлую будучыню. Кожнаму прамоўленаму слову Антон Маркаў верыў і пад кожным гатовы быў падпісацца ўласнай крывёй.

Краеўскі з латышамі падышлі да агітатараў, павіталіся. Маскоўскі чэкіст зазірнуў у ёмістую люльку, спытаў пра паліва... Агітатар адказаў і падзівіўся на аднолькавыя скураныя сакваяжы ў руках змрочных чэкістаў.

Маркаў убачыў, як Краеўскі з дужымі латышамі лезуць у люльку. Краеўскі памахаў рукой. Прамоўца нават не спыніўся, а яшчэ гучней выкрыкнуў палымяны лозунг часоў грамадзянскай вайны. Серп з молатам узняліся над згалелымі дрэвамі. Прамоўца змоўк. Людзі глядзелі на агромністы паветраны шар, які пухіром хістаўся над імі. Відовішча было незвычайнае.

Да натоўпу на плошчы бег з белай змяёй тэлеграфнай стужкі ў левай руцэ і з ускінутым наганам у правай, паўраспранены падначалены Антона Маркава. За ім пыхкаў дымам, тарахцеў, грукацеў, быццам хацеў дагнаць і расціснуць Сокала, шэра-зялёны браніраваны аўтамабіль з кулямётам. Калі малады круглатвары чэкіст зразумеў, што не паспявае, спыніўся і тройчы стрэліў... Аркестр зайграў рэвалюцыйны марш, і гукі стрэлаў патанулі, рассыпаліся ў грукаце вялікага барабана, у шалёсткім ляскаце медных талерак, ва ўздыхах начышчаных да свята валторнаў, труб гелікона...

Вялізны паветраны шар з чырвоным сярпом і молатам на тугім баку прыпыніўся, завіс над галовамі здзіўленых гледачоў. Гэты шар быў ці не адзінай вялікай і яркай плямай у папялова-шэрым восеньскім краявідзе. Напятая, як струна, вяроўка раптам аслабла і павольна паляцела долу, а за ёй другая і трэцяя.

Усходні вецер падхапіў шар, і ён паплыў над Мсціславам. Павольна і вельмі ўрачыста. Мітусіліся, як тыя мурашкі, людзі, нячутна лопаліся, як бурбалкі на брукаванцы, стрэлы.

Моцны ўсходні вецер будзе трымацца суткі. І шар стане ляцець без супынку высока ў аблоках. Апусціцца за польскай мяжой, побач з мястэчкам Ракаў, на беразе плыткай, звілістай Іслачы.

P.S. Тэлеграфістка-прыгажуня Ванда Мятліцкая паспела выехаць з Масквы ў заходнім кірунку за дзень да таго, як яе хапіліся і пачалі шукаць. Антон Маркаў — мсціслаўскі чэкіст, памёр праз тыдзень у дарозе на Маскву. Ліст ад Дзяржынскага аказаўся прафесійнай падробкай, якая нават спецыялістаў здзівіла.

Дзяржынскі загадаў знайсці і знішчыць сына віленскага шляхціча, з якім вёў беспаспяховыя дыскусіі на катарзе. Станіслава Краеўскага і Ванду шукалі да дваццаць шостага года, да смерці жалезнага чэкіста, які ў маладыя гады марыў стаць манахам езуітам.

*...калі пагрукалі, Ванда ўжо сядзела. А як дзверы затрашчалі, то пачала страляць. Дваіх і паклала. Выкінула цяжкі саквояж у акно, а сама, цяжарная, следам скочыла. А што яна яшчэ магла зрабіць? Бегла па начной вуліцы. Цікава, паспела апрануцца? Гэта ж ужо амаль зіма была, напрыканцы лістапада. Не вясна, калі цёпленька, і пад любым кустом можна схавацца. Знаёмых у Варшаве нікога. Акцэнт беларускі... Куды б я кінулася? Ясная рэч, не на вакзал жа бегчы. Ды яшчэ невядомасць. Дзе Станіслаў, што з ім? Пуд золата ў руках. Каб тады ў іх усё атрымалася, каб здолелі ў Аргенціну ўцячы... Ха-ха! Мяне б не было. Ім кепска — мне добра...*

*Навошта я гэта ўсё думаю? Мне здаецца, што маё існаванне — працяг іх жыцця. Яны не маглі ведаць пра мяне. А я хачу ведаць пра іх усё.*

Апошнія дні красавіка 1945 года. Маёнтак барона фон Штайна захапілі без бою. І ўжо трэці дзень аддзяленне гвардзейскага пяхотнага палка адпачывала. Салдаты бадзяліся па пакоях, спалі, ад пуза елі, дзякуй Богу, было што, пілі калекцыйныя віны і каньякі, і нават не думалі, што тыя могуць быць атручаныя.

Камандзір аддзялення гвардыі сяржант Сокал з раніцы ўласнаручна закалаціў уваход у вінныя сутарэнні. З Сокалам не паспрачаешся, калі што не так, можа і ў зубы заехаць. Пастрыжаны пад бокс і чыста паголены, ён сядзеў у фатэлі гаспадара маёнтка, на каленях была рассцеленая карункавая сурвэтка з мудрагелістай манаграмай. Паверх яе стаяла кансароўка з акуратна ўзрэзаным верхам. Сяржант нетаропка калупаў срэбнай дэсертнай лыжкай амерыканскую тушонку. Побач з ножкай фатэля стаяла пляшка з цёмнага шкла. Сокал, не гледзячы, раз-пораз хапаў яе за рыльца, каўтаў — праганяў тлушч.

Нарэшце падсілкаваўся, кінуў парожнюю кансароўку ў шырокую зяпу каміна, абцёр лыжку, сунуў за халяву, задаволена пацягнуўся і сыта адкінуўся на абабітую аксамітам высокую спінку фатэля, замружыў вочы. А калі прахапіўся, то сутыкнуўся позіркам з гаспадаром маёнтка — штандартэнфюрэрам СС. Барон фон Штайн спакойна пазіраў на гвардыі сяржанта з вялікага партрэта, добра прадзіраўленага савецкімі кулямі.

— Ну што, фашыст, капут вам! Шкада, што сам ты збег. А тое б сяржанту Сокалу яшчэ б адзін ордэн на гімнасцёрку палкоўнік прыкруціў, — сяржант паклаў шырокую далонь на грудзі, пяшчотна правёў па ўзнагародах. — А ў нашым Мсціславе зараз людзі гной вывозяць. А можа, хто ўжо і бульбу садзіць? Задзяўбло сядзець. І дзе той фотакор? Капітан папярэдзіў, што сёння будзе. Але яму верыць, сабе даражэй.

Каму прыйшло ў галаву намаляваць партрэт сяржанта, невядома. Але са сцяны знялі невялікую карціну, прыцягнулі з другога паверха мальберт, фарбы. І салдацік, які не паспеў давучыцца ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме, пачаў маляваць свайго камандзіра. Што такое нейкі там анёл, няхай сабе і з запаленай свечкай, у параўнанні з чырванатварым прыгажуном — гвардыі сяржантам, які прайшоў усю вайну, адступаў ад Магілёва да Масквы, а потым гнаў немцаў на захад, праз Польшчу, Аўстрыю да самай Германіі.

— Мацкевіч, ты глядзі, каб усе мае ўзнагароды было відаць. Прывязу, дома павешу, каб дзеці бачылі, які іх бацька герой. Шкада, раму не возьмеш, цяжкая. А фарбы, алоўкі, калі жадаеш, можаш сабе забраць. Я не супраць. Чуеш, Мацкевіч? Старайся. Калі што спытаюць, скажам, згарэла. Хаця, каму пытаць? Тут столькі ўсяго прахам і дымам пайшло, не злічыць.

Маляваць сяржанта Сокала было нескладана. Блакітныя вочы, саламяная чупрына і такія ж саламяныя вусы, дзюбаваты нос, запамінальны твар. Асноўную ўвагу мастак-недавука надаваў пагонам і ўзнагародам. Маленькім каланковым пэндзлікам старанна выводзіў медныя гузікі, баявыя медалі і два ордэны Славы. Салдаты, падначаленыя Сокала, бессаромна заходзілі ў залу, спыняліся за спінай у мастака, цмокалі, зайздросцілі, але з парадамі пад руку не лезлі.

— Ну як табе, Іваноў, падобным твой камандзір атрымліваецца?

— Ага, таварыш сяржант. Вы на карціне, ну як жывы.

— Ну то добра. А цяпер не замінай, ідзі да брамы, занясі хлопцам гарачага паесці. Няхай крупніку пасёрбаюць.

Гук траскучага матацыклетнага рухавіка першым пачуў сяржант. Але ён нават не падняўся са свайго фатэля. Фотакорам франтавой газеты аказаўся чарнявы, заляпаны веснавой гразёй малады лейтэнанцік з кароткім прозвішчам Рэй. Як потым высветлілася, зямляк Сокала і Мацкевіча — з-пад Мінска. З узнагарод у яго меўся адзін толькі медалёк. Фотакора спачатку як след накармілі, а потым ён і заняўся сваёй працай.

Кранальную сцэну малявання кавалера двух ордэнаў Славы лейтэнант Рэй мерыўся сфатаграфаваць у двары. Але неба зацягнулі хмары, закрапаў дождж. Сяржанту Сокалу зноў давялося сесці ў высокі баронскі фатэль у зале побач з агромністым камінам. Мацкевічу — зашпіліць гузікі на гімнасцёрцы і стаць да мальберта. Колькі разоў палыхнуў бліц, шчоўкнуў затвор «лейкі».

Іваноў па загадзе сяржанта зладзіў лейтэнанту Рэю падарунак: дзве запыленыя пляшкі, тры кансароўкі тушонкі, дзве пліткі шакаладу. Усё гэта было па-мужчынску акуратна загорнута ў карункавыя сурвэткі з манаграмамі і запакавана ў выцвілы салдацкі заплечнік. Фотакор падзякаваў, запісаў у нататнік званні, прозвішчы байцоў і падрабязную біяграфію гвардыі сяржанта, паабяцаў, што праз колькі дзён партрэт Сокала з рэпартажам будуць надрукаваныя ў франтавой газеце, паабяцаў і з’ехаў.

*...калі не шанцуе, то з самага рання. Кава выбегла з туркі. Давялося мыць пліту, гатаваць зноў. Палезла ў лядоўню, узяла вяршкі, плёхнула ў каву і... выліла ў рукамыйнік. Вяршкі скіслі. Далей — болей. Камп’ютэр не хоча заходзіць у І-нет. Не хоча, і ўсё, жыве сваім жыццём. А на мабіле скончыліся грошы. Хатні паспелі адключыць. Сёння ўсё супраць мяне. Нават на вуліцы. Учора яшчэ было цёпла, а цяпер крапае. Упэўнена, што і сёння следчыя прыдумаюць чарговую прычыну, і з Феліксам спаткацца не дадуць. А ў мяне ёсць што яму расказаць.*

Якаў Міхайлавіч Рэй доўга глядзеў у акно на купал цырка, на парк. Па ранішнім праспекце ў два бакі звыкла беглі машыны. Нічога цікавага не адбывалася. Гэты краявід Якаў Міхайлавіч бачыў штодня вось ужо пяцьдзесят гадоў. Мяняліся маркі машын, з’явілася метро, зніклі тралейбусы, падрасталі, паміралі дрэвы, асфальт на ходніках замяніла бетонная плітка. Але ўсё гэта дробязі. Старога фатографа ўжо даўно ўсё перастала радаваць і здзіўляць. Апошнія пятнаццаць гадоў ён жыў у гэтай вялікай кватэры

адзін. Ён прапаноўваў унуку перабрацца да яго, але Фелікс марудзіў. Яго маці — дачка Якава Міхайлавіча, дзевяць гадоў таму пабралася другім шлюбам з дробным канадскім бізнесоўцам і з'ехала ў Таронта. Рэгулярна, раз на два тыдні, яна тэлефанавала бацьку. Праз кожныя два гады прыязджала. Яна ўгаворвала Якава Міхайлавіча паехаць з ёй. Расказвала, як добра яму будзе ў Канадзе, якая вялікая пенсія яго чакае... Якаў Міхайлавіч слухаў, але мяняць звыклы лад жыцця не хацеў. Ён жыў мінулым.

Указальны палец націснуў на кнопку, загарэлася настольная лямпа. Яе святло зрабіла ярка-зялёным сукно старога пісьмовага стала. Сподак і вялікі кубак, з якога вытыркалася срэбная лыжачка, занялі звыклае месца побач з перакідным календаром. Павелічальнае шкло лупы напоўнілася нежывым святлом, як поўня. Літары нямецкай газеты пад ёй выгнуліся, зрабіліся чорна-вялікімі. Васьмідзесяціпяцігадовы, як усе старыя, кепска паголены чалавек сеў да стала. Пачулася жалобнае рыпенне скуранай абіўкі. Фатэль прыняў гаспадара, і яны зрабіліся адным цэлым. Якаў Міхайлавіч таргануў на сябе шуфлядку, выцягнуў з яе доўгую дыктавую скрыначку. Рыхтык такую, як у бібліятэчных каталогах. Нязграбныя пальцы пачалі перабіраць зжаўцелыя капэрты. На кожнай чарнеў нумар і сціслая інфармацыя пра тое, што яна хавае ў сабе. Да прыкладу: Берлін, 17 траўня 1945 года, дождж, Александэр пляц, капітан Мядзведзеў і яго рота, канцэрт.

Стары фатограф выцягнуў чатыры капэрты, расклаў на стале. Ён ужо начапіў акуляры і наважыўся выцягнуць негатывы, як з калідора даляцела гучнае блямканне тэлефона. Капэрта завісла над сталом. Якаў Міхайлавіч колькі падумаў, нетаропка падняўся, а тэлефон працягваў патрабавальна звінець.

— Іду, — прамовіў гаспадар і зашоргаў мяккімі пантофлямі.

Ён падняў цяжкую чорную слухаўку.

— Хто-хто?.. А... усё ў мяне добра, Фелікс, як заўсёды... Не, пакуль не прыходзіла...

Якаў Міхайлавіч доўга слухаў і падсумаваў:

— А навошта мне тыя грошы? Ну, не люблю я немцаў... Машыну новую купіць? Дык у мяне старая ў гаражы ржавее. А здароўе, дарагі ты мой Фелікс, ні за якія грошы не купіш, і маладосць не вернеш. Усё гэта мне не трэба. Я цябе разумею... Яны ўсе фотаздымкі павесілі?.. Людзі ходзяць, глядзяць?.. Ды што ты мне прывязеш? У мяне ўсё ёсць... Ты ж ведаеш, што твой дзед гісторыяй не гандлюе... Учора з амбасады званілі, нейкі чалавек, які за культурныя сувязі адказвае. Ну куды я паеду, навошта? Прыязджай сам, раскажаш, пагаворым... Не люблю я нямецкую гарэлку, ты ж ведаеш.

Стары паклаў слухаўку на чорны эбанітавы апарат, хоць побач і стаяў навюткі сучасны радыётэлефон.

— А ім гэта ўсё навошта? Не ўцяміць.

Якаў Міхайлавіч яшчэ не паспеў дайсці да кабінета, як яго спыніў тэлефонны званок.

— Няўжо не зразумеў?

У слухаўцы панавала цішыня.

— Алё, алё, слухаю, Фелікс... не чую, — стары пастукаў пазногцем па мікрафоне, — няма чаго ім рабіць, звоняць з гэтых мабільнікаў адкуль захочуць.

Якаў Міхайлавіч сядзеў за сталом і разглядаў праз лупу негатывы. Размаўляў з імі, быццам яны яго чулі.

— ...маёр Пірагоў кажа: «садзіся, Яша, на матацыкл, едзь да разведчыкаў. Здымай, лейтэнант, герояў-пераможцаў». Галава быў наш маёр! Яму лёгка загады аддаваць. Едзь! Быццам не разумее, што пакуль дабяруся па разбітых танкамі дарогах — вечар. А што ў цемры наздымаеш? Але ж нешта зняў.

Магчыма, Якаў Міхайлавіч Рэй яшчэ б доўга згадваў тую сваю паездку да разведчыкаў, знаёмства з красуняй рэгуліроўшчыцай на скрыжаванні зруйнаваных вуліц, пякельны смак авіяцыйнага спірту, якім яго пачаставалі разведчыкі, каб не званок у дзверы.

— Каго гэта нясе? Няўжо нарэшце сантэхнік прыйшоў? Відаць, з домакіраўніцтва і званілі, мусіць, папярэдзіць хацелі. Іду, іду! Зараз, зараз, адчыняю, — непаслухмяныя пальцы правярнулі ніжні ключ.

Апошняе, што ўбачыў стары фатограф — чорна-белы партрэт жонкі, які ён зрабіў летам пяцьдзесят дзевятага года на мосце праз Свіслач. Той партрэт вісеў у перадпакоі, побач з трохногім тэлефонным столікам. Маладая жанчына стаяла, абапіраючыся локцем на чорную чыгунную агароджу. А потым яна выпрасталася. Абцасы аддзяліліся ад асфальту. І яна ўсё з той жа шчаслівай усмешкай паляцела над ракой, над паркам, над Мінскам. І ён у белай кашулі, у шырокіх нагавіцах паляцеў за ёй з «лейкай» на шыі, дакрануўся да яе рукі, пальцы сашчапіліся.

— Не бойся, Галя, гэта ж немцы, — прашаптаў Якаў Міхайлавіч і абсеў на падлогу ў перадпакоі.

Святло жырандолі адлюстравалася, як у шкле, у незамружаных вачах.

*...трэба будзе забраць ключы ў Алекса. А то займеў звычку пасля більярда ўвальвацца пасярод ночы і патрабаваць узаемнай пяшчоты, цягнуць у які-небудзь начны клуб. Ну чаму мужчыны, калі плацяць за працу жанчыне, лічаць, быццам купілі і цябе — усю, дарэшты? Жывёлы...*

Праз тры дні ноччу з’явіліся немцы. Іх прыйшло чалавек пяцьдзесят. Адкуль яны ўзяліся, было незразумела.

Дроў у маёнтку не было, а сухую яліну, што спілавалі ў парку, спалілі адразу, у першы ж дзень. А таму цяпер у каміне гарэла мэбля: кухонныя сталы, зэдлікі, лавы. Туды ж паляцела і важкая рама ад карціны, якую Мацкевіч скарыстаў пад партрэт свайго камандзіра.

Начны бой быў кароткі і жорсткі. Вартавых пры браме эсэсаўцы парэзалі. Першым з’яўленне эсэсаўцаў у маёнтку заўважыў радавы Іваноў. Ён спусціўся на кухню, каб папіць вады, моцна сушыла ад баронскіх каньякоў. Радавы чарпануў конаўкай з вядра, выпіў да апошняй кроплі і кінуўся да акна, прыціснуўся тварам да шыбіны. Немцы ланцугом беглі праз брукаваны двор да дома.

— Ах, вы, сукі, — прашаптаў Іваноў, высадзіў прыкладам аўтамата шкло і пачаў страляніну.

Паляцела граната, якую з-за калодзежа кінулі ў кухоннае акно. Іваноў толькі і паспеў гупнуцца на падлогу. Граната з доўгім дзяржальнам крутанулася на каменных плітах і разарвалася. Салдат войкнуў і знерухомеў. Паліцы з посудам абрынуліся на яго. Эсэсаўцы лезлі праз вокны, як прусакі. Мацкевіч з Сокалам выбеглі на сходы, на іх было сподняе. Вакол ціўкалі кулі, шчапалі на трэскі дубовыя панелі, секлі тынкоўку.

— Мацкевіч, гранаты давай! Кулямет нясі. А я затрымаю, — загадаў сяржант, перакуліў канапу і залёг на пляцоўцы.

— Унізе гранаты, таварыш сяржант.

— Наверсе ёсць, там, дзе кніжкі...

Сокал даў доўгую чаргу ў цемру. Мацкевіч прыўзняўся, але паспеў зрабіць толькі тры крокі, схапіўся за парэнчы і абсеў. Сяржант Сокал падпоўз вужом да свайго падначаленага.

— Як ты, Сярожка, жывы? Ну, што ты маўчыш?

Сяржант прыціснуўся да сцяны і слізгануў сходамі наверх. Ускочыў у бібліятэку, зачыніў цяжкія дзверы. У бібліятэцы было цёмна. Навобмацак пад пісьмовым сталом Сокал адшукаў падсумак з гранатамі і ручны кулямёт. Другога дыска не знайшоў, колькі не абмацваў падлогу.

— Ну, хадзіце сюды, хадзіце... — прыслухоўваўся сяржант, схаваўшыся за скуранной канапай. — Я вас пачастую.

Страляніна за дзвярыма сціхала. Потым гучны выбух. І вялізныя дубовыя дзверы ўваліліся ў бібліятэку. Сокал кінуў у дым адну за другой дзве гранаты. Дом скалануўся. Сяржант крыху счакаў, прыціснуў гашэтку. Кулямёт закалаціўся ў дужых руках. Пачуліся крыкі.

— Што, засранцы, узялі Сокала?! Я вам! — ашчэрыўся гвардыі сяржант. — Не на таго наскочылі.

З кулямётам у руках ён слізгануў паміж вышэзных, пад столь, кніжных шафаў да дзвярэй у спачывальню. Цяжкі падсумак з гранатамі матлянуўся, высадзіў шкло, аскепкі пасыпаліся на падлогу. Сокал паставіў да шафы кулямёт, сунуў руку ў торбу.

— Пачытаць захацелася? Так, чытайце! Трымайце!

Рыфлёная граната заскакала пад ногі немцам. Толькі ашмёткі кніг закруціліся ў куродыме. А Сокал ужо выбіраўся праз акно спачывальні на доўгі балкон. Ён зірнуў уніз, абярэжна адпусціў кулямёт, прыцiснуў да жывата торбу з гранатамі і скочыў на клумбу. У доме яшчэ стралялі.

Сокала не заўважылі нават калі ён перабягаў двор. Выпадковая куля знайшла яго, трапіла ў нагу. Каб не яна, даляцеў бы Сокал да стайні, бо заставалася крокаў дзесяць. Вылаяўся сяржант, ды так брудна, што нават менш балець стала прастрэленая ў калене нага. З кулямётам адпоўз за ганак. Паспрабаваў падняцца, не атрымалася.

Ён адстрэльваўся, пакуль не скончыўся дыск, шпурануў адну гранату, другую... апошнюю збярог для сябе. Але яна не спатрэбілася. Аўтаматная чарга ў спіну кінула гвардыі сяржанта Сокала на брук. Ён не бачыў, як да яго падышоў гаспадар маёнтка ў плямістай камуфляжнай куртцы і нагой адкаціў гранату, што выслізнула з мёртвых пальцаў.

Карціну, па якую вярнуўся ў свой дом штандартэнфюрэр СС барон фон Штайн, ні ён, ні яго людзі так і не знайшлі. У каміне адно ляжаў недагарэлы кавалак дубовай рамы.

Немцы сыходзілі на досвітку, кіраваліся ў горы да закінутых каменаломняў, адкуль і прыйшлі. На вузкай сцяжыне штандартэнфюрэр спыніўся, прыцiснуў да вачэй бінокль. Унізе, далёка-далёка, над дрэвамі парку, кранутымі зелянінай, высокім слупом узнімаўся сівы дым.

* * *

З дванаццаці салдатаў, пакінутых у баронскім маёнтку, пасля начнога бою ў жывых застаўся толькі адзін. Цудам ацалеў Іваноў. Ён сядзеў каля калодзежа ў абгарэлым шынялі і заціскаў вушы рукамі. З-пад далоняў цёмнымі раўчукамі сплывала кроў. Ён не мог растлумачыць ні капітану, ні маёру, ні доктару, адкуль узяліся немцы і куды потым зніклі. Іваноў не памятаў, як выкараскаўся з ахопленага агнём дома. Ён адно прамаўляў сваё званне, прозвішча і дату нараджэння.

— Кантузія, — сказаў доктар, — можа, слых і не вернецца, але жыць хлопец будзе.

— Гэтаму пашанцавала, а вось Сокал усю вайну прайшоў, як на крылах праляцеў, і на табе... колькі тут ужо дзён засталося, амаль нічога. Давядзецца «пахаронкі» слаць, — плюнуў сабе пад ногі камандзір батальёна. — Маіх адзінаццаць паклалі, сваіх дваццаць пакінулі. Не дарма ж яны сюды лезлі. І што ім тут спатрэбілася? — капітан зірнуў на закурэлы будынак маёнтка, на абсмалены язмін ля ганка. — Жыць хочацца. Вясна, маць тваю.

У пляцаку сяржанта Сокала, які закінулі кантужанаму Іванову ў санітарную машыну, былі срэбная дэсертная лыжка, згорнутае ў трубку палатно, акуратна зрэзанае з падрамніка, наручны гадзіннік і стосік лістоў з радзімы.

*...са сваёй канторы, якую ён называе офісам, мой «мясны кароль» Алекс павёз мяне ў «Журавінку». У рэстарацыі мы сядзелі і абедалі. Я перахапіла позірк маладзенькай афіцыянткі. Яна глядзела на мяне з зайздрасцю. Ёй хацелася апынуцца на маім месцы. І мне зрабілася так сорамна, што не магла есці. Так зайздросцяць валютным прастытуткам. Сапраўды, з ім трэба завязваць. Чалавек, які не чытае кніжак, а ў газетах глядзіць адно спартовыя навіны, не-да-ча-ла-век. Дрэсіраваная жывёла, якая ведае літары. А я хачу застацца незалежнай, хачу працягваць займацца літаратурай, а не складаць сумнеўныя рададоды за грошы Фасманскаму і яго сябрам-бізнесоўцам...*

Франкфурцкі аэрапорт, як Ватыкан — краіна ў краіне. Тут ёсць усё і ўсе. Сапраўдны Ноеў каўчэг.

Ганна Мятліцкая сядзела ў шкляной выгарадцы акварыума кавярні. За празрыстай сцяной узляталі і садзіліся самалёты. Перад ёй на століку па-хатняму ціха гуў ноўтбук. Пальцы перабіралі падатлівыя клавішы. На маніторы з'яўляліся радкі.

Фелікс сядзеў за суседнім столікам. Перад ім стаяў такі ж ноўтбук, а побач ляжаў мабільнік.

«Глабалізацыя — рэч жахлівая. Ежа, вопратка, тэхніка ва ўсіх аднолькавыя. І думкі, відаць, аднолькавыя. Не... я думаю пра літаратуру. А гэты малады чалавек, які рэгістраваўся на мой рэйс, мяркуючы па заклапочаным твары, думае цяпер пра грошы. Падлічвае, перамнажае, пераводзіць адну валюту ў другую. Потым зноў складае. Зараз усміхнуўся. Відаць падумаў, што някепска б было са мной пазнаёміцца. І калі наважыцца, то напэўна пачне з таго, што ў нас з ім аднолькавыя камп'ютэры», — падумала Ганна.

Фелікс падышоў да стойкі, замовіў дзве кавы амерыкана, два марціні і без слоў паставіў іх на столік Мятліцкай, моўчкі перанёс свой ноўтбук, павесіў на спінку крэсла плашч.

— А я даўно за вамі сачу. Мяне завуць Фелікс.

— Ганна.

— Я па справах у Германіі. А цяпер дадому. Вы не замужам?

— А што, гэта важна? Вы заўсёды ўдакладняеце сямейны стан пры знаёмстве? Не замужам.

— Тады за знаёмства.

Фелікс падаў высокую шклянку з напоем і ўсміхнуўся так, што адмовіцца было немагчыма.

— А вы, Ганна, журналістка з Мінска. Я не памыліўся?

— Можна і так. Не, не памыліліся, я і журналістка таксама. Толькі не кажыце, што бачылі мяне па тэлевізары.

— Значыцца, вы тэлежурналістка. На жаль, тэлевізар я амаль не гляджу, не цікава.

— А спортам цікавіцеся?

— А гэта важна? І спортам я не цікаўлюся. І аўтамабілі мяне не хвалююць.

— Незвычайны вы, малады чалавек. Чым жа цікавіцеся? На таго, хто працуе ў офісе, вы не падобны. Правільна?

— Абсалютна. Я чалавек вольны. Мяне цікавіць мастацтва.

— Мастацтва... Аўкцыёны? Антыкварыят? Маркі, манеты? — крыху расчаравана прамовіла Ганна.

— Ужо бліжэй. Яшчэ па марціні? Не супраць? Выдатна.

Фелікс падняўся з-за стала. І тут ажыў, заціўкаў, пачаў круціцца на стале яго мабільнік.

— Дзявуля непакоіцца?

— Нават не ведаю хто. Пардон.

Фелікс падхапіў слухаўку, крыху вінавата зірнуў на Мятліцкую. Гаварыў, не адыходзячы ад століка. Ганна піла састылую каву і слухала. Фелікс старанна падбіраў нямецкія словы. З размовы вынікала, што ён некаму абяцае яшчэ раз перагаварыць, перакананць старога фатографа, каб той за вялікія грошы прадаў сваю фотавыставу з усімі негатывамі. Таксама Ганна зразумела, што справа пільная, і пакупнік, які наважыўся прыдбаць старыя фотаздымкі, прыспешвае Фелікса.

Ганна азірнулася і праз шкло сутыкнулася позіркам з мужчынам у карычневым строі і ў тонкіх скураных пальчатках. Ён няспешна ішоў па бліскучай падлозе і таксама размаўляў па мабільным тэлефоне. За ім на адлегласці ў два крокі рухаўся памагаты, ці то сакратар, ці то шафёр-ахоўнік.

«Відаць, палітык, — вырашыла Ганна, — дэпутат якога-небудзь Бундэстага. Запамінальны твар».

Мужчына прыпыніўся, склаў тэлефончык і аддаў яго памагатаму.

— Прашу прабачэння, — прамовіў Фелікс, — гэта наконт фотавыставы майго дзеда. Знайшоўся нейкі дзівак, які кіруе фондам, ці то «Згода», ці то «Пакаянне»... А зрэшты, няважна. Нам да пасадкі яшчэ больш за гадзіну, — Фелікс зноў крыху разгублена пасміхнуўся і пайшоў да стойкі.

«Цікава, колькі ж яму гадкоў? — прыкінула Ганна. — Можа, дваццаць пяць, можа, дваццаць сем. Напэўна, маладзейшы за мяне. Добра, што я схадзіла ў цырульню і пафарбавала пазногці. З алкаголем трэба асцярожна. Гэта толькі на смак марціні падаецца бяскрыўдным, і градусы не адчуваюцца. А потым «дах знясе», і сваё імя не згадаеш...»

Праз паўгадзіны Ганна і Фелікс цалаваліся ў тэрмінале за калонай, кінуўшы рэчы на крэслах. Смяяліся, як вар'яты, якім пашчасціла знайсці пуд золата. А за колькі хвілін да пасадкі высветлілася, што за гэты час з плашча Фелікса знікла партманетка. Добра што пашпарт і пасадачны талон ён запхаў у заднюю кішэню джынсаў. Гэтая непрыемнасць прымусіла крыху працверазець. Але толькі крыху. Ды і то, на момант.

*...нарэшце. Паўгадзіны мы былі з ім. Дазволілі. Там, у кабінеце і зразумела: Фелікс — маё, што б ён сам ні казаў. Мы з ім, нават калі і не разам, дыхаем адным паветрам. А «мясны кароль» перакана期ны, я — ягоная. І, дарэчы, мае рацыю. Алекс з тых, каго немагчыма «паслаць». І не грошы таму прычынай. Нават без іх ён бы пачуваўся на гэтым свеце ўпэўнена, гаспадаром сабе і іншым. Няўжо гэта Афганістан яго такім зрабіў? Кантужаны. А да Фелікса шнары на яго целе замілоўвалі, цяпер насцярожваюць, раздражняюць, палохаюць. У яго знаёмыя паўсюль. І крымінальнікі, і бізнесоўцы, і палітыкі, і чыноўнікі... Варта было яму толькі патэлефанаваць, як мая праблема вырашылася. Следчы адно пацікавіўся, кім мне даводзіцца, і ці даўно я ведаю Аляксандра Францавіча Фасманскага? І чаму не сказала пра гэта адразу, стварыла яму праблему? Ну, добра, сёння ён дапамог мне. А заўтра?..*

**Рэаніматолаг бег па шпітальным калідоры, за ім следам спяшалася медсястра, каціла столік з абсталяваннем.**

**— Ціск упаў. Восемдзесят на сорак. Пульс перарываецца, — тлумачыла задыханая жанчына.**

**Каля ложка Ганны Мятліцкай ужо стаялі дактары. На экранчыку асцылографа ледзь заўважна пульсавала бледна-зялёная лінія.**

**— Ін'екцыю, дваццаць кубікаў.**

**— Вену не знаходжу.**

**— Я сам, — рэаніматолаг забраў шпрыц, схіліўся да Ганны, — кісларод!**

**— Пульс нуль.**

**— Зараз, зараз, — доктар няспешна ўводзіў раствор.**

**— Ёсць імпульс.**

**Ішла барацьба за жыццё Мятліцкай. Асістэнтка кранула рэаніматолага за плячо.**

**— Глядзіце, глядзіце...**

**Ганна павольна сціскала пальцы.**

**— Гэта добра, — прамовіў медык, — за жыццё чапляецца.**

**Ён асцярожненька выпраставаў бяскроўныя пальцы. Яны зноў падціснуліся.**

*...не забірай руку. Дзіўна, чаму яны цябе не бачаць? А мне відно. Ты сядзіш на ложку, і я трымаю тваю руку. Яна не цёплая і не халодная. Яна як паветра ў гэтым пакоі. Гэта ты паставіў свечку на падаконне? А што будзе, калі яна згасне? Я памру? Я не хачу паміраць. Але што я табе гэта расказваю. Ты сам ведаеш. У мяне ўсё баліць. І ўсё як не маё. Але думаецца лёгка. Бачу свае думкі, хаця так не бывае. І словы знаходзяцца самі. Яны бяруцца ніадкуль, а ў памяці застаюцца, як напісаныя. Я іх ужо ніколі не забуду. Што са мной адбываецца? Што гэтыя людзі тут робяць? І чаму*

*яны ў белым адзенні? Яны твае сябры? ...А, гэта дактары. І я, відаць, у шпіталі. А Фелікс дзе? Што з ім? Яны нас не дагналі. Ну, скажы, што не дагналі. А калі прыйдзе Фелікс? Ён не ведае, што я цяжарная. Хацела ж сказаць, а потым нешта стрымала. Баялася, што ён пачне хвалявацца, перажываць за мяне. І мы не зможам зрабіць тое, што задумалі. А цяпер можна сказаць. Калі ты побач, мне крыху лягчэй, менш баліць. Не забірай руку, пабудзь тут...*

**Рэаніматолаг выйшаў з палаты.**

**Сівавалосы адштурхнуўся плячыма ад сцяны, наблізіўся да доктара. Пальцы Альшанскага, а менавіта такое прозвішча меў мужчына ў накінутым на плечы халаце, схапілі гузік на белым халаце, сціснулі яго.**

**— Доктар, паверце, я шмат магу для вас зрабіць. Калі пажадаеце, вас перавядуць у сталіцу.**

**— Не разумею.**

**— Ды ўсё вы выдатна разумееце, — Альшанскі глядзеў у вочы медыку і павольна паварочваў гузік. — Але, я думаю, вам не гэта трэба. Я магу вас знішчыць. Мне вельмі трэба, каб яна вярнулася. У мяне ёсць да яе адно пытанне. Яна павінна на яго адказаць. А потым...**

**— Мы робім усё, што ў нашых сілах, — разгублена прашаптаў доктар, так з ім яшчэ ніхто і ніколі не абыходзіўся.**

**— Калі яна загаворыць, я дам вам шмат грошай. Дваццаць, трыццаць, пяцьдзесят тысяч... Вы мяне зразумелі?**

**— Зразумеў.**

**— Я спадзяюся на вас і ваш талент. Не адыходзьце ад яе. Як толькі да яе вернецца прытомнасць, я павінен ведаць. Гэта важна, і не толькі для мяне.**

**— Адразу патэлефаную.**

*...відаць, ты ведаў, што я лячу ў тым самалёце, што побач са мной сядзіць не нямецкая феміністка з мужным тварам ваяра, а Фелікс. І нам так добра, што мы забыліся пра ўсё на свеце. Я нават не патэлефанавала Алексу, хоць і абяцала...*

Феліксу ўдалося дамовіцца з маладзенькай сцюардэсай, каб іх з Ганнай пасадзілі побач. Ані ён, ані Мятліцкая не памяталі, як самалёт адарваўся ад бетона Франкфурцкага аэрапорта, як набраў вышыню. Усю Еўропу ўкрывалі пульхныя белашэрыя хмары. Немка-феміністка, якой давялося пасунуцца, на закаханых старалася не глядзець, сядзела, павярнуўшыся да ілюмінатара і піла мінеральную ваду без газу. А Фелікс з Ганнай пілі марціні. Як Фелікс здолеў пранесці бутэльку ў салон, Мятліцкая не цікавілася, было не да таго. Вусны ад віна зрабаліся ліпкія, а доўгія пацалункі атрымліваліся салодкімі.

— Я б так ляцела і ляцела, — сказала Ганна.

— Чаму ў самалёце нельга выключаць святло? Каб стала цёмна-цёмна, як у спачывальні.

Яны не слухалі абвестак, не адразу звярнулі ўвагу на маладзенькую сцюардэсу, якая прабегла праз салон і спынілася каля іх. Феміністка дзяўбла пазногцем у тоўстае шкло ілюмінатара. Сцюардэса зірнула і спалатнела. За рухавіком стужкай бінту віравала пасма дыму.

Сцюардэса кінулася ў кабіну да пілотаў. У салоне згасла святло. У цемры пачулася малітоўнае:

— Mein Got... Mein Got...

А потым спалоханы жаночы голас з дынамікаў папрасіў усіх зашпіліць рамяні і падняць спінкі крэслаў.

— Ну вось, толькі я цябе знайшоў... — прамовіў Фелікс і абняў Ганну. — Не бойся, усё абыдзецца.

Да іх месца падбег чарнавусы пілот і ўтаропіўся ў ілюмінатар, фуражку ён трымаў у руках. Самалёт закалаціўся і пачаў губляць вышыню.

— Маць тваю, — вымавіў пілот, — новы рухавік, і на табе, кірагаз галімы. Спакуха, хлопец, — на развітанне паляпаў па плячы Фелікса лётчык і збег.

За ілюмінатарам да самага далягляду былі толькі густыя хмары. За рухавіком пацягнулася чорная пасма дыму, падобная да жалобнай стужкі. Самалёт заўважна згубіў хуткасць і нахіліўся на правае крыло. Фелікс прыцiснуў да сябе Ганну.

— Там, у аэрапорце, калі я цябе ўбачыў, то падумаў, што варта здаць квіткі і паехаць цягніком. Вагон, купэ, і мы... а больш нікога.

— Другім разам так і зробім, — Ганна заплакала.

— Згодны, — Фелікс сціснуў яе халодную далонь.

Самалёт заглыбіўся ў хмары, па ілюмінатары наўскос пабеглі струменьчыкі. Здавалася, падлога правальваецца, сыходзіць з-пад ног. Лайнер выскачыў з хмар. Агромністае срэбнае крыло паблісквала — дыму за рухавіком ужо не было, колькі феміністка не ўглядалася.

Калі самалёт сеў і пакаціўся па бетоне Мінскага аэрапорта, усе пачалі пляскаць у ладкі, як вар'яты. Фелікс зрабіў колькі глыткоў марціні з рыльца, даў Ганне, тая перадала феміністцы. Жанчына не адмовілася. Усе паадшпільваліся і паўскоквалі са сваіх месцаў.

Калі пасажыры пакідалі салон, яны абдымаліся, паціскалі адзін аднаму рукі, быццам гэта яны выратавалі самалёт і прымусілі рухавік запрацаваць. Ганна і Фелікс выходзілі апошнімі.

— Здаецца, вашае? — сцюардэса працягнула Феліксу партманетку.

— Так, мая, — Фелікс пазнаў сваю рэч імгненна. — Адкуль яна ў вас? Я ж яе там згубіў, у Франкфурце, яшчэ перад пасадкай?

— У праходзе знайшла.

Фелікс разгарнуў партманетку, правы, грошы — усё было на месцы.

— Твой дзень, — сказала Ганна.

— Наш дзень, — засведчыла сцюардэса. — Усяго вам найлепшага.

— І вам, — у адзін голас адказалі Фелікс з Мятліцкай.

Ганна прыпынілася, перш чым зрабіць крок на трап, і азірнулася.

— Забылася нешта?

— Нічога. Мне падалося, быццам нехта крануў мяне за плячо.

— Бывае, — пагадзіўся Фелікс і падміргнуў маладзенькай сцюардэсе.

Ані памежнікі, ані мытнікі пасажыраў рэйса Франкфурт—Мінск не чапалі. Адно спагадліва пасміхаліся і віталіся, як вітаюцца з тымі, хто вярнуўся з таго свету.

Фелікс каціў свой і Ганнін чамаданы. Ён не здзівіўся, калі здаравузны мужчына ў скураным паліто з агромністым букетам кінуўся да Мятліцкай. Ганна на момант знерухомела, разгубілася і прамовіла, не паварочваючы галавы:

— Гэты букет па маю душу.

— Зразумеў, — ціха азваўся з-за спіны Фелікс, — не магло ж увесь час так шалёна шанцаваць.

Мужчына абняў Ганну.

— Алекс, асцярожна. Мы ледзь не загінулі. Рухавік зламаўся і самалёт пачаў падаць.

— Ведаю, мне тут знаёмыя сказалі пра твой рэйс, — Фасманскі падняў руку і шчоўкнуў пальцамі.

Тут жа ж падбег яго вадзіцель Андрэй, такі ж агромністы, як гаспадар. Без слоў забраў у Ганны сумку, у Фелікса яе чамадан. Алекс моцна трымаў Ганну за руку, вёў да дзвярэй. Мятліцкая азірнулася, на яе твары была разгубленая ўсмешка. Фелікс выкалочваў з пачка цыгарэту. Ён колькі хвілін круціў яе ў пальцах, але так і не прыпаліў, узяў свае рэчы і няспешна падаўся да барнай стойкі. Яму трэба было выпіць, каб супакоіцца і ўсё ўзважыць.

*... Алекс даў мне свой калекцыйны кій, які заўсёды вазіў з сабой. Ён вучыў мяне гуляць да самага світанку. Атрымлівалася ў мяне кепска. На раніцу ён падвёз мяне дадому. Мы развіталіся. Я думала — усё. Больш ніколі з гэтым вялікім, змрочным і ўладным мужчынам не сустрэнуся. Калі і сустрэнемся выпадкова, то павітаемся, і не больш за тое. А назаўтра ён з'явіўся з кветкамі. Аказалася, што ведае пра мяне ці не ўсё. Мы пераязджалі з аднога клуба ў другі. Яго паўсюль ведалі. Я ж пра яго не ведала нічога. Гэта толькі цяпер я разумею сваю памылку. Ён, як багна, якая зацягвае. І, чым больш торгаешся, тым глыбей вязнеш. Але першыя дні знаёмства Алекс мне падаваўся незвычайным...*

— Пераапранайся хутчэй, — прыспешваў Ганну Алекс, — наш столік нас чакае. А потым кіруем да мяне.

Ён сядзеў на канапе, нага за нагу, нават паліто не зняў. На каленях ляжаў празрысты «файл» з ксеракопіямі дакументаў, знойдзеных Ганнай у нямецкім архіве.

— Дзе чакае? — Мятліцкай было не па сабе, — у «Журавінку» я не паеду.

— Хочаш, у гатэль паедзем?

— Я ўвогуле, нікуды не хачу ехаць. Я стамілася. Хачу пабыць адна.

— Ты гэта кінь. Не патэлефанавала, калі прыляціш. Я даведаўся, адмяніў дзве сустрэчы, паімчаўся... змазала мне вечар. А ты тут пачынаеш. Не хочаш ехаць. Не трэба. Мой вадзіцель усё сюды прывязе. Ганна, не выдурняйся, хуценька-хуценька надзявай сваю чорную сукенку і паехалі. Вып'ем, патанцуем. А потым да мяне.

— Я не хачу да цябе.

— Ну вось, пачалося. Як я ўсё гэта не люблю. Я хоць і чалавек вядомы, і ў маіх продкаў былі землі ў Саксоніі з маёнткам, але насамрэч, канкрэтны.

— Я табе што, сабачка? Які павінен скакаць на задніх лапках і выконваць твае жаданні? Я чалавек, Алекс.

— Што-што? — Фасманскі ажно прыўзняўся. — Што ты там пра чалавекаў? А я што, не чалавек?

— Алекс, я табе зрабіла працу, ты за яе заплаціў. Вось і ўсё. Я даўно хацела табе сказаць. І не тэлефануй мне больш. І ключы аддай, — Ганна працягнула далонь.

— Ну, ну, дзяўуля. Мы сталі самастойнымі? Гэта з якіх такіх часоў? Ды я зраблю так, што ў цябе нават капейкі не будзе, што цябе на парог нікуды не пусцяць. Ты каго, мяне кінуць вырашыла?

— Ключы, — паўтарыла Ганна.

— Ну, табе ж са мной добра, бяспечна. Я гэта ведаю, — Алекс адчыніў шафу, дастаў чорную сукенку на плечыках, — апранай.

— Ключы, — Ганна не зрушылася.

— Не разумееш, — Фасманскі гледзеў у вочы Ганне і павольна раздзіраў сукенку напалам.

— Ты звер, жывёла, — прашаптала Мятліцкая. — Ключы.

Фасманскі выцягнуў з шафы наступную сукенку.

— Чырвоная. Пяцьсот баксаў. Едзем, пісьменніца, гуляем?

— Ключы.

Затрашчаў чырвоны ядваб. Два кавалкі бязгучна ўпалі на падлогу.

— Ты падумай, — сказаў Фасманскі, дастаў з кішэні ключы, грэбліва кінуў міма рукі на падлогу, забраў «файл» і сышоў.

Ганну калаціла. Яна не магла супакоіцца і нават не здолела прыпаліць цыгарэту. Шклянка барабаніла аб зубы. Слёз не было. Мятліцкая замкнула дзверы, падняла з падлогі падраныя сукенкі, скамячыла іх і запхала ў чорны пакет для смецця. Заценькаў мабільны, высветліўся нумар Алекса. Ганна адключыла трубку. Ледзь не адразу ж аджыў апарат на стале. Мятліцкая вытаргнула дрот з раз'ёму. У кватэры стала вельмі ціха. У трубах усхліпвала вада. За сцяной заплакала дзіцянё.

— Вось і ўсё, — сказала Ганна, — старонка перагорнута. «Кілбасніка» больш няма і не будзе.

Мятліцкая перацягнула чамадан на сярэдзіну пакоя і ўзялася яго разбіраць. Яна складала рэчы на паліцы, вешала на плечыкі, а потым у шафу. Касметыку занесла ў ванны пакой. Падумала і пусціла ваду, наліла гелю і доўга глядзела, як б'е струмень, як снежным сумётам расце пена. Яна ўжо хацела распрануцца і легчы ў гарачую ваду, як у перадпакоі блямкнуў званок.

Мятліцкая закруціла кран.

— Гад, — яна на дыбачках наблізілася да дзвярэй і зазірнула ў вочка.

Пальцы не слухаліся, і яна не адразу здолела павярнуць ключ.

— Фелікс, ты? — Ганна дакраналася да яго твару, да рук, быццам сто гадоў не бачыла, і ўжо не спадзявалася калі-небудзь убачыць, — як ты мяне знайшоў?

— Я паглядзеў твой пашпарт.

— Калі?

— Там, у аэрапорце.

— А ў мяне нават кавы няма.

— Затое ў мяне ёсць, — Фелікс закаціў у кватэру чамадан і па-гаспадарску ўзяўся яго распакоўваць.

На століку з'явіліся кава, цукеркі, шампанскае.

— Я чамусьці падумаў, што ты будзеш сёння адна. Пасядзеў у бары, узяў таксі і адразу паехаў да цябе.

— І правільна...

*...дзіўна, чаму акрамя мяне цябе ніхто не бачыць? Ты сам гэтага не хочаш? Цяпер я разумею, мастакі прыдумалі дамалёўваць анёлам крылы, каб яны адрозніваліся ад людзей. У цябе ж няма крылаў? І чаму ты ходзіш босы? Дзе твае сандалі? Хто табе так акуратна і ўмела перавязаў руку? Я б так не змагла. Як ты мяне знайшоў? Каб не твая далонь, ён бы забіў мяне...*

— Аляксандр Францавіч, вас пачакаць? — спытаў вадзіцель, калі Фасманскі выбраўся з машыны.

— Чакай, калі што, я на тэлефоне, — Фасманскі працягваў націскаць кнопкі мабільніка, — абанент недаступны. Я табе пакажу недаступны.

Ён п'яна хіснуўся, але ўтрымаў раўнавагу і на высокі ганак узбег. Не стаў набіраць нумар кватэры. Прыціснуў ключ, цяжкія жалезныя дзверы прамармыталі нешта неразборлівае і адчыніліся. Фасманскі даў нырца ў цёмны пад'езд, спатыкнуўся аб прыступку, вылаяўся. Ліфт не працаваў. Праз пару хвілін задыханы і злосны Фаманскі ўжо стаяў на сёмым.

— Ключы яна забрала, ха! Ажно два разы. Хто плаціць, той і танцуе дзяўчыну, — ён палез у кішэню і выцягнуў новенькі бліскучы ключык.

Падсвяціў мабільнікам. Ключ правярнуўся. Фасманскі ціха адчыніў дзверы і ўвайшоў у кватэру, пераступіў абутак.

Няпрошаны госць агледзеўся ў цёмным пакоі, заскрыгатаў зубамі, наблізіўся да канапы, схіліўся. Зеленкаватае святло мабільніка прайшлося па разабранай канапе. Ганна спала на плячы ў Фелікса і шчасліва пасміхалася.

— Тэлефон яна адключыла, — надзіва спакойна прамовіў Фасманскі, — зараз усё будзе ўключана.

Успыхнула святло. Фасманскі схапіў за край коўдру і пацягнуў на сябе. Сагнутая ў калене нага Ганны ляжала на нагах Фелікса. Стомленыя каханкі нават не прахапіліся, адно Мятліцкая прамармытала нешта пяшчотнае і прысунулася да Фелікса яшчэ шчыльней.

— Пад'ём! — раўнуў Фасманскі.

Ганна расплюшчыла вочы і закрычала. Фасманскі нахабна засмяяўся.

— І што, ён лепшы за мяне? Шчанюк.

Ганна паспрабавала выхапіць коўдру, каб прыкрыцца, але Фасманскі адкінуў яе да сцяны. Твар начнога госця не абяцаў нічога добрага. Усмешка крывіла бяскроўны рот.

— Дай хоць апрануцца, — спакойна прамовіў Фелікс, — тады і пагаворым.

Ён хацеў падняцца.

— Ляжаць, сукі! Дайце я на вас апошні раз пагляджу.

— Не трэба, — схапіла Феліксаву руку Ганна.

Але Фелікс вырваўся з Ганніных рук, падняўся. Ён, як быў голы, кінуўся на Фасманскага. Той ударыў спачатку ў жывот, потым у галаву. Фелікс абрынуўся на часопісны столік, зазвінелі разбітыя келіхі, звалілася недапітая бутэлька шампанскага.

— Алекс, супакойся, калі ласка, прашу цябе. Я ўсё растлумачу, — галасіла Ганна.

Фелікс паспрабаваў зноў падняцца, але Фасманскі выцяў яго нагой.

— Не трэба, Алекс, — Ганна саслізнула з канапы, раскінула рукі, прыкрыўшы каханка.

— Адыдзі, гэта я зараз яму ўсё растлумачу, — Фасманскі пяшчотна дакрануўся да пляча Ганны, адсунуў жанчыну ўбок.

— Не! — крыкнула Мятліцкая.

Алекс нахіліўся, схапіў важкую бутэльку з-пад шампанскага, разбіў яе аб столік. З яго кулака тырчэлі тры вострыя іклы цёмна-зялёнага шкла.

— Сучка, — прамовіў Фасманскі і зрабіў крок да Фелікса. — Заб'ю, і мне нічога не будзе. Ты ж ведаеш, я кантужаны.

— Алекс, Алекс, не трэба!

Фасманскі павярнуўся. Ганна стаяла перад ім голая і безабаронная.

— Прыгожая, — адзначыў Алекс і дадаў, — была.

Фасманскі насоўваўся, Мятліцкая адступала, пакуль не ўпёрлася плячыма ў сцяну. Яна глядзела на бліскучае шкло, з якога зрываліся кроплі. Яна бачыла, як правая рука Фасманскага набрала размах і імкліва паляцела на яе. Пачуўся хрубаст шкла. Зялёныя іклы рассыпаліся, аскепкі заценькалі на паркеце.

Твар Фасманскага зрабіўся неверагодна чырвоным, вочы вырачыліся, ён спрабаваў пасунуць руку наперад, але яна не ішла. Пальцы расціснуліся, рыльца ўпала да ног Ганны. Алекс нешта закрычаў, абхапіў галаву рукамі і кінуўся прэч з кватэры. Дзверы гучна ляснулі.

Стала ціха, быццам анёл праляцеў...

* * *

Толькі калі таксі звярнула с праспекта на Купалаўскую і ўехала ў арку, Фелікс паляпаў сябе па кішэнях і зразумеў, што свой мабільны забыўся ў Ганны.

«Добрая прыкмета, — падумаў ён, выцягнуў з кішэні згубленую і шчасліва знойдзеную партманетку, разлічыўся з таксістам. — Родны дом, родны двор. Заўсёды прыемна вяртацца».

Нават скрыгатанне тросаў старога ліфта не раздражняла. Колькі Фелікс сябе памятаў, ліфт падазрона скрыгатаў. Ён расчыніў клетку, выкаціў на пляцоўку чамадан. Можна было пазваніць у дзверы, але Фелікс перадумаў. Не захацеў лішні раз турбаваць дзеда. Ключ у замку не правярнуўся. Фелікс ціскануў ручку, дзверы рыпнулі і адчыніліся. У перадпакоі было цёмна. Фелікс аб нешта спатыкнуўся, запаліў святло. Пад нагамі ляжала мармуровая дошка з прымацаваным да яе перакідным календаром.

— Алё, дзед! А вось і я. Ты дзе? — гукнуў Фелікс і з важкай дошкай у руках пайшоў па доўгім калідоры.

Стары паркет парыпваў. Дзверы кабінета аказаліся прачыненыя. Прыкрыты пледам дзед ляжаў на скуранай канапе. Вочы заплюшчаны. Фелікс з палёгкай уздыхнуў, ціхенька паставіў каляндар на пісьмовы стол. Падышоў да канапы, асцярожна крануў дзедава плячо.

— Ты што, кепска сябе адчуваеш?

Лоб у дзеда быў халодны. Феліксу зрабілася млосна, ён адышоў ад канапы, прысеў на стол.

— Вось так, — прамовіў ён, — а яшчэ ўчора я з ім гаварыў.

Ён паспрабаваў згадаць апошнія пачутыя ад дзеда словы. Яму падалося, што гэта надзвычай важна. Што ў такіх выпадках рабіць, Фелікс не ведаў. Вярнуўся ў передпакой, дзе стаяў стары тэлефонны апарат. Набраў нумар «хуткай дапамогі» і чамусьці ўзяўся тлумачыць дыспетчару, што вось, ён — Фелікс, вярнуўся з Германіі, зайшоў у кватэру, а яго дзед Якаў Міхайлавіч Рэй, нежывы. І што яму, Феліксу, зараз рабіць, ён не ведае. Папрасілі не хвалявацца, назваць дакладны адрас і пацікавіліся, ці ёсць у доме ліфт.

Фелікс зацягнуў у кватэру чамадан, схадзіў на кухню і згатаваў сабе каву, з цыгарэтай і з кубкам кавы сеў да стала і стаў чакаць «хуткую дапамогу».

«Ну, а што зробіш. Дзед стары. Некалі ж гэта павінна было адбыцца. Вось яно і здарылася. Трэба будзе патэлефанаваць маме ў Канаду. Шмат чаго давядзецца рабіць. Перад смерцю заўсёды адчуваеш разгубленасць».

У дзверы пазванілі. Увайшоў мужчына ў белым халаце і малады практыкант з чамаданчыкам. Павіталіся. Прайшлі ў кабінет, папрасілі гаспадара ўключыць святло. Фелікс зноў пачаў тлумачыць, што ён вось толькі што вярнуўся, а дзед...

Доктар прыўзняў нябожчыку павека, акуратна скінуў плед, паспрабаваў расціснуць пальцы, сагнуць руку. Цела скранулася з месца. Доктар абышоў канапу, прысеў.

— Дай ліхтарык, Валерка, — папрасіў ён у маладзёна.

Практыкант выцягнуў з кішэні халата маленькі ліхтарык, перадаў доктару.

— А што там, Пятровіч?

— Кроў. Галава ў старога разбітая. І моцна-такі. Трэба міліцыю выклікаць.

— Міліцыю? — не адразу скеміў Фелікс.

— Ну, а як? Гэта ўжо не мая праблема.

Міліцыя прыехала праз чвэрць гадзіны. Жанчына-эксперт зрабіла выснову, што смерць настала прыкладна шаснаццаць — дваццаць гадзін таму. Следчы запатрабаваў у Фелікса квіток на самалёт і дакументы.

У тым, што Якаў Міхайлавіч Рэй памёр не сваёй смерцю, ані эксперт, ані следчы, ані нават участковы, не сумняваліся.

Фелікса затрымалі.

— Я магу патэлефанаваць? — спытаў ён.

— Адвакату?

Следчы зірнуў на судмедэксперта, жанчына якраз пакавала ў празрыстую торбу перакідны каляндар, на рагу якога яна знайшла засохлую кроў.

* * *

Двойчы далікатна блямкнуў званок. Ганна ўсміхнулася, яна ўжо паспела нафарбавацца.

— Сам прыехаў. Гэта ж колькі мы не бачыліся? Тры гадзіны дваццаць адну хвіліну. Вось ты якое, шчасце, — з мабільнікам, забытым Феліксам, Ганна пайшла адчыняць.

Яна настолькі была ўпэўнена, што за дзвярыма Фелікс, што нават не зірнула ў вочка.

— Добрай раніцы, Ганна Станіславаўна.

У парозе стаяў вадзіцель Фасманскага — Андрэй. У левай руцэ мужчына нязвыкла трымаў букет ружаў, у правай — дзве сукенкі на плечыках, запакаваныя ў празрысты цэлафан.

— Аляксандр Францавіч прасіў перадаць, — і дадаў ужо нібыта «ад сябе». — Сам ён вельмі заняты, да яго немцы прыехалі. Памер ваш, не сумнявайцеся. Мы з босам разам ездзілі. Дзяўчаты памер ваш памятаюць. А чорную давялося з манекена зняць. Аляксандр Францавіч папрасіў.

— Ведаеш што, Андрэй, а я не вазьму.

— Пакрыўдзіцца Аляксандр Францавіч. Моцна пакрыўдзіцца. Вы яму патэлефануйце.

— Не верце данайцам... І тэлефанаваць я не буду.

— Якім дунайцам? Дык што босу перадаць?

— А, што хочаш.

— Ой, Ганна Станіславаўна, вы ж яго ведаеце.

— Ведаю, на жаль. Ён знойдзе, каму ўсё гэта аддаць. Выбачай, Андрэй, — Ганна адступілася і зачыніла дзверы.

Яна села на сабраную канапу і адшукала нумар Феліксавага дзеда — у памяці трубкі так і было занатавана «мой дзед».

— Алё, алё, добры дзень, мне Фелікса, калі ласка.

— А хто яго пытае? — пачулася ў адказ.

— А вы яго дзед, Якаў Міхайлавіч?

— Не зусім.

— Я не памылілася?

— Не.

— Дык вы можаце паклікаць Фелікса? Я яго знаёмая.

— На жаль, не магу.

— А з кім я размаўляю?

— Следчы пракуратуры Скварцоў Аляксандр Пятровіч.

— Ой!..

*...толькі зараз я заўважыла, што ў цябе няма ценю. Ты пакінуў яго на карціне? А ў мяне ёсць цень, ці яго забрала тая ноч? Трэба падняцца, але я ляжу. Хаця б узняць руку. Не атрымліваецца...*

Мікрааўтобус з таніраваным шклом мінуў кавaную браму Нясвіжскага парку. Служачы музейнага комплексу ў сіняй ватоўцы і памаранчавай камізэльцы падумаў, што вось зараз лёгка і заробіць з турыстаў на пляшку гарэлкі — здыме адкупныя з парушальнікаў. Ён прыставіў да дрэва граблі, важна выйшаў на алею, ускінуў руку. Але рука тут жа сама і апусцілася. За лабавым шклом мікрааўтобуса зырчэў пропуск з гербам і сцягам. Перад такімі прапускамі нават нахабныя даішнікі губляюцца. Служачы імгненна знік за дрэвам, захрабусцелі хмызы.

З мікрааўтобуса выйшаў высокі сівавалосы мужчына ў светлым плашчы. Ён нават не зірнуў на радзівілаўскі палац, які праглядаў праз дрэвы, кранутыя першай, яшчэ празрыстай зелянінай, мацней сціснуў ручку кейса і таропка падаўся да возера. З вады дзьмуў прахалодны вецер. Але сівавалосы нават не прыпыніўся, каб зашпіліць гузікі плашча. Спачатку ён убачыў чорны мерседэс барона з дыпламатычнымі нумарамі. А потым і яго самога. Барон фон Штайн, як заўсёды элегантны, стаяў на драўляным мосце, глядзеў, як вецер моршчыць халодную ваду. Сталёвага колеру паліто, чорны шалік, тонкія скураныя пальчаткі. У пальцах барон круціў цёмныя акуляры.

Зарыпелі дошкі насцілу, дзве чорнагаловыя кірлі сарваліся з парэнчаў і паляцелі над возерам да выспы. Барон фон Штайн павярнуў галаву, начапіў акуляры. І адразу ж зрабіўся падобным да кінаартыста, які вырашыў схавацца ад надакучлівых прыхільнікаў.

— Чаму менавіта тут, гер барон? — сівавалосы агледзеў парэнчу, ці не запаскудзілі яе птушкі, і абапёрся локцем, кейс працягваў трымаць у руцэ.

— Ціха тут, спадар Альшанскі. А як вы думаеце, нас зараз фатаграфуюць?

— Не, — упэўнена адказаў сівавалосы.

Гаварылі мужчыны па-нямецку. Альшанскі з ледзь заўважным польскім акцэнтам, фон Штайн — з паўднёва-амерыканскім.

— Якая прыгажосць, — ціха сказаў барон, гледзячы на неспакойную ваду.

Альшанскі перасмыкнуў плячамі:

— З вашымі магчымасцямі вы б маглі набыць усё гэта ва ўласнасць.

— Не прадаецца.

— У вас нейкі сантымент да гэтага месца?

— У сямейным архіве захавалася колькі здымкаў сорак другога года. Тут быў шпіталь. Бацька наведваў параненага кузена. На беразе гэтага возера яны і сфатаграфаваліся. Зрэшты, тут мала чаго змянілася. Бацькаў кузен загінуў пад Сталінградам, згарэў у самалёце. А вось майму бацьку пашанцавала. Дажыў да шэсцьдзясят пятага. Усё марыў вярнуцца ў Германію і быць пахаваным у родавым склепе. Я гэтае жаданне спраўдзіў. Было ў яго яшчэ адно жаданне... Пяройдзем да справы, спадар Альшанскі.

— Так, так... да справы, а тое тут прахалодна, — сівавалосы адчыніў кейс і падаў вялікую рудую капэрту. — Гэта тое, што вас цікавіць.

У капэрце аказалася парэзаная і запраўленая ў поліэтылен чорна-белая стужка і стос фотаздымкаў. Барон зняў акуляры, паклаў іх на парэнчы і ўзяўся пераглядаць здымкі. Альшанскаму падалося, фон Штайн так заглыбіўся, што нават забыўся на яго існаванне.

— Добра, — нарэшце прамовіў барон, — я рады, што мне рэкамендавалі менавіта вас. Грошы, якія я абяцаў, вы атрымаеце ўжо сёння. Але гэта толькі частка справы. Я заплачу вам яшчэ мільён...

Альшанскі ўздыхнуў.

— Вам скора на пенсію. Такі шанец, — працягваў барон. — Упэўнены, што сумленна зробленыя грошы вам не зашкодзяць.

— Я слухаю, — Альшанскі крыху пачырванеў, а вочы зрабіліся вільготнымі.

— Бачыце гэты партрэт? Вось ён мяне і цікавіць. Мой бацька верыў, і я веру, што гэтая карціна не загінула, не згарэла, а знаходзіцца недзе тут.

— Партрэт савецкага сяржанта? — з недаверам пацікавіўся Альшанскі.

— Партрэт сяржанта намаляваны паверх карціны. Карціна — нашая сямейная рэліквія. Знайдзіце яе. Не мне вас вучыць, як гэта робіцца, — барон схаваў негатывы ў кішэнь паліто, рудую капэрту са здымкамі вярнуў Альшанскаму. — Я пералічу вам яшчэ сто тысяч на выдаткі. Гэтыя грошы не ўваходзяць у ваш ганарар. Спадзяюся, мы дамовіліся.

— А што на карціне?

— Банальна. Анёл са свечкай, — барон прамовіў гэта будзённа і начапіў цёмныя акуляры.

Альшанскі зразумеў, размова скончаная. Вынікамі яе ён быў задаволены.

*...Пасля галоднай і халоднай Масквы Вільня падалася Вандзе раем. З Краеўскім яны сустрэліся ў рэстарацыі. Было цёпла, утульна і смачна. Галоўнае, што нарэшце яны аказаліся разам. На стале гарэла свечка. Пад столлю палымнела жырандоля. Электрычнасць! Пад крэслам Станіслава стаяў цяжкі саквояж з пудам золата. Другі ўжо каціў у цягніку ў Рыгу, а адтуль сябры Краеўскага — былыя супрацоўнікі ЧК, меліся перабрацца ў Амстэрдам.*

*Кава з вяршкамі, міндальныя піражныя, графінчык з лікёрам, духмяная гарбата з цытрынай і вішнёвым варэннем. Усё гэта нібыта вярнулася з таго — з мінулага дарэвалюцыйнага жыцця. А таму і падавалася неверагодна смачным, як у дзяцінстве.*

*Цёплы нумар у маленькім гатэлі, хрумсткія прасціны, шаўковая коўдра... Але затрымлівацца было небяспечна. Хоць і не хацелася з'язджаць, а давялося... Халодны таварны вагон. Два абярэмкі сена на падлозе, два вялікія старыя кажухі, саквояж пад галовамі. Але ім і тут было добра. Ад Вільні да Варшавы таварняк сунуўся больш за суткі. Праз шчыліны задзімала снегам. Ногі і рукі ўцекачоў дубелі. Але і Краеўскі і Мятліцкая былі ўпэўненыя, што самае цяжкае засталося там, за мяжой...*

— А можна запаліць? — Фелікс паглядзеў на шкляную попельніцу на падаконні, што прыціскала стос спісанай паперы.

— У мяне не паляць, — сказаў следчы, разгарнуў папку. — Вось заключэнне. Тут чорным па белым напісана, што смерць Якава Міхайлавіча Рэя — вынік удару па галаве, праламаны чэрап, кровазліццё ў мозг.

— А я пры чым? Шукайце тых, хто забіў дзеда.

— Навошта шукаць?

— Як гэта, навошта?

— На мармуровай падстаўцы календара — сляды крыві вашага дзеда і, самае галоўнае, адбіткі вашых пальцаў. Вось яны, глядзіце.

— Аляксандр Пятровіч, я ўжо каторы раз вам паўтараю: дзедаў каляндар ляжаў у перадпакоі і я перанёс яго ў кабінет, на стол.

— Так-так, перанеслі ў кабінет... трохпакаёвая кватэра ў цэнтры, двухпавярховае лецішча пад самай сталіцай, зямлі дваццаць сотак, аўтамабіль «ГАЗ-24» з гаражом у двары, грошы. Карацей, усё Якаў Міхайлавіч адпісаў вам. Вось і матыў.

— Я б і так усё атрымаў пасля яго смерці.

— Гэта калі б Якаў Міхайлавіч не перадумаў. Ён жа мог адпісаць маёмасць дзіцячаму дому, таварыству якому-небудзь. Стары чалавек заўсёды капрызлівы. А мог і ажаніцца на старасці гадоў. І тады б усё дасталося не вам, а якой-небудзь маладзенькай медычцы. Вось вы і спалохаліся.

— Якая медычка? Якое там ажаніцца?

— Я такія выпадкі ведаю. Вось непадалёк ад вашага дома ў Бранявым завулку. Васьмідзесяцігадовы гаспадар двухпавярховага асабняка пабраўся шлюбам з саракагадовай масажысткай, якая яго зламаную нагу распрацоўвала, згінала і разгінала, згінала і разгінала... А дзеці пра тое, што стары ажаніўся, і не ведалі. Прайшоў год, персанальны пенсіянер і ласты склеіў. Масажыстка дзецям і ўнукам — кукіш з маслам. А вы мне расказваеце, што не бывае.

Следчы пераможна паглядзеў на няголенага і нявыспанага Фелікса.

— Калі дзед памёр, мяне не было ў кватэры. Я прыехаў раніцай, можаце ў таксіста спытаць.

— Спытаем. Але вы маглі прыехаць і раней. Самалёт жа ваш прыляцеў увечары. Крутануліся, забілі дзеда і... да жанчыны, каб алібі сабе забяспечыць.

— Я сядзеў у бары аэрапорта. Гэта могуць пацвердзіць. Потым злавіў прыватніка і паехаў да знаёмай.

— А што ж вы разам з ёй не паехалі? Два разы плаціць давялося. Колькі цяпер таксі да горада?

— Пяцьдзесят.

— Летась — сорак было. Мы з жонкай у Крыме адпачывалі. Добра там, толькі дорага яно, самалётам. Ну ладна, паліце, — следчы паклаў перад Феліксам цыгарэты і ружовую запальнічку.

— Дзякуй.

— Гаварыў я з Ганнай Станіславаўнай...

— Як яна?

— Нармалёва. Усміхаецца нават. А хто гэта вам тэлефанаваў, грошы прапаноўваў?

— Якія грошы? А... немец нейкі, з фонду. Ці тое «Замірэнне», ці тое «Пакаянне». Я з ім нават не сустракаўся, не склалася.

— І шмат ён прапанаваў?

— Дастаткова. Але дзед наадрэз адмовіўся, сказаў, гісторыяй не гандлюе. Не любіў ён немцаў.

— Ну гэта зразумела. Халакост.

— Пры чым тут халакост? Дзед на фронце быў.

— А дастаткова, гэта колькі?

— Сто тысяч.

— Даляраў?

— Еўра, відаць. Я нават не спытаў.

— За фотаздымкі старыя?

— За негатывы, за архіў.

— А вы не заўважылі, нічога з кватэры не знікла?

— Не, не падумаў, не паспеў звярнуць увагу. Вы думаеце?..

— Даводзіцца і над гэтым думаць.

На стале закруціўся танны мабільнік. Следчы зірнуў на нумар і пасур’ёзнеў.

— Скварцоў. Слухаю... Так-так, тут... я разумею гэта. Але ж адбіткі? — следчы падняўся з-за стала, падышоў да акна і працягваў размову. — Ну, гэта зразумела. Дваццаць гадзін праляжала цела Якава Міхайлавіча ў кватэры... Ёсць такая выпіска ў заключэнні экспертаў. Чаму цягнем? Згодны, не ідыёт жа ён... Дык вы прапануеце?.. Дзякуй за званок. Да сустрэчы.

— А можна яшчэ цыгарэту?

— Можаце і пару штук узяць. Тут вось зараз высвятліліся некаторыя абставіны. Я, відаць, вас хутка адпушчу... пад падпіску.

— Што, затрымалі забойцу?

— З гэтым праблемы. Гэта потым, — крыху замітусіўся следчы і ўзяўся збіраць паперы.

* * *

Офіс Фасманскага — адрамантаваны, перабудаваны дзіцячы садок. Мятліцкая пад’ехала на сваім опелі і прыпаркавалася побач з мерседэсам Алекса.

Вадзіцель Андрэй праціраў нумар з чатырох сямёрак.

— На месцы, у більярднай, — падказаў ён.

Фасманскі быў сёння ў белай кашулі з падкасанымі рукавамі. Кій у яго моцных руках здаваўся бязважкім дубчыкам. Алекс заўсёды, калі збіраўся прыняць вызначальнае рашэнне, гуляў у більярд на адзіноце. Ён убачыў Ганну і з яго сціснутых пальцаў пасыпалася раструшчаная крэйда.

— Не чакаў. Да шароў не дакранайся. Тут камбінацыя складаная і я нават не ведаю, ці змагу што зрабіць, — Алекс глядзеў на цёмна-зялёнае сукно більярднага стала.

— Зможаш, — Мятліцкая наблізілася да Алекса.

— Думаеш, атрымаецца? Тут такія грошы, што нават дых перахапае. А ў мяне не стае зусім няшмат. У цябе часам няма мільёна еўра? Усяго толькі.

— Я па іншых справах. Ты можаш мяне выслухаць?

— Толькі мільён і заводзік мой. З усім абсталяваннем, з рэпутацыяй, брэндам-шмэндам. На пряцягу тыдня я павінен даць адказ, і да канца года знайсці грошы. Я разумею, ты ўсё ўзважыла, прыкінула... Я згодны, давай мірыцца. Я прашу прабачэння за сваю нястрыманасць. Але і ты мяне зразумей. Мы не бачыліся два тыдні. Чатырнаццаць дзён. Вось кроў мне ў галаву і дала.

— Алекс, Фелікса затрымала міліцыя.

— Гэта той, каторы?

— Ён самы.

— «Па тыпу» каханне з першага пагляду?

— Пры чым тут зараз гэта? Ён у турме. У следчым ізалятары.

— За што хлопца ўзялі? Ён мне спадабаўся, адчайны.

— Абвінавачваюць, што ён той ноччу забіў свайго дзеда.

— Хай пасядзіць. Можа, зразумее, што не варта на чужое рот раззяўляць.

— Ну, хопіць, я прыехала сур’ёзна пагаварыць.

— Я разумею, ты хочаш, каб я сказаў мянтам, што мы былі той ноччу ўтрох?

— Так і было.

— Толькі рэч у тым, што вам было добра, а мне кепска. А гэта, як кажуць, дзве вялікія розніцы. Ты мне ў твар плюнула.

— Прабач.

— Дамовіліся. Я паспрабую твайго маладзёна выцягнуць. Але з той умовай, што ўсё ў нас стане, як і было.

Ганна задумалася. Яна глядзела на шары, на Фасманскага і ў яе было адчуванне, што яна ўжо ляціць у бяздонную прорву.

— Цяжка адмовіцца ад салодкага. Але выбірай.

Фасманскі абышоў більярдны стол, быццам Ганны тут ужо і не было, нахіліўся, ціхенька крануў кіем шар. Той лёгка пабег па зялёным сукне ўздоўж борціка, цюкнуў другі шар. Яны раскаціліся і амаль адначасова зваліліся ў лузы.

— Атрымаецца, — сказаў Фасманскі.

— Дык ты дапаможаш мне?

— Ёсць у мяне сябры ў пракуратуры. Разам ваявалі. Паехалі перакусім, нешта есці захацелася.

— Не магу, Алекс. Да доктара трэба.

— Ну... глядзі, — Фасманскі наблізіўся да Ганны, узяў яе за плечы і пацалаваў.

І не было ў яго хуткім пацалунку, як падалося Ганне, ані кроплі жарсці. Звычайны дотык. Так сутыкаюцца касцяныя шары на більярдным стале і кожны сыходзіць па сваёй траекторыі.

*...мабільнік — гэта зручна. Мабільнік як нацельны крыжык, ён ёсць ці не ў кожнага. Праз нашы тэлефоны яны нас і вылічылі. Гэта ж так проста! Я тэлефанавала Феліксу, ці ён мне? Зрэшты, якая цяпер розніца? Калі я ўбачыла вайсковы аўтамабіль з вусамі антэн, мне ўсё стала зразумела. Столькі разоў пісала пра мабільнікі, нават рэкламныя тэксты для буклетаў. Магла б і здагадацца, наколькі гэта небяспечная рэч. Так, не Фелікс, а я патэлефанавала яму і пахвалілася, што набыла шпалеры ў дробныя кветачкі. А ён пацікавіўся: ці прыгожыя, імпартныя, ці айчынныя? Вось і пагаварылі.*

*Ну чаму здаецца, што ліхое здарыцца з кімсьці іншым, а цябе абміне?..*

Ян Карлавіч Мятліцкі, былы настаўнік каліграфіі ў жаночай гімназіі, у трохпакаёвай кватэры жыў пакуль адзін. Хоць і хадзілі чуткі, што неўзабаве яму давядзецца перабрацца ў самы маленькі пакой. А таму стары чалавек паціху парадкаваў рэчы, самае каштоўнае пераносіў у той маленькі пакой, які двума вокнамі глядзеў у Калакольнікаў завулак. У Маскве ўжо па-зімоваму схаладала. Грубку даводзілася паліць самому і тое толькі два разы на тыдзень.

Ну, якія каштоўныя рэчы могуць быць у старога настаўніка? Кнігі, сшыткі, альбомы з фотаздымкамі, посуд, пісьмовы прыбор. Усё па-сапраўднаму вартае Ян Карлавіч прадаў, змяняў на харчы, дровы, лекі. Ён хадзіў па кватэры ў старой жончынай заечай камізэльцы, якую дзесяць гадоў таму збіраўся аддаць дворніку. А цяпер радаваўся, што не аддаў. Яна грэла яго нямоглае цела.

Ян Карлавіч прынёс з кухні ў кабінет невялікі абярэмак дроў. Распаліў грубку. Сеў побач з ёй, паклаў на калені кнігу, разгарнуў наўздагад. Суцяшэнне апошнім часам знаходзіў толькі ў чытанні. Але паспеў прачытаць толькі тры радкі. У дзверы пагрукалі. Моцна, нахабна. Стары з кнігай у руцэ падаўся адчыняць.

— Хто там? — пацікавіўся ён.

— Адчыняйце! — пачулася ўладнае, і дзверы тарганупіся.

Ян Карлавіч адкінуў засаўку. У передпакой адразу ж уваліліся двое. Тыцнулі ў твар мандат.

— Мы з ЧК.

— Праходзьце, таварышы. Чым магу дапамагчы? — прыціснуўся да сцяны былы настаўнік каліграфіі.

За дзевяць доўгіх гадоў новай улады Ян Карлавіч так і не здолеў прыстасавацца да новых зваротаў. А таму слова «таварышы» прагучала няшчыра.

— Мятліцкі? — пацікавіўся няголены чэкіст у шэрым ангельскім палітоне, з-пад якога выглядалі бліскучыя хромавыя боты.

— А то! — сказаў другі чэкіст, ад якога патыхала тытунём і мокрай скуранкай, — дворнік жа сказаў, што ён дома.

Ян Карлавіч мітусліва таргануўся, зрабіў крок, але чэкіст схапіў яго за руку. Разгорнутая кніга выпала на падлогу. Другі чэкіст нахіліўся, падняў. Кніга была папольску. Напружыўся, але здолеў-такі прачытаць, блытаючы націскі:

— Адам Міцкевіч, пан Тадэвуш.

— Пра паноў, падла, чытае!

— Таварышы, мая пляменніца Ванда ў вас, у ЧК працуе. У самога Фелікса Дзяржынскага.

— Супадае, — пераглянуліся чэкісты.

— Працавала — гадзіна польская. Дзе яна зараз? Што маўчыш?

Чэкіст у палітоне пачаў біць Яна Карлавіча кнігай па галаве. Стары чалавек спрабаваў прыкрыцца рукамі, але гэта слаба дапамагала. Ён ачомаўся, калі ўжо сядзеў на падлозе, а на галаву яму лілі халодную ваду з чайніка, які гаспадар кватэры збіраўся закіпяціць.

— Я не ведаю, дзе Ванда. Яна даўно не заходзіла.

Чэкіст у скуранцы зняў васьміклінку, выцер спатнелы лоб.

— Ты вось што, гніда польская, не круці. Кажы, дзе твая пляменніца. Пся крэў.

Ян Карлавіч адно адмоўна хітаў галавой. Чэкіст няспешна запусціў руку пад скуранку.

— Твая работа, падла старая? — ён асцярожна разгарнуў перакладзены на чатыры ліст паперы. — Ты пісаў?

— Прабачце, я не бачу, што гэта.

— Ён не бачыць! — чэкіст таргануў Яна Карлавіча за каўнер, паставіў на ногі, пацягнуў у кабінет, — калі скажаш, дзе шукаць тваю Ванду, жыць застанешся, а не скажаш...

Той, каторы быў у паліто, кінуў кнігу на падлогу, выхапіў наган.

— Лічу да трох.

— Зараз ён скажа. Хоць і стары, а жыць таксама хоча.

— Раз...

— Я не ведаю.

— А ліст ад імя таварыша Дзяржынскага ты, падла, падрабіў? Яна дыктавала? З кім прыходзіла? Краеўскага ведаеш? Куды яны збіраліся потым?

Ян Карлавіч міргаў і спрабаваў успомніць апошнія словы, якія сказаў на развітанне Вандзе і яе спадарожніку.

«Спадзяюся, вы будзеце шчаслівыя...» — згадаў іх і ўсміхнуўся.

— Смяецца, падла. Ён напісаў, каліграф, — зноў зблытаў націск чэкіст у ангельскім палітоне. — Два! — выгукнуў ён і рукаяткай нагана ўдарыў старога ў твар.

Ян Карлавіч страціў прытомнасць і асунуўся на падлогу.

— Якога хрэна ты яго ў морду? Казалі ж, жывым.

— Жывы яшчэ, не хвалюйся. Мала даў. Давай вобыск рабіць. Лісты, паштоўкі, фотаздымкі — усё забраць трэба.

Чэкісты рабілі пераструс. Ян Карлавіч ляжаў на падлозе, прыціскаў правую руку да сэрца. На твары быў пакутлівы выраз. Не хапала паветра.

Калі чэкісты выйшлі з кабінета, настаўнік каліграфіі быў ужо нежывы.

— Ну і памёр. Затое, вось, — чэкіст у скуранцы паляпаў сябе па калене стосам капэртаў і паштовак. — Усе адрасы маем.

У руках другога чэкіста быў фотаздымак гэтага года, зроблены ў Маскве — Ванда Мятліцкая і Станіслаў Краеўскі. Дзяўчына сядзела на венскім стуле, а мужчына ў кароткім скураным паліто стаяў за ёй. Яго рука ляжла ў яе на плячы.

— Пайшлі, Сідар, скажаш дворніку, што настаўнік памёр.

* * *

Фасманскі стаяў і глядзеў у акно на тое, як выязджае са стаянкі серабрысты опель.

— Клікалі, Аляксандр Францавіч? — у більярдную зайшоў Андрэй. — Усё нармалёва, бос?

— Здаецца. Зробіш вось што...

— Сукенкі завезці?

— І гэта таксама. Колькі ты ў мяне ўжо працуеш?

— Пяты год.

— Андруха, — летуценна прамовіў Фасманскі, — мяне павозіць хто-небудзь іншы. Добрых вадзілаў на свеце хапае.

Андрэй напружыўся, у пальцах нервова закруцілася запальнічка.

— Вы што, мяне?..

— Ты не так зразумеў. Возьмеш двух са службы бяспекі. Я павінен ведаць пра яе ўсё. Дзе была, што ела, з кім сустракалася, да якога доктара ездзіла, і якія лекі ёй прапісалі, каму тэлефанавала, і хто тэлефанаваў ёй, колькі грошай зарабіла, і колькі патраціла. Кожны крок.

— Зробім, бос.

— І кожны дзень будзеш мне дакладаць.

— Адразу ж і пачынаць?

— З гэтага моманту.

*...я прыйшла ў краязнаўчы музей за дзесяць хвілін да закрыцця. Хацелася глянуць артэфакты. Для літаратуры фактура патрэбна. Магчыма, каму-небудзь іншаму і параілі б прыйсці назаўтра. Але маё журналісцкае пасведчанне і ўсмешка падзейнічалі. Крыху мітуслівы дырэктар мсціслаўскага музея, больш падобны да агранома, загадаў, каб мне дазволілі агледзець экспазіцыю, гукнуў Веру Сяргееўну. Я хадзіла па маленькіх залах, зазірала ў шкло вітрын. А за мной нячутна сунулася немаладая цётка. Запальвала і гасіла святло ў залах. Тая самая Вера Сяргееўна Перагуд. Яна адразу ж паскардзілася на малую пенсію і на тое, што засталося ёй працаваць у музеі да новага года. Я спынялася, спынялася і яна.*

*Наклееныя на кардон зжаўцелыя фотаздымкі канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Гімназісты, служачыя тэлеграфа, дактары, прадавец марозіва, стаматолаг у белым халаце, вусаты жандар. Я злавіла сябе на думцы, што мне падабаюцца гэтыя людзі з мінулага, сур'ёзныя, годныя, быццам у вечнасць глядзяць. Нават срэбны ланцужок ад кішэннага гадзінніка, і той падаецца значным. І да мяне тады дайшло, што гэтыя людзі фатаграфаваліся раз ці два за ўсё жыццё. Сфатаграфавацца для іх — падзея. Можа, больш значная, чым пайсці на споведзь у царкву ці ў касцёл.*

*А потым другая зала, другія фотаздымкі: шынялі, будзёнаўкі, скуранкі, партупеі, наганы. З твараў знікае спакой і значнасць. А ў вачах сполах і няўпэўненасць. Нават усмешкі не ратуюць. Не ведаю чаму, але я спынілася ў зале, прысвечанай Другой сусветнай, насупраць пацямнелага партрэта салдата. І намаляваны ён быў няўмела, карыкатурна. Але ж спыніў мяне. За маёй спінай прагучаў голас Веры Сяргееўны:*

*— Сокал.*

*— Мянушка такая?*

*— Ды не, прозвішча. Ён з нашых, з мясцовых. Яго бацьку ніхто ў горадзе добрым словам не згадвае, злым быў, чэкістам працаваў. А сын герой. У апошнія дні вайны загінуў. Толькі яго ўдава замуж выйшла. Школьны настаўнік, калі дом бурылі, партрэт знайшоў, у музей забраў. А так выкінуць хацелі.*

*Вера Сяргееўна гаварыла ціха, баючыся парушыць музейную цішыню, і я ледзь разбірала словы. Яна сказала, а я забылася. Я стаяла і глядзела на гэты партрэт і*

*не разумела, што са мной адбываецца. Хацела ісці далей, а не магла. Быццам ён мяне трымаў. Вера Сяргееўна згасіла святло ў зале. Мне хацелася падысці і дакрануцца да партрэта, як да абраза.*

*Мне хацелася дакрануцца да цябе, але тады я не наважылася. Гэта ты зрабіў, каб я на ўсё забылася? Так? Ты ведаў будучыню...*

**Сівавалосы схіліўся да акенца касы мсціслаўскага аўтавакзала.**

**— Добрай раніцы.**

**— Куды? — звыкла пацікавілася касірка.**

**Але замест грошай на стойку лёг фотаздымак.**

**— Так куды прабіваць? Грошы давайце, — мажная кабета не разумела, ці то салідны мужчына яшчэ не працверазеў з ночы, альбо ўжо каўтнуў і не можа вырашыць, куды ехаць.**

**— Паслухайце мяне ўважліва, шаноўная Галіна Макараўна, — Альшанскі, здалося, нават і не глянуў на бэйдж касіркі, — не марнуйце ані мой, ані свой час. Зірніце на здымак.**

**Касірка па ветлівым і ўпэўненым тоне адчула, што з гэтым чалавекам лепш не спрачацца — начальнік і не мясцовы. Яна ўзяла картку, прымружыла адно вока, быццам цэлілася.**

**— Бачылі іх?**

**— Так, яе бачыла — учора. Якраз на Бялынічы аўтобус ішоў. Па раскладзе, у палове на дзевятую. Пасажыраў набралася дваццаць сем чалавек. Але яна не паехала. Пайшла туды, — касірка тыцнула пальцам у шкло.**

**Сівавалосы азірнуўся:**

**— Адна была?**

**— Там круцілася. Нешта ў камеры захоўвання ці то забірала, ці то пакідала. Я ж не пыталася. Чарга стаяла ў маю касу.**

**— Дакладна яна?**

**— Яна. А хто ж? Не мясцовая, відная. Вось у гэтым шаліку і была, — тоўсты палец касіркі, аздоблены выродлівым пярсцёнкам, упэўнена дзёўб фотаздымак.**

**— Дзякуй, Галіна Макараўна. Вы нам вельмі дапамаглі, — Альшанскі прыбраў здымак.**

**— А яна хто, зладзейка? Адразу мне не спадабалася.**

**Касірка правяла позіркам сівавалосага. Яе крэсла адкацілася ад стала. Галіна Макараўна прыгнулася і адсунула ўбок празрысты пакунак шпалераў, каб не замінаў выпроствацць хворыя ногі.**

**Альшанскі таропка прайшоўся між радамі аўтаматычных камер захоўвання. Усіх ячэек налічыў шэсцьдзесят, незанятых пад два дзесяткі.**

**Двое падначаленых у шэрых плашчах чакалі пры дзвярах. У руцэ па-модна-му няголенага паблісквае металічны тэрмас. Альшанскі на хаду ўладна кідаў у мабільнік:**

**— Я таксама сюды прыехаў не свежым паветрам дыхаць... Цыгель, цыгель, маёр...**

**Мабільнік слізгануў у кішэню.**

**— Ты, Марат, меў рацыю. Касірка яе пазнала, — Альшанскі ўзяў прапанаваную накрыўку з гарачай кавай, пахукаў, зрабіў глыток. — Калі ж я нарэшце высплюся? Трэція суткі на нагах. А ты, Макс, сачы, — дапіў каву і паказаў вачыма на дзве шэрыя сцяны камер захоўвання. — А я ў прыбіральню адскочу, пакуль не пачалося. Маёр паабяцаў.**

**Марат насоўкай выцер край накрыўкі, плюхнуў крыху кавы і абапёрся плячом аб жалезныя шафы. У пачакальні было чалавек пятнаццаць. Маладзён у шапцы з вялікім пампонам забаўляўся з рудым шчанюком. Адкусваў і даваў яму**

**кавалачкі абаранка. За пачастунак шчанюк станавіўся на заднія лапы. Дзве цёткі і дзядзька назіралі за гэтым саматужным цыркам. Чалавек пяць муляліся каля закрытага акенца міжгародняй касы. Астатнія драмалі ў чаканні абвесткі на свой рэйс.**

**Альшанскі вельмі старанна, як хірург перад аперацыяй, мыў рукі пад халоднай вадой. У прыбіральні ён быў адзін. Прынамсі думаў, што гэта так. Пісталет тыцнуўся яму паміж лапатак. Сівавалосы нават не падняў галавы, адно скасавурыўся на запырсканае люстэрка. За спінай стаяў дужы мужчына. З-пад брылька чорнай бейсболкі радасна блішчалі маленькія вочкі.**

**— Ну? І што ты будзеш рабіць зараз, Альшанскі? Тут табе не там. Толькі тарганіся, — забінтаваная рука бессаромна залезла ў кішэню чужога плашча, праверыла, ці няма зброі пад пахай, — цяпер ты чысты. Гэта, павер, грэе. А ў мяне аж два.**

**— Не чакаў цябе, Шарпей, сустрэць тут, — шчыра прызнаўся сівавалосы.**

**— Дзе карціна? І без фокусаў. Ты адзін, і я адзін.**

**— Тут карціна. Пайшлі, пакажу.**

**Сівавалосы ішоў па сходах нетаропка. Шарпей рухаўся за ім, як цень, рукі трымаў у кішэнях расшпіленай курткі. Ён быў гатовы стрэліць у любы момант.**

**— Мы потым сядзем у тваю машыну і паедзем.**

**— Як скажаш, — не азіраючыся прамовіў сівавалосы, — карціна тут.**

**Марат убачыў, як з прыбіральні выйшаў шэф, а за ім Шарпей, але схавацца не паспеў. Альшанскі спыніў яго позіркам і адразу ж зірнуў на Макса.**

**— Тут яна. Толькі не ведаю, у якой ячэйцы ляжыць. Давядзецца табе пачакаць, пакуль адкрыем усе.**

**Шарпей разгубіўся, але толькі на імгненне.**

**— Я пачакаю. Мне губляць няма чаго.**

**— І Макс, і Марат усё разумеюць, страляць не пачнуць.**

**Над самай галавой у дынаміках затрашчала. Загучаў спалоханы жаночы голас:**

**— Паважаныя грамадзяне. Просьба без панікі тэрмінова пакінуць будынак аўтавакзала і пасадачныя платформы. Паўтараю...**

**Пасажыры прыціхлі. Руды шчанюк стаяў на задніх лапах і чакаў узнагароды. Мажная касірка выскачыла ў пачакальню і з крыкам:**

**— Вакзал замініраваны, — на злом галавы кінулася на вуліцу.**

**За ёй ламануліся і іншыя, усчаўся вэрхал. Толькі руды шчанюк, на якога ўсе забыліся, працягваў стаяць на задніх лапках.**

**— Што за цырк? — насцярожыўся Шарпей.**

**Сівавалосы асцярожна сцепануў плячыма, маўляў, а я адкуль ведаю? За шкляной сцяной мільганулі міліцэйскія машыны, скавытнула сірэна. Шарпей напружыўся і прашаптаў:**

**— Выходзім. А вы двое — паперадзе.**

**Альшанскі зрабіў колькі крокаў і спатыкнуўся аб забытую спалоханым пасажырам падраную сумку, пакаціліся яблыкі. Шчанюк кінуўся ў ногі сівавалосаму, той нахіліўся, падняў сабачку, павярнуўся да Шарпея:**

**— Які мілы. Табе сабака не трэба?**

**Шарпей не паспеў адказаць. Шчанюк тарганўся, віскнуў. Сівавалосы стрэліў тройчы. Выродлівы рэвальвер з кароткай руляй ён трымаў у левай руцэ, сабаку на правай. Шарпей зрабіў колькі крокаў і паваліўся, рукі так і засталіся ў кішэнях расшпіленай курткі. На чорным швэдры курэліся тры дзіркі. Макс з Маратам кінуліся да шэфа.**

**— Я сам, — сівавалосы перадаў шчанюка, падцягнуў калашыну і схаваў рэвальвер у маленькую рудую кабуру.**

**У будынак вакзала ўжо забягалі ўзброеныя міліцыянеры. Маёр прыцішыў крок і апусціў пісталет, калі сівавалосы ўскінуў руку.**

**— Усе камеры трэба ўскрыць, — прагучала даволі спакойна.**

**— А гэты?**

**— Бандыт, мянушка Вадалаз, — быццам знаёміў маёра з трупам, прамовіў сівавалосы, схіліўся над целам, забраў свой пісталет, — можаце прыбраць, калі замінае.**

**За паўгадзіны міліцыянеры і служачы аўтавакзала ўскрылі ўсе ячэйкі. Макс з Маратам перагледзелі і перабралі ўсё начынне. Знайшлі партфель васьмікласніка з падручнікамі і дзвюма бутэлькамі віна, трохлітровы слоік самагонкі, старую ватоўку з кірзавымі ботамі, бушлат чыгуначніка, торбу з кітайскімі рыбацкімі сеткамі... Карціны не было.**

**Альшанскі сядзеў на лаве і ўказальным пальцам казытаў за вухам рудога шчанюка...**

**У восем гадзін раніцы вакзал зноў запрацаваў. Да акенца касы падышла немаладая жанчына, з выгляду — настаўніца на пенсіі.**

**— Макараўна, што тут у вас было? Кажуць, бомбу шукалі. Ці знайшлі?**

**— Ой, не знайшлі, Вера Сяргееўна. А чалавека нейкага застрэлілі. Не нашага. Пачакай, зараз вынесу твае шпалеры.**

**Праз якую хвіліну касірка перадала цётцы важкі празрысты скрутак з трубкамі шпалераў.**

**— Пераклеіцца да святаў вырашыла?**

**— Не, я вясной паклеілася. Не сабе ўзяла.**

**— Я і думаю, не яркія нейкія.**

**Цётка са шпалерамі пайшла ад аўтавакзала на пошту. Там ёй надзейна абклеілі скрутак хрумсткай рудой паперай, перавязалі, заляпілі сургучом. Цётка разборліва перапісала з нататніка на бланк адрас, развіталася і пайшла з пошты. Таемная місія Веры Сяргееўны была выканана.**

***Працяг у наступным нумары.***

Максім КЛІМКОВІЧ, Уладзімір СЦЯПАН

# ЦЕНЬ АНЁЛА*

## *Раман*

### ЧАСТКА ДРУГАЯ

**Шэрыя вочы Альшанскага суха паблісквалі. Ён імкліва крочыў вузкім бальнічным калідорам. Макс і Марат ледзь паспявалі следам. Перад дзвярыма палаты Альшанскі на момант прыпыніўся, перахапіў чорны кейс і адчыніў дзверы. Медсястра спуджана падхапілася, узялася папраўляць прасціну на ложку Ганны. На падаконні зіхцела фольгай распачатая шакаладка.**

**— Доктар дзе? — уважліва паглядзеў на бледны твар Ганны Альшанскі. — Не захапляйцеся салодкім. Лепш яблык. Я не медык, але з уласнага досведу раю.**

**— Я — не, не шмат, я толькі крышачку пакаштавала… — як заспетае знянацку дзіця, пачала апраўдвацца круглатварая жанчына. — Доктар быў. Толькі што.**

**— Я пажартаваў. Сам люблю горкі шакалад, — Альшанскі прачыніў дзверы і падаўся да рэаніматолага.**

**Медсястра хуценька адламала ад пліткі, таропка згарнула шаматкую фольгу і схавала ласунак у кішэню халата.**

**Перад доктарам на стале стаялі стракатая бляшанка распушчальнай кавы, пачак рафінаду, вялікі кубак з кіпенем. Рэаніматолаг засяроджана сачыў за працэсам павольнага знікнення цвёрдага рэчыва ў вадкім. Ён і Альшанскаму прапанаваў кавы. Той на прапанову адмоўна хітнуў.**

**— У мяне праблемы, доктар, іншага кшталту — цэйтнот.**

**— У якім сэнсе?**

**— Мне трэба, каб яна загаварыла.**

**— Я і так раблю ўсё.**

**— Я гэта разумею, — Альшанскі спакойна паклаў на стол кейс, крутануў дыскі з лічбамі, шчоўкнуў замочкамі.**

**Доктар памкнуўся зазірнуць у сярэдзіну, але Альшанскі хутка павярнуў кейс, і позірк рэаніматолага ўпёрся ў банальна-чорны пластык паднятага вечка. Спачатку з сярэдзіны кейса глуха азваўся метал, які дакрануўся да металу, вечка мякка апусцілася. У дагледжаных пальцах Альшанскага ільдзіста бліснула ампула.**

**— Цэйтнот, цэйтнот… дарагі вы мой доктар.**

**— Што гэта? — медык глядзеў на ампулу.**

**Гранулы распусціліся ўсе да апошняй. Кава астывала.**

**— Гэта наш шанец.**

**Доктар асцярожна прыняў ампулу, прачытаў дробненькія сінія літары, спахмурнеў.**

**— Небяспечна, — прамовіў нарэшце. — Можа не вытрымаць. Рызыкоўна.**

---

* Працяг. Пачатак у № 1

**— І жыццё — рызыкоўны занятак. Я не магу чакаць. Гэтае дзеянне змушанае.**

**— А калі яна... Што я потым скажу?**

**— Каму? — цынічна глянуў у спалоханыя вочы рэаніматолага Альшанскі. — Адказнасць на мне. Пайшлі.**

**Праз пару хвілін яны ўжо былі ў палаце. Медсястра толькі зірнула на доктара і адразу ж выйшла. Рэаніматолаг нервова разадраў апакаванне аднаразовага шпрыца, прыладзіў іголку, вагаўся. Альшанскі выхапіў шпрыц з дрыготкіх пальцаў медыка.**

**— Я сам. Гэтая працэдура не патрабуе спецыяльных ведаў.**

**Сівавалосы спрактыкавана зламаў галоўку ампулы. Зірнуў на шыю Ганны, як прыцэліўся. Тонкая іголка схавалася ў празрыстай вадкасці.**

**— Хто не рызыкуе, доктар, той і жыве бедна, — скрывіў тонкія вусны Альшанскі.**

**Ён глядзеў на ампулу, якую абярэжна трымаў у пальцах левай рукі. Рэаніматолаг спалохана адвярнуўся. Пачуўся ўскрык Альшанскага. Кароткі, быццам шпрыц уваткнуўся яму ў руку. Ампула бліснула ў паветры, цenькнула на кафлянай падлозе і разляцелася шклянымі пырскамі. Сівавалосы спалохана зыркаў па баках, трымаў перад сабой левую руку, дзьмухаў на пальцы.**

**— Што гэта было?**

**— Дзе? — спытаў доктар.**

**— Мяне як токам працяло, — Альшанскі асцярожна сціснуў-расціснуў пальцы. — Апошняя.**

**Ён глядзеў на твар Ганны, яе павекі ледзь заўважна трымцелі, а на вуснах, як падалося Альшанскаму, прамільгнула з’едлівая ўсмешка.**

**— Не біць жа яе… далонню па твары, — прамовіў сівавалосы сам сабе.**

**Макс з Маратам з непаразуменнем зазіралі ў прачыненыя дзверы палаты. Альшанскі пераступіў вільготную пляму, пад абцасам хрумснула шкло.**

**— Што сталі? Пайшлі.**

**Доктар глядзеў услед тром мужчынам, якія рашуча крочылі доўгім бальнічным калідорам. Медсястра прыціснулася да сцяны, яна баялася вяртацца ў палату.**

*...раствор, што па кроплях уваходзіць у маю вену, празрысты, як мае ўспаміны, як ты. Раней я не ведала, што ў анёлаў і ў вады няма ценяў. Толькі зіхценне… Я не падманваю цябе. Я не хачу жыць. Для мяне ўсё скончылася. Фелікса няма са мной. Я больш не пачую яго голасу? Маю далонь не сціснуць яго пальцы, і я не спазнаю казытлівы пацалунак? Яго вусны ўжо не схопяць смочкі маіх грудзей? Прабач, што гавару з табой пра гэта. Больш не буду. Анёлам лепш не ведаць пра гарачае, пра чалавечае. Нашто ты зноў мяне ўратаваў? Няхай бы ён зрабіў свой укол, упырснуў атруту. А ты ўзяў і развёў яму пальцы. Мне не баліць. Быццам, мяне і няма тут. Ты ж ведаеш, колькі мне засталося… Я чую іх крокі. Яны вяртаюцца, ці сыходзяць?.. Добра, добра. Я буду маўчаць і думаць пра сваё…*

Менская турма была перапоўнена. Чэкісты не паспявалі знішчаць ворагаў рэвалюцыі.

У камеры пад кутняй вежай, разлічанай на шэсць чалавек, знаходзілася васемнаццаць мужчын: тры дэзерціры, чатыры кантрабандысты, два рабочыя гарадской электрастанцыі, два польскія афіцэры, наборшчык друкарні, аднаногі чабатар, падлетак з забінтаванай галавой, мяснік з Суражскага рынку, чыгуначны кандуктар, рэтушор-габрэй — спец па падробцы дакументаў і Станіслаў Краеўскі, якога знялі з цягніка на Віленскім вакзале. Яго падазравалі ў шпіёнскай дзейнасці на карысць маршалка Пілсудскага.

Усе вязні разумелі, на літасць спадзявацца няма чаго, і доўга яны ў халоднай камеры не затрымаюцца. З турэмнага двара ці не кожную гадзіну даносіліся лаянка, праклёны, перадсмяротныя крыкі і стрэлы.

З маленькага закратаванага акенца лілося каламутнае беларускае святло. Пад самым акном і сядзелі два польскія афіцэры, адзін кантрабандыст і Станіслаў Краеўскі. Не зважаючы на стогны, трызненні, лаянку і малітвы, чацвёра мужчын гулялі ў карты. Перадавалі адзін адному недапалак. Тут кожны гуляў сам за сябе. Краеўскаму карта не ішла, то «перабор», то «недабор». На руках у Станіслава быў віновы туз. На кану супраць кароткага кантрабандысцкага кажушка стаялі яго боты. Усё астатняе Краеўскі ўжо прайграў. Ён быў у споднім кашулі і вайсковым галіфэ з пустымі кішэнямі, гадзіннік, партсігар і ланцужок з залатым медальёнам чэкісты забралі яшчэ на вакзале.

Банкаваў няголены кантрабандыст, ён падняў сваю карту, зверавата ўтаропіўся ў твар Краеўскаму.

— Ну?

— Давай яшчэ. З адной перабору не будзе.

Зашмальцаваная карта легла на каменную падлогу. Станіслаў асцярожна падняў яе — трэфовая дзевятка. Твар застаўся спакойным.

— Яшчэ? — насцярожана спытаў кантрабандыст.

Краеўскі паварушыў скіўіцамі, удаў, што вагаецца і, не адводзячы позірку ад рук кантрабандыста, прасычэў:

— А цяпер сабе.

Супернік скінуў адну карту — вывернуўся кароль, побач легла другая — шасцёрка. Твар кантрабандыста расплыўся, вочы зрабіліся маленькімі, як чорныя семкі.

— Маё, — сказаў ён, кінуў туза і ўзяў боты Краеўскага.

— Не шанцуе мне ў карты, — скрыгатнуў зубамі Станіслаў і кінуў свае карты на падлогу.

— Не шэнціць пану ў гульні, пашэнціць у каханні, — польскі афіцэр дакрануўся да пляча Краеўскага і падаў яму недапалак.

— Усім нам аднолькава пашэнціць, — сказаў другі афіцэр і паглядзеў на абабітыя жалезам дзверы.

З калідора пачуліся крокі. Цяжка грымнула засаўка. У камеры зрабілася ціха-ціха. Усе ведалі, калі дзверы адчыняюцца, неўзабаве ў двары прагучыць стрэл. У праёме стаяў чэкіст у марскім бушлаце, а за яго спінай два чырвонаармейцы са стрэльбамі.

— Краеўскі Станіслаў, выходзь, — гукнуў чэкіст, углядаючыся ў змрок перапоўненай камеры.

Краеўскі падняўся, паціснуў рукі сваім сукамернікам.

— Нестаптаныя, насі на здароў’е, — пажадаў кантрабандысту.

Той схіліў галаву.

У калідоры чэкіст спыніў босага паўраспранутага вязня:

— А ты сапраўды Краеўскі?

— А то, — адказаў Станіслаў і закашляўся.

Яго доўга вялі па калідорах, лесвіцах. Нічога больш не казалі і не пыталіся. Чэкіст і салдаты спыніліся перад белымі філянговымі дзвярыма на дзве паловы. Чэкіст зашпіліў верхні гузік бушлата, няўпэўнена пагрукаў, адчыніў.

У вялікім ярка асветленым пакоі за дубовым сталом на ножках-балясінах хіліўся над паперамі немалады мужчына ў гімнасцёрцы. Шынель быў накінуты на плечы. Праваруч ад мужчыны на сподку стаяла шклянка з гарбатай.

— Краеўскі Станіслаў, — нягучна прамовіў чэкіст. — Жывы.

— Усё, дзякуй, — адказаў мужчына, нават вачэй ад паперы не падняў, чыркнуў алоўкам па спісе. — Расстраляць, — прамовіў будзённа, як пра нешта даўно вырашанае і падаў паперу чэкісту.

Той прыняў спіс і ціха выйшаў з кабінета.

— Ну што, Стасік, не пазнаеш мяне? — мужчына перасмыкнуў вузкімі плячыма, вылузнуўся з шыняля, падняўся, на стомленым твары блукала разгубленая ўсмешка.

— Дзядзька Фелікс, — углядаючыся ў схуднелы твар суразмоўцы, прашаптаў Станіслаў.

— А то. Каб не глянуў я спіс, не сустрэліся б мы з табой. Бацька жывы?

— Не.

— Спачуваю. А што ты распрануты? Як басяк які.

— Там, у камеры ўсё засталося. Я ж думаў…

Дзяржынскі хутка выйшаў у перадпакой, прычыніў за сабой дзверы, а праз хвіліну вярнуўся.

— Падрос. Кавалерам стаў. У Польшчу да дзеўкі ехаў? Ну ладна, ладна, не чырваней. Хто з нас не без граху. Вось я і падумаў — які з цябе шпег? Мы ж з тваім бацькам Янам на катарзе ўсё за палітыку спрачаліся, ледзь не біліся. Во, упарты. Як ўваб’ецца ў сваё, не адвернеш. І ты такі? А я ж цябе на руках насіў, засранца. Эх, ляцяць гады. Сядай, сядай да стала, расказвай. Табе, што, тут дзевак мала было? Прыгожая, хоць, паненка?..

Абабітыя жалезам дзверы камеры пад кутняй вежай грымнулі. Тры карцёжнікі пад закратаваным акенцам скамянелі з зашмальцаванымі картамі ў пальцах. Лаянку, малітвы з трызненнямі як адцяла. Чэкіст у марскім бушлаце дыхаў запыхана. Семнаццаць пар вачэй глядзелі на яго.

— Дзе шмуткі таварыша Краеўскага і абуванне? — выдыхнуў ён. — Ну што сядзіце? Хутка!

Кантрабандыст мітусліва сцягнуў з ног боты Краеўскага. Польскі афіцэр аддаў паліто. Чэкіст узяў яго, грэбліва ўзважыў, кінуў кантрабандысту.

— Кажушок здымай. А ты, контра, пінжак.

*...нашто медсестра забрала шакалад з падаконня? Яго няма, а водар застаўся. Ты б пачаставаў мяня, адламаў бы ад пліткі. Адзін квадрацік. Усяго адзін. Ніхто б і не заўважыў. Я люблю малочны шакалад, хоць усе сцвярджаюць, што лепш есці чорны і горкі. А я люблю белы. І нічога з сабой не магу зрабіць. Ты яшчэ тут? Фелікс ведаў маю слабасць. Я закрывала вочы, сцішвалася. Чуліся шамаценне фольгі, хрубаст пліткі. Я ўдавала, што сплю, моцна сціскала вусны. Фелікс дакранаўся прамакутнічкам да сціснутых вуснаў. Вёў, як памадай. Разводзіў вусны, шакалад паволі раставаў. А пальцы Фелікса пахлі шакаладам і тытунём. Не, няправільна, наадварот — тутунём і шакаладам. Незабыўны смак. Я магла незаўважна з’есці цэлую плітку. Пасля блізкасці заўсёды хочацца есці. Зноў я пра сваё, жаноцкае, прабач. Табе цяжка мяне зразумець. Я нават не ведаю, чым ласуюцца анёлы...*

Усходні вецер мёў Губернатарскую, шпурляў у твары тром чэкістам пасохлае кляновае лісце, зрываў з прахожых капелюшы і хусткі. Станіслаў Краеўскі і думаць ніколі не думаў, што яго лёс складзецца менавіта так. Але даўняе знаёмства з Феліксам Эдмундавічам зрабіла сваю справу. У кароткім кажушку расстралянага кантрабандыста, з навюткім наганам і мандатам супрацоўніка ЧК у кішэні ён ішоў на чарговае заданне. На другі тыдзень службы ў ЧК Краеўскаму ўжо давяралі. Чэкісты кіраваліся да касцёла Дзевы Марыі. Паступіла дакладная інфармацыя, што друкаваныя ўлёткі з заклікамі не падпарадкоўвацца новай уладзе раскідае па начах са званіцы мінскай катэдры Эдвард Тарлецкі, які і служыць у гэтым касцёле. Чэкістаў, вядома, цікавіла — хто за ўсім гэтым стаіць? Якая арганізацыя? З якога цэнтра ёй кіруюць?

Краеўскі папрасіў пачакаць яго на вуліцы, а сам забег у гатэль «Еўропа», адкуль вярнуўся з пачкам папіросаў.

— Частуйцеся, таварышы, — прапанаваў Станіслаў.

Задымілі ад адной запалкі.

— Без маёй каманды нічога не рабіць, — яшчэ раз папярэдзіў Краеўскі. — Як зойдзем у касцёл, фуражку зняць. А то адразу відно стане, адкуль вы і хто такія.

— Здымем, — паабяцаў каржакаваты чэкіст у марскім бушлаце і дадаў: — Як па мне, закаціў бы я туды кулямёт і ўсю контру пад адну грабёнку паклаў адным махам.

— Міхайлаў, ты ж не на фронце, тут трэба акуратна, разборліва.

— Я кулямётчык, таварыш Краеўскі. Што з імі разбірацца, усе адным мірам мазаныя. Усе савецкую ўладу ненавідзяць. Сабатажнікі.

Другі чэкіст дапаліў папіросу, запляваў і кінуў у гурбу лісця.

— Есці дужа хочацца, — сказаў ён. — Мо пайшлі ўжо, таварышы?

У касцёле было людна. Нават у праходах стаялі. Чэкісты знялі фуражкі, але прайсці да алтара не было як. Краеўскі крануў за плячо мужчыну з сівой патыліцай. Той азірнуўся, бліснуў на Станіслава шкельцамі акуляраў.

— А ці не падкажаце, паважаны, каторы тут Эдвард Тарлецкі?

— Ды вунь ён.

— Дзе? — нецярпліва спытаў кулямётчык Міхайлаў.

Мужчына кінуў позірк на святара і яго памагатых:

— Праваруч ад ксяндза, каторы меншы.

— Той шчанюк са званочкам? — Міхайлаў таргануў мужчыну за рукаў.

— Цішэй, панове. Святыя дары выносяць, — пачулася збоку.

Пяшчотна заспяваў срэбны званочак у руках міністранта Эдварда Тарлецкага, уздыхнуў арган. Прысутныя на ранішняй імшы, як адзін, укленчылі. Стаяць засталіся толькі Міхайлаў з таварышам. Краеўскі махнуў ім рукой, каб хутчэй апускаліся на калені.

— Яшчэ чаго, — нечакана гучна абурыўся Міхайлаў.

Маладзенькі падлетак-міністрант у белых шатах, так падобны да анёла, глядзеў на змрочных чэкістаў у цэнтральным праходзе, званочак бязгучна ўздрыгваў у яго руцэ. Хлопчык-анёл усё зразумеў, твар спалатнеў, вочы зрабіліся вялікімі-вялікімі. Ён нешта шапнуў ксяндзу і хуценька рушыў у бакавы нэф. Міхайлаў порстка выхапіў з-за пазухі наган, кінуўся напярэймы:

— Стаяць, контра! — крыкнуў ён і ламануўся праз людзей да алтара.

Краеўскі падхапіўся з каленяў.

Белыя шаты, як крылы, мільгалі над спінамі ўкленчаных вернікаў.

— Эдвард! Спыніся! Не ўцякай! — прасіў Станіслаў.

Трынаццацігадовы падлетак ужо бег-ляцеў па сходах званіцы. Краеўскі адставаў ад яго на які дзясятак прыступак, але, як ні высільваўся, дагнаць не мог:

— Толькі пагаварыць! Не бойся!

Тарлецкі ўзбег на званіцу. Вышэй было толькі неба.

Хлопчык зрабіў крок, нават не азірнуўся…

Краеўскі абышоў цёмны звон, у вушах свістаў халодны вецер. Ён паглядзеў долу. На бруку ляжаў хлопчык у белым, амаль дзіця. Вакол кружляла чырвонае, барвовае і залатое лісце. Мо, таму і не ўбачыў крыві.

Міхайлаў размахваў наганам, адганяў ад цела спалоханых вернікаў.

Замест трынаццацігадовага міністранта чэкісты ўзялі немаладога ксяндза. Не вяртацца ж з пустымі рукамі! Дапыталі пробашча, але ён нічога пра варожую дзейнасць свайго служкі не ведаў, ці ўдаваў, што не ведае.

*...я ўмею падабацца людзям. Для журналіста гэта вельмі важна. Калі чалавек табе непрыемны, то і гаварыць з ім не хочацца. З Верай Сяргееўнай Перагуд мы выйшлі на ганак музея. Было ўжо цёмна. Я паскардзілася жанчыне, што ў гатэлі няма месцаў, а я яшчэ не ўсё агледзела ў Мсціславе. Я сказала гэта без таемных намераў. А Вера Сяргееўна паглядзела на мяне і запрасіла да сябе. І машыну сваю я паставіла ў яе двары. Мы сядзелі ў яе маленькім дамку за круглым сталом, і яна мяне частавала, як дарагога госця. Быццам мы з ёй былі знаёмыя ўсё жыццё. Я зноў упэўнілася, што ніякія рэстарацыі, ніякія заморскія кухары не ідуць ані ў якае параўнанне са звычайнай местачковай жанчынкай. Мы пілі духмянае самаробнае віно рубінавага колеру. Ад яго сыходзіў такі пах, быццам на стале стаяла міса са свежымі малінамі. У пакоі плавіўся водар жніўеньскага дня, а па шыбах сплываў восеньскі дождж. Адкрываліся слоікі і слоічкі. Агуркі і памідоры, храбусткая капуста з журавінамі, мачоныя брусніцы.*

*Бульбяныя аладкі адразу з патэльні перакідаліся на талерку і мачаліся ў густы грыбны соус. Вяндліна, «пальцам пханая» кілбаса. І адкуль што бралася? Пры гэтым Вера Сяргееўна паспявала расказваць усё, што мяне цікавіла пра Мсціслаў. Сваіх дзяцей у яе не было, а муж заўчасна памёр. Я так і не зразумела, для каго жанчына ўсё гэта рабіла, назапашвала. Першы раз у жыцці і, магчыма, апошні я спала, як каралеўна — на сапраўднай пуховай пярыне, на высокім жалезным ложку з бліскучымі шышкамі. Падушкі палохалі памерамі — як снежныя сумёты. Мне здавалася, я ляжу на аблоках, што ціха-ціха плывуць па-над самай зямлёй. Я легла і правалілася. І не было ніякіх сноў, ніякіх жаданняў…*

Краеўскі ляжаў на жалезным ложку — нераспрануты, тварам да сцяны. У зубах сціскаў рог падушкі. Калі ў яго маленькі пакой увайшоў Дзяржынскі, Станіслаў нават не варухнуўся.

Старшыня ВЧК узяў табурэт, паставіў побач з ложкам, сеў і запаліў. Ён не зацягваўся глыбока, каб не зайсціся кашлем, набіраў дым у рот і акуратна выпускаў праз нос.

— Ты думаеш, мне служку касцельнага не шкада?

Краеўскі не адказаў, а толькі мацней прыкусіў рог падушкі.

— Шкада… Але і праз гэта прайсці трэба. Дзеля вышэйшых мэтаў. Магчыма, ён і не вінаваты быў. Толькі хваробу прасцей апярэдзіць, чым потым лячыць. Спачатку ўлёткі раскідваў, насельніцтва да сабатажу падбухторваў, а потым бомбы пачаў бы кідаць. Я па сабе ведаю. А гэтыя, каторыя з каталікоў, яны зацятыя. Іх не перавыхаваць, не пераканаць. Ты паляжы, адпачні, падумай. Табе яшчэ і не з такім давядзецца сутыкнуцца. Думаеш, яны б цябе пашкадавалі? Скуру б з жывога злупілі. Запомні, Станіслаў, рэвалюцыя не ведае літасці. І ў гэтым ёсць найвышэйшая справядлівасць. Бронецягнік адыходзіць у дзевяць раніцы. Заўтра едзем у Маскву. Не ведае рэвалюцыя літасці. Ні да каго.

Дзяржынскі падняўся. Краеўскі паварушыўся.

— Ляжы, адпачывай. А я пайду. Поўны стол папер.

— Дабранач, Фелікс Эдмундавіч, — ціха азваўся Краеўскі.

— І табе, Стась.

*…мы з Феліксам так захапіліся высвятленнем абставін забойства яго дзеда, што забыліся на існаванне Алекса Фасманскага. А ён не нагадваў пра сябе ані тэлефоннымі званкамі, ані начнымі візітамі. Нават у горадзе мы ні разу з ім не сутыкнуліся. І Фелікс пра яго не распытваў. Мы гарталі крохкія старонкі палявых нататнікаў франтавога фотакара, праглядалі негатывы, маленькія кантрольныя фоткі, зжаўцелыя газеты тых часоў, перабіралі капэрты. Чамадан з жалезнымі вугалкамі знайшоўся ў сутарэннях… І кахаліся, кахаліся, кахаліся… А Алекс Фасманскі ведаў пра нас усё. Яму тэрмінова трэба былі вялікія грошы для таго, каб набыць завод. І звярынае чуццё бізнесоўца яго не падманвала. Ён раней за нас адчуў, які можа стаць вынік нашай валтузні з архівам фотакара-нябожчыка. Магчыма, ён планаваў нас забіць, ці абрабаваць. Не ведаю. Але Алекс сачыў за намі, ведаў кожны наш крок, гэта дакладна. Бо, калі ў мяне з Феліксам скончыліся грошы, і нашы мабільнікі змоўклі, я згадала пра сваю картку. Пра тую, з якой ездзіла ў Германію. На ёй яшчэ мусіла заставацца нейкая драбяза. Ці то пяцьдзясят, ці то шэсцьдзесят еўра. На тралейбусе, бо бензіну не было, мы прыехалі ў цэнтр. Я падышла да банкамата. На рахунку аказалася больш за дзве тысячы. Памятаю вочы Фелікса, вялікія, як сподкі. Не прыгадаю, што я яму казала, і як тлумачыла з'яўленне такой сумы. Ён паверыў. Сябе ж я супакоіла — Фасманскі зрабіў мне шчодры развітальны падарунак за ўсё добрае, што было паміж намі. Як жа я памылялася! Алекс ніколі не верыў у цуды. А каханне засціла мне розум… Так цябе не было? Куды ты адыходзіў? Што гэта? Я адчуваю смак шакаладу. Ты ўкраў яго ў жанчыны? Ніколі б не падумала, што анёлы могуць быць злодзеямі. Вельмі смачна… А можа мне толькі падаецца, што на маіх вуснах зноў растаюць крошачкі шакаладу? Як мала мне трэба цяпер. Радуюся такой дробязі. Дзякуй табе, дарагі мой апякун…*

У зале былога Маскоўскага дваранскага сходу сабраліся чэкісты. Праз усю сцэну цягнуўся стол, засланы чырвонай тканінай. На ім паблісквалі два графіны з пітной вадой і чатыры шклянкі. У зале стаяў шчыльны мужчынскі пах: таннага тытуню, вільготных скуранак, перагару, дзёгцю і мінеральнага алею, якім змазваюць зброю. Выступалі губернскія старшыні ГПУ. Гучалі лічбы — колькі за справаздачны перыяд выкрыта ворагаў рэвалюцыі, колькі асуджана, расстраляна, выслана. Старшыня АГПУ, у фрэнчы, зашпіленым на ўсе гузікі, слухаў, камячыў тонкімі пальцамі рэдкую бародку. Пасля кожнай прамоўленай лічбы звяраў яе са сваімі паперамі. Па яго твары было не зразумець, задаволены Фелікс Эдмундавіч, ці не.

Краеўскі сядзеў у восьмым радзе. Двойчы ён сутыкнуўся позіркам з Дзяржынскім. І, як падалося Станіславу, старшыня АГПУ яму прыязна ўсміхнуўся аднымі вачыма. Праваруч ад Краеўскага прастуджана дыхаў упаўнаважаны супрацоўнік асобага аддзела ВЧК Міхайлаў. На яго гімнасцёрцы ірдзеў навюткі ордэн. Краеўскі ўжо даўно кінуў слухаць прамоўцаў, думкамі быў далёка. Раптам ён ускінуў галаў і стаў азірацца. Ён нават не адразу скеміў, што з ім адбываецца, што вярнула яго душу ў гэтую задушлівую залу. Ён яшчэ раз уцягнуў носам паветра. Праз звыклыя мужчынскія пахі тонкім нябачным струменьчыкам прабіваўся казытлівы цытрынавы водар. Так да рэвалюцыі пахлі варшаўскія паненкі, такая ж парфума была і ў Станіслававай маці.

Краеўскі крыху прыўзняўся, агледзеўся. Але за шырокімі мужчынскімі плячыма, за моцнымі каркамі не адразу ўбачыў бялюткі каўнерык, дзявочую шыю і каротка падрэзаныя льняныя валасы. Казытлівы водар сыходзіў ад гэтай дзяўчыны. Станіслаў больш на сцэну не глядзеў, не адводзіў позірку ад дзявочых плячэй. А з трыбуны сыпаліся ў залу лічбы, за якімі стаялі выкрытыя і знішчаныя ворагі рэвалюцыі.

Дзяўчына нарэшце азірнулася, усміхнулася, на шчоках з'явіліся ямачкі. Было ў яе вачах, твары, усмешцы нешта не тутэйшае, што абсалютна не стасавалася з асяроддзем.

— Хто гэта? — спытаў ардэнаносца Краеўскі.

— Старшыня калужскага ГПУ, — адказаў Міхайлаў, — з нашых, з матросаў.

— Я пра дзяўчыну.

— А… тая? Мятліцкая. Ты на яе губу не раскатвай. Сакрэтны аддзел. Тэлеграфістка Фелікса Эдмундавіча…

У перапынку Краеўскі і Ванда Мятліцкая стаялі за калонай. Слоў амаль не гучала, размаўлялі іх вочы.

Калі дэлегаты чэкісцкага сходу пацягнуліся ў залу, каб праслухаць заключнае выступленне Дзяржынскага, Станіслаў Краеўскі і Ванда Мятліцкая ўжо ішлі па вуліцы рука ў руцэ. Пранізліва-святочна рыпеў сіні снег. Залатымі мятлікамі кружлялі вакол ліхтароў сняжынкі. На шчоках Ванды з'яўляліся, знікалі ямачкі. І Краеўскі разумеў, што гэты дзень самы шчаслівы ў яго жыцці. І галоўнае, каб ён ніколі не скончыўся. Ні Ванда, ні Станіслаў нават не заўважалі, што калі яны і прамаўляюць, то словы складаюцца ў вершы.

— Я не ведаў цябе, ты не ведала мяне. Як жа мы жылі?

— Я ведала, што ты ёсць. Але імя тваё было мне невядома.

Часам Станіслаў нечакана для сябе самога пачынаў гаварыць па-польску. Ванда адказвала, старанна падбіраючы словы. І яе акцэнт гучаў неверагодна кранальна. Яны спыніліся перад вітрынай рэстарацыі. Там за шклом зелянела елка.

Што елі і што пілі ў той рэстарацыі Ванда са Станіславам, як ні стараліся потым, прыгадаць не маглі. Памяталі толькі дотыкі рук над белым абрусам і смак першых пацалункаў…

Нараніцу яны прачнуліся ў адным ложку ў маленькім пакойчыку. Акно было сіняесіняе. Магчыма, яны б спалі далей, і не пайшлі б на службу. Але іх пабудзіла далікатнае пастукванне ў дзверы. Ян Карлавіч Мятліцкі — стрыечны дзядзька Ванды, запрасіў маладых людзей да стала.

*...ёсць учынкі, сэнс якіх невытлумачальны, іх робіш падсвядома. Мы з Феліксам спяшаліся ехаць у Мсціслаў. Я паспела закінуць у сумку касметыку, пашпарт, журналісцкае пасведчанне... Я разгублена спынілася пасярод пакоя, агледзелася, і тут нашы позіркі сустрэліся. Не, я не думала, што больш ніколі сюды не вярнуся. У галаве тады радасна шумела ад прадчування ўдачы. Я падышла да яго і зняла са сцяны. І з гэтым партрэтам у руках, як вернік з абразом, пакінула кватэру. Калі мае продкі згубілі ўсё, калі ўжо не было Станіслава Краеўскага, Ванда ўпарта трымала гэтую пацямнелую дошку з выявай віславусага шляхціча пры сабе. Магчыма, яна верыла ў нейкую чароўную сілу, што сыходзіла ад яе. Уяўляеш? Я ўзяла партрэт, а на зубную шчотку забылася...*

**Дырэктар мсціслаўскага музея мармытаў пад нос песеньку, пачутую за сняданкам з «радыёкропкі». Ён ужо паспеў пагаліцца і абліць гладкія шчокі адэкалонам. Старанна павязаў гранатавы гальштук, падцягнуў вузел пад самую шыю і агледзеў свой пагрудны партрэт у люстэрку. Выглядам застаўся задаволены. А тое, што колерам гальштук не стасаваўся з кашуляй, дырэктара абсалютна не напружвала. Усе тут так ходзяць.**

**Адмысловы званок над дзвярыма заспяваў першыя такты вальса Мендэльсона.**

**— Хвілінку, — гукнуў гаспадар двухпакаёвай кватэры і порстка ўзяўся зашпільваць прарэху на штанах.**

**Ён зірнуў у вочка. На лесвічнай пляцоўцы стаяў сівавалосы мужчына ў светлым плашчы. Дырэктар музея яго не ведаў, а таму накінуў пінжак. Незнаёмец выдаваў на сталічнага начальніка.**

**— Хто там? — спытаў дырэктар музея, скінуў ланцужок і адамкнуў дзверы.**

**У перадпакой, не прывітаўшыся, увайшоў сівавалосы, а следам і другі — маладзейшы, таксама незнаёмы.**

**— Вы дырэктар музея, — абыякава сцвердзіў Альшанскі і зірнуў на стаптаныя хатнія пантофлі.**

**— А вы хто будзеце? — пацікавіўся гаспадар.**

**— У мяне да вас ёсць пытанне. Маё прозвішча Альшанскі. Карціну гэту ведаеце?**

**Перад тварам дырэктара з’явіўся фотаздымак гвардыі сяржанта Сокала.**

**— А я пры чым? — сказаў дырэктар музея, спрабуючы выйграць час, каб зразумець, што за людзі перад ім, і што ім ад яго трэба.**

**Альшанскі зрабіў яшчэ адзін крок, і адразу стала зразумела, што ён на паўгалавы вышэйшы за дырэктара музея.**

**— Што маўчым?**

**— А што такога? Ну, партрэт абадраны. Вам што?**

**— Дзе ён?**

**Твар дырэктара музея спалатнеў, на лобе высыпалі кропелькі поту. Ён узяўся расцягваць тугі вузел гранатавага гальштука.**

**— А яго нават на ўліку ў фондах музейных няма, — у роце зрабілася суха, — такіх партрэтаў у сховішчы процьма: і Ленін Уладзімір Ільіч, і Карл Маркс з Фрыдрыхам. І Брэжнева колькі штук. І краявіды стаяць. Зімовыя, летнія. Я нават не ведаю, адкуль той партрэт узяўся.**

**— Хопіць, — сказаў Альшанскі.**

**Перад вачыма дырэктара мільганула пасведчанне з каляровым фотаздымкам сівавалосага. Дырэктар нават ніводнага слова прачытаць не паспеў. Адно адчуў, што дакумент сур’ёзны.**

**— Вы самі разумееце. Дранае палатно, давялося выкінуць.**

**— Што? — у голасе Альшанскага нават пагрозы не прагучала, адно непадробная цікаўнасць.**

**Менавіта таму дырэктару і стала страшна. Ногі зрабіліся ватнымі.**

**— Каму аддаў карціну?**

**— Ды якая гэта карціна? Ну чаго вы да мяне прычапіліся? Гэта ж партрэт сваяка таго самага Сокала, каторы жанчын гвалціў. Маньяк знакаміты серыйны. Пра віцебскую ж справу чулі?**

**— Дзе партрэт?**

**Марат зазірнуў у пакой і ціха прамовіў:**

**— Нікога, шэф, — прычыніў уваходныя дзверы і выхапіў з кішэні пісталет.**

**— Я лічу да трох, а потым… — Марат усміхаўся, паказваў белыя і роўныя, як не свае, зубы.**

**— Журналісты прыязджалі… выдурылі. Я ж не ведаў.**

**— Калі?**

**— Учора ўдзень. Музей не працаваў, выхадны. Яны дахаты прыйшлі. Нашто ён мне?**

**— За колькі?**

**— Я за гэтыя грошы… я іх на рахунак музейны… пакладу, яшчэ не паспеў.**

**— Казёл! — прамовіў Альшанскі і ўдарыў дырэктара ў жывот.**

**Той скурчыўся, жалосна заенчыў, асунуўся на падлогу. Марат схапіў яго за каўнер і паставіў на ногі. Дырэктар сунуў пальцы ў нагрудную кішэнь пінжака, выцягнуў ружовую паперку — сто еўра:**

**— Вось, вазьміце. Мне яны не трэба.**

**Альшанскі выхапіў з плашча мабільнік, які зырка бліскаў і бязгучна вібрыраваў.**

**— Слухаю… Добрая навіна… Зараз буду… — і імкліва выйшаў з кватэры.**

**Марат указальным пальцам, як гачыкам, зачапіў дырэктара пад сківіцу, зазірнуў у вочы.**

**— І нікому не кажы пра нашу размову, — вышмаргнуў з дырэктарскіх пальцаў сто еўра, — а гэта ўліка. Не кашляй…**

**...праз дзесяць хвілін Альшанскі ўжо стаяў у бальнічнай палаце. Ён высіўся над ложкам Ганны Мятліцкай, углядаўся ў белы, як гіпсавая маска, твар маладой жанчыны. Парафінавыя вусны, у якіх не было ні крывінкі, жылі, яны паволі сціскаліся, разыходзіліся. Альшанскі схіліўся, спрабуючы пачуць і разабраць словы, нецярпліва махнуў рукой, каб усе выйшлі. Калі дзверы зачыніліся, ён моцна сціснуў плячо Ганны.**

**— Ну, ну, дзе карціна?! Слухаю. Застанешся жыць. Ты ж хочаш жыць? Ты ж маладая. У цябе яшчэ ўсё наперадзе. Толькі скажы, дзе карціна. І я з'еду. Назаўсёды. А ў цябе ўсё зноў будзе добра.**

**Бяскроўныя вусны падабраліся і застылі.**

**— Ну, ну… — пальцы Альшанскага сціскалі жаночае плячо. — Маўчыш? Ну, глядзі, пашкадуеш.**

*...мы прыехалі ў Мсціслаў раніцай. Яшчэ не працавалі крамы. Мы папілі ледзяной вады з-пад сіняй калонкі побач з зачыненым кармеліцкім касцёлам. Я ўбачыла немаладога ксяндза, які ішоў да храма. Мне спадабаўся яго твар. Падумалася — «вось ідзе шчаслівы чалавек». Я хацела спытаць у Фелікса, як на яго думку: «Моліцца ксёндз ці чытае вершы?» І тое і другое было верагодна — такі прасветлены твар! Ён сам павітаўся з намі. І я спытала: «Вы толькі што маліліся ці чыталі вершы?» Немалады святар пачырванеў, і мне зрабілася няёмка за пытанне. «Я спяваў… Па радыё песню пачуў раніцай… Вось і ўбілася мелодыя ў галаву. Нават няёмка. Дарослы чалавек, а як хлопчык, песні пяю». Ён пайшоў. Я спахапілася і дагнала яго. Расказала ўсё пра партрэт і нечакана для сябе самой аддала яму дошку з выявай віславусага шляхціча, які ахвяраваў усе свае грошы касцёлу. Ксёндз не здзівіўся майму ўчынку, як чакаў. Цяпер, мне здаецца, што ты быў побач. На развітанне ксёндз прызнаўся, што спяваў песню пра каханне, і блаславіў мяне…*

Адна кропля, другая… а потым вясновы дождж лінуў па-сапраўднаму. А Ганна, як заўсёды здаралася, забыла парасон. Яна стаяла пад старым дрэвам і была згодная мокнуць, каб толькі хутчэй выйшаў на бетонны ганак следчага ізалятара яе Фелікс. І ён з’явіўся. Спачатку выглянуў з прачыненых дзвярэй, схаваўся, а потым выскачыў і пабег да яе. Ганна кінулася насустрач.

Фелікс наскрозь прапах хлёркай, цвіллю, танным тытунём. Нават яго мокрыя валасы і рукі пахлі. Яны стаялі пад дажджом і цалаваліся. Машыны, якія праносіліся побач і раскідалі калюгі, весела сігналілі.

— Жывы, — шаптала Мятліцкая, абмацваючы Феліксаў твар.

— Канечне ж, жывы… Адна ў мяне мара… Не — дзве… не — тры, — паміж пацалункамі спяшаўся гаварыць Фелікс.

— Тады па парадку, — Ганна павісла на яго шыі.

— Гарачая вада з мылам і пераапрануцца ў чыстае.

— Знойдзем. Другое?

— Паесці, выпіць кавы, выпаліць цыгарэту.

— Нескладаныя ў цябе жаданні.

— А потым зацягнуць цябе ў ложак.

— Тут нашыя жаданні супадаюць.

І, не дамаўляючыся, яны пад дажджом перабеглі шырокую вуліцу і пачалі лавіць таксі. А з нізкага неба ліло, як з вядра. Машыны праляталі. Нарэшце спыніўся разбіты, іржавы мікрааўтобус з напаўсцёртым надпісам «ДЗЕЦЯМ ЧАРНОБЫЛЯ».

— Лімузін да вашых паслуг! — прагучала паверх апушчанага шкла.

Дзверца ледзь адчынілася і ніяк не хацела зачыняцца. Маладзён-вадзіцель перагнуўся праз спінку сядзення, ціхенька пацягнуў ручку да сябе.

— Дзвярыма лепш не ляскаць.

Калі мікрааўтобус упаўзаў у двор, дождж сціх, свяціла сонца. Ганна разлічылася.

— І ў мяне маладая жонка, — сказаў на развітанне вадзіцель.

З Ганнінага пад’езда выйшаў дужы мужчына ў сінім камбінезоне са скруткам дроту на плячы і з пластыкавым чамаданчыкам у руках. Каб Мятліцкая прыпынілася і хоць на імгненне ўгледзелася ў яго твар, то, напэўна б прыгадала, дзе бачыла гэтага «электрыка». Менавіта ён падключаў пры ёй новы тэлефонны апарат у кабінеце Фасманскага. Але Ганна думала пра тое, што згатаваць, покуль Фелікс будзе мыцца, таму нават не азірнулася.

«Электрык» забраўся ў машыну, за рулём якой сядзеў Алег, весела бліснуў маленькімі вочкамі з-пад доўгага брылька чорнай бейсболкі.

— Знайшоў, калі выбірацца. Не мог схавацца паверхам вышэй? — абурыўся вадзіцель Алекса. — Я ж табе яшчэ ад турмы тэлефанаваў, што яны сюды кіруюцца.

— Ат! Яны спяцоўку бачылі, не мяне. Ды там адзін раз’ём гнілы. Давялося новы паставіць. Трымай, — колца з двума бліскучымі ключамі ад Ганчынай кватэры легла ў паглыбленне побач з пачкам цыгарэт.

— Не мог раней абсталяванне праверыць? Канспіратар. А яшчэ герой афганскі.

— Маўчы, ад такога ж і чую. Ды не мае абсталяванне, з яе ноўтбукам калупаўся. Ну, бабы дурныя, я табе скажу. Ведаеш, які пароль паставіла?

— Мне, Шарпей, гэта нецікава, — сказаў Алег, запусціў рухавік.

*...мы з Феліксам сядзелі ў машыне. Я каторы раз глядзела на чорна-белы фотаздымак, які зрабіў яго дзед-фотакар. І тут адбылося тое, што можна назваць цудам. Я згадала, дзе і калі бачыла скончаны партрэт гвардыі сяржанта Сокала. Гэта было зусім побач. Можа якіх метраў семсот ад касцёла. Я павярнулася да Фелікса і сказала: «А я гэты партрэт ужо бачыла. Ён вісіць тут, у краязнаўчым музеі. Прынамсі, летась вісеў. У зале, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне. Ты разумееш, Фелікс? Нам не трэба ісці ў міліцыю, у пашпартны стол, дапытвацца». І пра Веру Сяргееўну я расказала Феліксу… Есці мы не хацелі, апетыт прапаў. Мы дачакаліся, калі адкрыецца музей. Мы*

*хутка ішлі па залах. На тым месцы, дзе год таму я бачыла партрэт гвардыі сяржанта Сокала, вісеў стары паточаны моллю шынель чырвонаармейца. А партрэт знік. «Нас апярэдзілі», — сумна, як пра вырашанае, сказаў Фелікс. На маё пытанне «хто?» Фелікс абхапіў галаву рукамі і паціснуў плячыма. У той момант зямля сышла ў нас з-пад ног. Жыццё спынілася, свет зрабіўся шэрым і нецікавым. У нас за спінамі прайшоў электрык з раскладнымі драбінамі, за ім спяшаўся дырэктар. Я нечакана для сябе схапіла яго за руку і паглядзела ў вочы. Мяркую, ён спужаўся, бедны чалавек. «А Вера Сяргееўна яшчэ працуе?» — спыталася я і сціснула яго руку. «Не», — адказаў ён...*

З-пад курткі ў Фелікса вызіраў каўнер белай кашулі, на плячы пагойдваўся партфель. Ганна трымала каханка за руку. Яны прыпыніліся каля фантана з хлопчыкам і лебедзем, пацалаваліся. Прайшлі пад зялёным танкам, што высіўся над плошчай на змрочным пастаменце каля Дома афіцэраў.

— А мяне сюды дзед вадзіў у басейн, — сказаў Фелікс, калі яны збягалі сходамі да Свіслачы.

— А я ў Парк чалюскінцаў — у адкрыты хадзіла. Сама, дарэчы, мяне ніхто не вадзіў. Там лепш. Плаваеш, неба над галавою. А ўзімку такі туман стаіць, што не бачыш, хто побач плыве. І ледзяшы на леерах вісяць.

На грэблі праз Свіслач Мятліцкая спынілася:

— Не пайду я з табой у амбасаду. Цябе запрашалі, ты і ідзі.

Фелікс перасмыкнуў плячыма.

— Не нафарбавалася я, — патлумачыла Ганна. — Лепш салодкай ваты куплю, сяду з ёй на лаву і пакрысе буду ласавацца.

— Правільна, — сказаў Фелікс. — І вусны твае будуць пахнуць паленым цукрам. Салодкія-салодкія.

— Я буду чакаць у парку, знойдземся.

Пальцы Фелікса неахвотна адпусцілі далонь Ганны…

...Фелікс назваў прозвішча, ахоўнік нямецкай амбасады правёў яго да дзвярэй. Сустрэла госця фарбаваная на бландзінку фрау ў афіцыйным строі. Яны паразумеліся без перакладчыка. Аташэ па культуры яшчэ раз выказала спачуванні з нагоды смерці Якава Міхайлавіча Рэя. Фелікс падзякаваў за жалобны букет, прысланы на пахаванне дзеда з нямецкай амбасады.

Немка прапанавала прысесці і паведаміла яшчэ адну сумную навіну. Аўтамабіль, які перавозіў выставу Якава Рэя, а гэта сорак пяць вялікіх фотаздымкаў пад шклом у рамах, разбіўся на горнай дарозе. Мікрааўтобус абрынуўся з вышыні ў цясніну. Вадзіцель і супрацоўнік музея загінулі, фотаздымкі згарэлі.

Навіна для Фелікса аказалася нечаканай.

— Вядома, шкада… — прамовіў ён.

— Я разумею, гэта не суцяшэнне, але выстава застрахаваная, — аташэ па культуры паспрабавала ўсміхнуцца, — добра, што гэта былі не карціны, якія нельга аднавіць, а фотаздымкі. У вас, спадзяюся, захаваліся негатывы? Мы можам паўтарыць выставу, калі гэта вас цікавіць.

— Павінны быць, — разгублена прамовіў Фелікс.

— А страхоўку вы атрымаеце абавязкова. Як толькі следства высветліць прычыны трагічнай аварыі. Я адразу звяжуся з вамі. Прабачце, — фрау зірнула на мужчынскі гадзіннік. — Спадзяюся на далейшае супрацоўніцтва.

Фелікс развітаўся і азмрочаны выйшаў на ганак…

...ён знайшоў Ганну непадалёк ад аглядальнага кола. Мятліцкая з дзіцячым захапленнем глядзела на рознакаляровыя кабінкі, якія паволі сунуліся ў неба.

— Дзіўна, на самалёце лётаць я і цяпер не баюся. А аглядальнае кола мяне палохае. Хаця, з табой я б згадзілася яшчэ не раз падняцца ў неба.

— Наелася цукровай ваты?

— Зайздросціш?

— Машына, якая перавозіла дзедаву выставу, разбілася на горнай дарозе. Людзі загінулі. Фотаздымкі згарэлі.

— Ой, прабач.

— Усё гэта не выпадкова. Але чаму і нашто? Не магу зразумець. І негатываў — тых самых, я не знайшоў. Не падабаецца мне ўсё гэта…

— Ты мяркуеш…

— Думаю.

— Ну якая каштоўнасць — старыя фотаздымкі? Каб за іх забіваць.

— Думаю.

— І што, нічога не захавалася?

Фелікс узважыў на далоні мабільнік, знайшоў патрэбны нумар:

— Сяргей Іванавіч, — прывітаўся ў слухаўку, — гэта Фелікс… Так, той самы… А скажыце, калі ласка, вы яшчэ не сцёрлі мой заказ?.. Калі ласка, Сяргей Іванавіч, паглядзіце… Пазней?.. Дамовіліся.

— Ну, бачыш, магчыма, не ўсё і так кепска. Я табе папкорн купіла, карамельны, — Ганна падала стракатую пластыкоўку. — Дзве з паловай тысячы каштуе. Пяцьсот за дастаўку. І ўсяго з цябе — тры.

— Я цябе пакатаю на поні.

— Давай лепш… — Ганна падняла галаву. — Пададзімся ў неба.

Мужчына ў шэрым плашчы дачакаўся, калі Фелікс з Ганнай сядуць у зашклёную жоўта-чырвоную кабінку, падвёў саламіну мікрафона да вуснаў:

— Марат, скажы шэфу, што ён у нямецкую амбасаду хадзіў… А цяпер яны ў парку. Папкорн ядуць, на «чортавым коле» час бавяць… Зразумела, буду сачыць…

Марат з Альшанскім у гэты час знаходзіліся ў кватэры Ганны. Сівавалосы засяроджана разглядаў партрэт віславусага шляхціча, што вісеў на пачэсным месцы. А Марат завіхаўся над адключаным тэлефонным апаратам.

— Шэф, глядзіце, тут нехта да нас рупіўся.

— Жучок, — Альшанскі зірнуў праз плячо на разабраную тэлефонную радыёслухаўку. — Пакінь і прабі, хто такі цікаўны знайшоўся.

— Зробім, не праблема. А гэта што, паглядзіце, шэф, абраз нейкі дзіўны?

— Яшчэ не ведаю, — сказаў Альшанскі.

Марат прыклаў палец да вуснаў, скруціў слухаўку, тэлефон запрацаваў. Мужчыны ціха выйшлі з кватэры.

*...калі я была маленькай, толькі ў школу пайшла, бабуля навучыла мяне выцінаць з паперы анёлаў. Спачатку яны ў мяне атрымліваліся не вельмі падобнымі. А потым я навучылася. Каб чалавечы абрыс зрабіўся анёлам, яму патрэбны вялікія крылы. Я брала аркуш паперы, складала напалам, малявала, а потым старана выцінала нажніцамі. І ўвесь мой пакой запоўнілі анёлы. Я іх чапляла на нітачкі да жырандолі, паліцаў, яны пагойдваліся, круціліся. Я ляжала на ложку, глядзела на іх і ўсміхалася. А калі святло гасла, то анёлы нагадвалі вялікіх белых мятлікаў. У кожнага з іх было сваё імя. А цябе як завуць?..*

Сяргей Іванавіч Дубавецкі — гаспадар студыі каляровага друку «Спектр» любіў паўтараць дваім сваім супрацоўнікам фразу знакамітага амерыканскага мастака Уэндзі Уорхэла: «Я веру ў пластычную хірургію і ў тое, што «фоташоп» — гэта наша ўсё». Сваю працоўную дзейнасць Сяргей Дубавецкі пачаў са сціплай працы рэтушора гомельскай фотастудыі. Са з'яўленнем новых — камп'ютэрных — тэхналогій справы ў Сяргея Іванавіча пайшлі ўгару. Ён здолеў перабрацца ў сталіцу, выкупіць і абсталяваць тры пакойчыкі ў цокальным паверсе жылога дома, зарэгістраваць фотастудыю. З часам мяняліся назвы яго фірмы, але асноўны занятак заставаўся ранейшым — з непрывабнага рабіць прыгожае.

Сяргей Іванавіч выйшаў з невялічкага пакойчыка, прыгладзіў сіваватыя вусы і зірнуў, як маладзён-лабарант раздрукоўвае вялізныя вясельныя фотаздымкі.

— Чыста Джулія Робертс, — лабарант тыцнуў пальцам проста ў твар нявесце. — Вы, Сяргей Іванавіч, проста чараўнік.

— Зрабіў, як маладыя і прасілі, — прымружыўся ўладальнік студыі.

Нявеста побач з кафедральным Святадухаўскім саборам, з галубамі на руках, насамрэч, выглядала, як кіназорка.

— Ігар, здасі студыю на сігналізацыю. І глядзі мне, акуратна, а тое зноў прыедуць з аўтаматамі. Я чалавек немалады, а мне другі інфаркт без дай патрэбы. Заўтра ў дзевяць друкуем вяселле дачкі падатковага інспектара. І не палі тут.

Дубавецкі крутануў на пальцах ключы ад машыны, ляпнуў па кішэні — спраўдзіў, ці не забыўся мабільнік, і выйшаў з «фірмы». Ціскануў кнопку бірулькі. Амаль новы джып ласкава азваўся гаспадару. Сяргей Іванавіч крыху паганяў рухавік, каб разышоўся і сагрэўся алей у картары. Джып абмінуў мікрааўтобус з таніраваным шклом і выехаў праз арку на вуліцу Інтэрнацыянальную.

Праз пяць хвілін з мікрааўтобуса выбраліся на бетонную брукаванку трое мужчын рэспектабельнага выгляду. Двое спусціліся па прыступках да жалезных дзвярэй з раскладам працы студыі. Адзін застаўся зверху, абапёрся локцем на парэнчы і запаліў.

Марат таргануў дзвярную ручку — замкнёна, ціскануў гузік званка, зачакаўся. Нарэшце жалезныя дзверы адчыніліся. Але лабарант Ігар нават не паспеў убачыць, хто перад ім. Пякучы струмень атруты ўдарыў яму ў твар. Марат схаваў балончык у кішэню шэрага плашча. Альшанскі пераступіў непрытомнага лабаранта.

— Макс, парадак, — гукнуў Марат.

— І наверсе ўсё чыста, — Макс збег сходамі, прычыніў дзверы і павярнуў галоўку замка.

— За справу, — загадаў Альшанскі.

Усе трое паселі за камп’ютэры.

— Апошнія файлы глядзіце, — Сівавалосы спрытна, як сапраўдны хакер, перабіраў кнопкі клавіятуры.

— Ёсць, — сказаў Макс, — супадае, гадзіну таму гэтую папку адкрывалі і перапісвалі яе змест на флэшку.

На маніторы былі пашыхтаваныя сорак пяць чорна-белых фотаздымкаў.

— Ну, шэф? — Макс усмешліва зірнуў на Альшанскага.

— Delete, — каротка адказаў сівавалосы.

— Камп’ютэр яшчэ перапытвае, ці мы ўпэўненыя, што іх трэба знішчыць! — Макс яшчэ раз ударыў па клавішы.

Супрацоўнікі Інтэрпола за паўгадзіны пераканаліся, што ані ў камп’ютэрах, ані на дысках лічбавых копій патрэбных фотаздымкаў больш не існуе…

А яшчэ праз дзесяць хвілін лабарант апрытомнеў у пустой студыі. Ён, як не намагаўся зразумець, што з ім адбылося, так і не здолеў. Ігар нават сумняваўся — а ці быў той званок у дзверы? Ён плёхнуў у твар халоднай вады з крана і доўга сядзеў перад вентылятарам.

*...а, ведаеш, як я здагадалася, што на той карціне намаляваны анёл? Па тваім ценю. Такія цені жылі на столі ў маім пакоі. Калі гарэла настольная лямпа, я любіла разглядаць іх. Яны мне здаваліся жывымі. Я нават аднойчы напалохала маму: «Не гасі святло, — папрасіла я, — цені таксама хочуць жыць»... А Фелікс сказаў, што бачыць на здымку самы звычайны чалавечы цень. Ён не згледзеў, што гэта цень тваіх складзеных крылаў. Бабулі не вучаць хлопчыкаў рабіць папяровыя выцінанкі. Куды ты сыходзіш? Мне без цябе зусім кепска. Разумею, я ў цябе не адна. Вяртайся…*

Шчыльна ссунутыя шторы ледзь прыкметна надзімаліся цёплым вясновым ветрам. Манітор ноўтбука быў адзінай светлай плямай у пакоі. Перад ім знерухомелі Ганна і Фелікс. Яны ўжо другую гадзіну праглядалі фотаздымкі. Павялічвалі да самых дробных дэталяў.

— І я думаю, што рэч менавіта ў ёй, — Ганна пасунула ўказальнік «мышы», шчоўкнула клавішай.

Адзін з сарака пяці здымкаў разгарнуўся на ўвесь экран: побач з камінам у крэсле з высокай разной спінкай сядзеў савецкі сяржант. Спінай да аб'ектыва стаяў салдат з пэндзлем і палітрай на паўсагнутай руцэ. На трохногім мальберце месцілася палатно.

— Павяліч, — папрасіў Фелікс.

Выява пастпова павялічвалася.

— Не твар, карціну, — удакладніў Фелікс.

Увесь экран запоўніла карціна.

— Узяў салдат палатно са сцяны і намаляваў паверх партрэт свайго сяржанта, — углядалася ў няскончаную карціну Ганна.

Фелікс крануў пальцы Ганны, якія ляжалі паверх «мышы». Закаханыя да болю ў вачах углядаліся ў экран.

— Сюды давай, тут… цяпер цісні. Ну яшчэ крыху ўзбуйні.

— Больш не атрымліваецца, выява «сыпацца» пачынае. Пся крэў, — прамовіла Ганна.

— Ты можаш гэта прачытаць?

— Магу.

— Гэтага не можа быць.

Яны, асветленыя камп'ютэрным святлом, аслупянела глядзелі адно на аднаго.

— Дзюрэр, вось што атрымліваецца…

— Няўжо, той самы?

— Я другога не ведаю.

— Ты што?

— А што? Знялі карціну і давай фарбамі паверх маляваць-пісаць. І чхаць ім было — Дзюрэр там, або Леанарда да Вінчы. У цябе ёсць выпіць?

— Правільная думка. Трэба выпіць. Вось за гэта твайго дзеда, Якава Міхайлавіча Рэя, і забілі, і негатывы скралі, і машыну на горнай дарозе падпалілі, каб ніхто… Ты разумееш?

— Выпіць, выпіць, а то ў мяне сэрца выскачыць і мозг выбухне.

— Святло запалі.

Фелікс пстрыкнуў выключальнікам, знайшоў на паліцы распачатую бутэльку гарэлкі. Ганна ўжо гартала альбом. Фелікс наліў трунак у шклянкі. Подпісы, якія Ганна з Феліксам здолелі разгледзець на рэпрадукцыях, і подпіс на маніторы былі вельмі падобныя.

— Альбрэхт Дзюрэр, — чытала Ганна тэкст з альбома, — найвялікшы мастак эпохі Адраджэння. Нарадзіўся ў 1471 годзе ў Нюрнбергу, памёр там жа ў 1528.

— А ў тваёй кніжцы гэтай карціны няма?

— Я думаю, што нашай карціны ні ў якіх кніжках няма. Думаю, што яна знікла. Фелікс, мне страшна.

— А мы пры чым?

— Мы даведаліся пра яе існаванне.

— Ну і што?

— Гэтая карціна каштуе шалёныя — невядома якія грошы.

— Магла б каштаваць, калі б яна існавала. Супакойся.

— Можа, паведаміць, паказаць фотаздымкі?

— Каму, следчым?

— Калі б мы яе адшукалі, мы б былі забяспечаныя на ўсё жыццё…

— Нашто мне грошы? У мяне ёсць ты. На, глыні і супакойся.

— Ды не магу я супакоіцца…

*...у існаванне анёлаў вераць толькі старыя і дзеці. Дарослыя за клопатамі — забываюцца на іх. Згадваюць толькі, калі ім робіцца невыносна цяжка. І Бога тады згадваюць, і пекла. А пекла, чысцец, яны ж заўсёды побач...*

**Разам з медсястрой у палаце з'явіўся пах вуліцы — зялёнай маладой лістоты і ледзь адчувальны, але да болю знаёмы водар свежаспечанага хлеба. Немаладая жанчына ўважліва паглядзела на нерухомую пацыентку, на яе бяскроўна-мармуровы твар. Празрыстай трубкай катэтара ў іголку збягалі апошнія кроплі лекаў.**

**— Я ж ведала, што паспею, — медсястра ўзялася звыкла мяняць бутэльку на кропельніцы.**

**Толькі яна паспела ўправіцца, як у кішэні халата заблямкаў мабільнік. З парожняй бутэлькай у адной і слухаўкай у другой руцэ жанчына падышла да вакна, зірнула на вуліцу, быццам той, хто тэлефанаваў, стаяў у двары.**

**— Ой, сынок... Ты ўжо прыйшоў са школы?.. Хлеб я прынесла: і белы, і чорны... Як не бачыў? Паглядзі, ляжыць у шкапку. Расольнік на пліце, яшчэ цёплы, а макароны пагрэй... Як, не будзеш? Суп трэба есці... Ведаю, што чалавека забілі... Ну адкуль мне знаць, хто ён такі? Прыезджы, відаць, у хлебным так казалі. А ты што на аўтастанцыі рабіў?.. А, у школе пачуў... Ведаю, ведаю... Цукеркі з буфета не цягай. Дамовіліся? Ты ж у мяне вялікі ўжо... Відаць, позна вярнуся. І смятану не забудзься ў расольнік пакласці... І не хадзі больш нікуды. Чуеш? Пасядзі сёння дома... Ой, тут доктар ідзе, усё.**

**Медсястра не паспела схаваць мабільнік у кішэню, як у палату зайшоў рэаніматолаг.**

**— Анжэла Васільеўна, вы што сабе крычыце? Тут жа хворая.**

**— Так гэта ж, сын са школы прыйшоў. Трэба ж пакарміць дзіцёнка.**

**— Я разумею. Але крычаць навошта? Ад свайго кабінета пра расольнік пачуў. Смачны хоць?**

**— Нічога сабе атрымаўся, на курыцы, — і зашаптала: — А вы думаеце, яна чуе?**

**— Цалкам верагодна.**

**— Ой, мне ж не ў галаву. А вы ведаеце, што на аўтавакзале гэты самы наш — сіваваласы, чалавека застрэліў?**

**— Не чуў і чуць не хачу. Сваіх клопатаў хапае. Як яна тут?**

**— Дыхае... пакуль. Скажыце, а яе сваякам паведамілі хоць?**

**— Калі што, я ў кабінеце. Не нашая гэта справа, — доктар ціха прычыніў дзверы.**

**Анжэла Васільеўна прысела на крэсла побач з ложкам Мятліцкай і шэптам прамовіла:**

**— Маладая. Маці ж, відаць, недзе ёсць, хвалюецца... Ой, цяжка адной дзіця гадаваць. Майму абармоту ўжо трынаццаць. Калі ўсё абыдзецца, як ты будзеш адна дзіця падымаць? Твайго ж забілі. Ну, хіба, бацькі ў цябе маладыя — дапамогуць. А мне і дапамагчы не знайшлося каму, на пятым месяцы, як была, гад, кінуў. Аліментаў — нуль. Усё сама... Ой, навошта я табе ўсё расказваю? Мне ж доктар забараніў. Мо, ты і сапраўды чуеш? Калі так, то скажу — з доктарам табе пашанцавала, самы лепшы.**

*...я баюся старасці, баюся зморшчынак, сівізны, баюся, што не змагу пабегчы хутка-хутка, не змагу моцна абняць... А ты малады і неверагодна прыгожы. Як на карціне. Вочы ў вас заўсёды ззяюць, як у дзяцей. І валасы прыгожыя. Анёлы ж не старэюць? Так?..*

Ноўтбук жыў сваім жыццём. На экране імкліва змяняліся карціны Дзюрэра, малюнкі, гравюры, стракацелі разнамоўныя тэксты, узнікалі і згортваліся сайты мастацкіх аўкцыёнаў, усплывалі акенцы «пошукавікоў».

Альшанскі сядзеў перад камп'ютэрам, да клавішаў не датыкаўся. Левая рука ляжала на калене, у правай дымілася цыгарэта. Пасма сівых валасоў прыклеілася да лба, густа абсыпанага бісеры нкамі поту. Попельніца шчэрылася недапалкамі.

— Ну, вядома ж… Грошы вялікія… але вам іх не падняць. Ну, вы яшчэ пашукайце ў Інтэрнеце, колькі Леанарда да Вінчы каштуе. Не прадаюцца такія карціны! А, ужо шукаеце… Дазналіся? Толькі адна страхоўка мільярд фунтаў стэрлінгаў цягне. І гэта за нейкі гавёны нататнік Леанарда… Цікава, а колькі заплацілі за яе продкі барона? І ён спадзяецца, што адкупіцца ад мяне мільёнам, — шаптаў-трызніў Альшанскі.

На экране паверх сайта «пошукавіка» выскачыла акенца.

— Пошта мая прыйшла, — прымружыўся сівавалосы супрацоўнік Інтэрпола, колькі разоў шчоўкнуў клавішай, раскрыў паведамленне. — Хе… усе архівы на мой запыт паведамляюць адно і тое ж. Значыцца, яно і праўда. Падраздзяленне гвардыі сяржанта Сокала ў поўным складзе — у колькасці дванаццаці байцоў загінула, такога-та такога-та… Усе пахаваныя ў брацкай магіле. Загадам камандзіра дывізіі генерала Балахонава пасмяротна прадстаўлены да дзяржаўных узнагарод… Брацкая магіла знаходзіцца на тэрыторыі… Ну, ды гэта ўжо няважна. Аблом здарыўся, спадар Альшанскі. Канцы абсечаны і вельмі даўно, траўня такога-то, года сорак пятага. Нездарма барон да мяне звярнуўся.

Альшанскі ўзяў мабільнік, адшукаў нумар барона фон Штайна, але тэлефанаваць перадумаў.

— Кепскую навіну паведаміць ніколі не будзе позна.

*...гэта няпраўда, што ўсе дзеці прыгожыя. Я свае дзіцячыя фотакарткі не люблю. А вось здымкі Фелікса мне хацелася цалаваць. Яму пашанцавала, дзед фатаграфаваў любімага ўнука бясконца… Калі ён выйшаў на кухню, каб прынесці каву, я хуценька пацалавала яго фотаздымак. Там голенькі хлопчык з драўляным конікам у руках. Ледзь не расплакалася, такім родным ён мне падаўся. І рукі ў Фелікса пяшчотныя, як у дзіцяці. Ад іх дотыку пачынае кружыцца галава і свет плыве ў вачах. Я перастаю адчуваць сябе…*

У вялікім пакоі, дзе стаяў більярдны стол, толькі ён і быў ярка асветлены. Алекс Фасманскі сядзеў у глыбокім фатэлі. Побач на маленькім шкляным століку стаялі магнітафон, кардонка з касетамі, недапітая пляшка віскі і нізкая шклянка. Шары на зялёным сукне знаходзіліся ў той жа камбінацыі, што і мінулым вечарам.

Калі ў більярдную ўвайшоў Алег, Фасманскі цяжка падняўся. Ён быў у белай кашулі, не запраўленай пад рэмень, верхнія гузікі расшпілены.

— А вы так усю ноч і праседзелі? — спытаў Алег, праходзячы побач са сталом.

— Выпіць хочаш?

— Дзякуй, Аляксандр Францавіч. На службе ніколі не п’ю.

— Сам ты іх слухаў? — Фасманскі кінуў позірк на кардонку з касетамі.

— Не ўсё. А, што, трэба было?

— Дзе яны зараз?

— У яе.

— Людзей табе хапае?

— Пакуль упраўляемся — трое ж нас. Спім па чарзе. Вось толькі Шарпей псіхуе.

— А што яму не падабаецца?

— Самі ж ведаеце. Жонка маладая, дзіця малое. Вось і не сядзіцца яму.

— Другога такога радыста я не ведаю. Скажы яму: «Фасманскі ордэн даць не можа, а з новай кватэрай яму дапамагу».

— Разумна, камандзір. Навошта Шарпею ордэн? Ён свае яшчэ ў Афгане атрымаў.

— Грошы трэба?

Алег сцепануў шырокімі плячыма і ўсміхнуўся:

— Грошы заўсёды трэба.

— Бухгалтар выдасць, колькі скажаш.

— Аляксандр Францавіч, а што там у іх за Дзюрэр нейкі?

— Карцінка такая, Алег. Я і сам пакуль не ведаю, нашто мне ўсё гэта, але адчуваю, трэба.

Алекс выйшаў са змроку да ярка асветленага більярда, аберуч абапёрся на борцік стала. Ён глядзеў на шары, на сукно так, як самагубца на раку. Вочы былі чырвоныя, нявыспаныя, на шчоках паблісквала шчэць. Фасманскі, не падняўшы галавы, прамовіў:

— За кожным крокам, за кожным словам. Калі ўсё атрымаецца, я цябе, Алег, не забуду. Стане тваё жыццё поўным шакаладам. Сячэш?

— Зробім, камандзір. Выгляд у вас, як з акопа вылезлі. Вам бы паспаць.

— Не прасплю.

*...сапраўдная жарсць — гэта, калі мужчына зубамі раздзірае бліскучае апакаванне кандома. Так у мяне з Феліксам і было. А потым праз два тыдні мы і засцерагацца пакінулі. І ніякіх пігулак не глытала. А навошта, калі я кахаю яго, а ён мяне? Фелікс яшчэ пацікавіўся — якія лекі мне патрэбны ў аптэцы? Я пажартавала: «таблеткі ад кахання», — і пайшла. Ён застаўся ў машыне. Насамрэч я набыла за тысячу дзвесце рублёў банальны тэст на цяжарнасць. Закінула кардонку ў пляцак і забылася на яе. Я не хацела прыспешваць падзеі, мне ж было добра...*

— Мой дзед быў страшным чалавекам. Ён мог узнавіць кожны дзень свайго жыцця па гадзінах. І не таму, што меў выключную памяць. Ён усё запісваў, захоўваў, — з сумнай усмешкай прамовіў Фелікс.

— Я ўжо зразумела гэта.

— Бачыш, нават усе кнігі расстаўлены па алфавіце.

Ганна і Фелікс сядзелі на дыване пасярод кабінета Якава Міхайлавіча Рэя. Усю падлогу ад акна і да дзвярэй заслалі канцылярскія папкі, капэрты, папяровыя стосы, аперазаныя шпагатам. Тут былі сабраныя і раскладзеныя па датах: бланкі за аплату кватэры, тэлефонных размоў, паказанні электралічыльніка, чыгуначныя і авія квіткі мінулага стагоддзя, розныя страхавыя полісы, інструкцыі па карыстанні бытавой тэхнікай, нават вялікая капэрта з касавымі квіткамі на буйныя пакупкі. А ўсё, што тычылася працы, фотатэхнікі, оптыкі, штатываў, стужак, паперы, рэактываў, захоўвалася асобна і таксама ў ідэальным стане.

— Ты не ўяўляеш, як наша сям'я пакутавала праз дзедаў педантызм. Здагадваюся, маці таму і з'ехала ў Канаду, каб усяго гэтага не бачыць і не ведаць.

— А ты пайшоў не ў дзеда. Памятаю, як ты перад пасадкай ледзь знайшоў свой квіток на самалёт і згубіў партманетку.

— Гэта мой выклік сямейнай традыцыі. Трэба ж нечым ураўнаважыць такі педантызм продкаў. А ў цэлым, дзед быў класным чалавекам.

— Веру, — сказала Ганна. — Толькі ад гэтага не лягчэй. Ніякіх карысных падказак мы так і не знайшлі.

— Не там шукалі, — Фелікс падняўся, — ёсць яшчэ адно месца, пра якое не падумалі злодзеі. Не ўпэўнены, але, варта спраўдзіць і там.

З ліхтарыкам, вязкай ключоў яны спусціліся ў сутарэнні пад вялікім домам.

— Глядзі, — сказаў Фелікс.

Пляма святла слізганула па запыленых лыжах, паламаных штатывах, па каламутных слоіках і спынілася на дыктавых скрынях і старых чамаданах, што сцяной стаялі пад паліцамі.

— І тут усё падпісана, пранумаравана, палічана, — Ганна кранула адзін з кардонных цэтлікаў, прычэпленых да скрыні. «Шэсцьдзесят пяты — сямідзесяты».

Неўзабаве адшукаўся і невялікі старамодны чамаданчык з жалезнымі вугалкамі. На ручцы яго матлялася кардонка з лічбамі «45 — 46».

— Мяркую, нямецкі.

— Модны.

— Дзед казаў, трафейны.

З гэтым цяжкім чамаданчыкам Фелікс і Ганна вярнуліся ў кватэру. Пад вечкам, засланыя зжаўцелай газетай «Звязда», хаваліся нататнікі і сшыткі з запісамі. Праз

гадзіну Ганна ведала марку фотакамеры, з якой лейтэнант Рэй выехаў на рэдакцыйнае заданне, прозвішчы сяржантаў і радавых падраздзялення, якое знаходзілася ў маёнтку барона фон Штайна, адлегласць у кіламетрах ад штаба палка, надвор'е, якое стаяла ў той дзень. І галоўнае, у нататніку былі пададзены кароткія біяграфіі тых, каго франтавы фотакар паспеў сфатаграфаваць.

— Ну? — сказаў Фелікс.

— Твой дзед — геній. Гэтым паперам цаны няма. Павер, хто-хто, а я гэта ведаю, палазіла па архівах, складаючы радаводы.

— Гвардыі сяржант Сокал нарадзіўся ў Мсціславе.

— Ты быў там? А я была летась. Калі-небудзь раскажу табе і пра сваіх продкаў. А, можа, нават дам пачытаць.

Фелікс працягваў гартаць нататнік, пражываў дзень за днём разам з маладым лейтэнантам Якавам Рэем:

— Глядзі. Напісана, што ўсе, хто на здымку з карцінай, загінулі. Таму дзедавы фота і занатоўку не надрукавалі ў франтавой газеце. З падраздзялення застаўся толькі адзін чалавек — прыкамандзіраваны радавы Іваноў дваццаць пятага года нараджэння. Дзед крыху пазней сустрэў яго ў шпіталі.

*...а яшчэ я табе скажу. Бывае, я прахопліваюся пасярод ночы перад самым світаннем. І маё сэрца сціскае жах. Я гляджу на Фелікса, услухоўваюся, каб упэўніцца, што ён жывы. І яго дыханне, неразборлівае мармытанне ў сне супакойвае. Яму я пра гэта ніколі не скажу…*

Былы настаўнік каліграфіі ў жаночай гімназіі любіў сонечныя дні. Ён садзіўся да стала. Размінаў пальцы, хукаў на іх, як піяніст перад тым, як крануць прахалодныя клавішы. Ледзь чутна прамаўляў сам сабе верш. Доўга перабіраў парэзаныя ад рукі аркушы паперы, глядзеў іх на сонечнае святло, абмацваў, разгладжваў далонню і, нарэшце, клаў перад сабой. Высоўваў са стала таемную шуфлядку з рознакаліберныиі бутэлечкамі, выбіраў з пука стасоўнае гусінае пёрка. Спрактыкавана гастрыў яго, мачаў у бутэлечку і, гледзячы ў акно, таропка пачынаў пісаць імклівым пушкінскім почыркам.

— Я помню чудное мгновенье, передо мной явилась ты…

На высокім ілбе каліграфа высыпалі бісерынкі поту, быццам ён сам толькі што склаў гэты верш. Чорныя ніткі бессмяротных слоў цягнуліся за птушыным пёркам. Радкі ледзь паспявалі сохнуць. Выкрэсліваліся словы, пісаліся паверх, побач са словамі ўзнікаў жаночы профіль з высокай прычоскай і маленькім носікам, над ім з'яўлялася зграбная ножка ў пантофліку.

Ян Карлавіч адкідаўся на спінку крэсла і ціха прамаўляў у сонечнае акно:

— Еще одно последнее сказанье, и рукопись окончена моя, — слова «рукапіс» Ян Карлавіч устаўляў замест «летапіс» наўмысна, усяго Пушкіна ён ведаў на памяць.

Кожны ў паслярэвалюцыйныя гады выжываў, як мог. Ян Карлавіч разумеў, што займаецца нядобрай справай, але трэба было есці, апранацца. Не мог жа ён дазволіць сабе жыць за кошт пляменніцы. На Міцкевіча, якога стары настаўнік любіў больш за Пушкіна, попыту ў апошнія гады ў Маскве не было. А вось чарнавікі Аляксандра Сяргеевіча сыходзілі някепска.

У кабінет зазірнула Ванда. Ян Карлавіч не паспеў схаваць чарговую таленавітую падробку.

— Зноў Пушкін?

— Чацвёрты аўтограф раблю. Сорамна. Вельмі сорамна, — прызнаўся каліграф. — Але зірні. Прыгожа. Быццам толькі што з-пад рукі Пушкіна гэтая старонка вылецела, — Ян Карлавіч падняў аркуш за ражок і памахаў ім у паветры.

— Ой, Ян Карлавіч. Небяспечна гэта.

— Ведаю, Вандачка. Але жыццё такое. Я б з задавальненнем у чорным сурдуце ў гімназію хадзіў. Але дзе тая гімназія? Там зараз твае бальшавікі клуб зрабілі. А свой чорны сурдут я не прадаў, пахаваеш мяне ў ім.

— Што вы, Ян Карлавіч…

— Вандачка, Станіслаў Краеўскі добры чалавек. Па ўсім відаць, клапоціцца пра цябе. Але, не кажы яму, чым мне старому на хлеб свой горкі зарабляць даводзіцца. У ЧК ж працуе.

— Добра, не скажу.

— Я з вас і за жытло не бяру. Вы мне цяпер, як родныя дзеці.

Ян Карлавіч схаваў у таемную шуфлядку чарнавік верша і адчуў, што страшэнна стаміўся. Ванда паклікала яго піць гарбату — з цукрам, між іншым.

*...калі жанчыне робіцца непрымна глядзець, як яе мужчына есць: жуе, глытае, запівае віном, раздзірае нажом і відэльцам кавалак мяса, гэта азначае, што каханне сышло. Так было ў мяне з Алексам. Я ледзь стрымлівала агіду, калі сядзела насупраць яго…*

Грузавік з чэкістамі прыпыніўся каля царквы. Міхайлаў саскочыў з падножкі, узбег на высокі ганак, таргануў дзверы.

— Зачынена. Такую іх маць-перамаць… Пайшлі, — махнуў рукой у бок аднапавярховага цаглянага дома з бляшаным зялёным дахам.

— А ты тут чакай, — сказаў Краеўскі вадзіцелю і выбраўся з кабіны.

Чэкісты падаліся да дома святара — айца Паўла.

— Не люблю папоў, — Міхайлаў пераскочыў рудую калюгу, — крывасмокі. За ўсё грошы з працоўнага чалавека цягнуць. Пахрысцяць — плаці ім, пахаваюць — грошы давай. Гультаі. Нічога не робяць. За што іх паважаць?

— Ты што, не пахмяліўся, Сямён? Як руды сабака злосны, — Краеўскі праз плячо зірнуў на няголены твар свайго таварыша, у яго пачырванелыя вочы.

Сям’я святара Мікольскай царквы сабралася за сталом. Трое дзяцей: дзве старэйшыя дзяўчынкі-блізняты і шасцігадовы сын Сярожка. На стале стаяў сціплы сняданак. Айцец Павел перахрысціў бохан хлеба, пакроіў на лусты даўгім нажом, расклаў дзецям, цяжарнай жонцы. Да ежы ніхто не дакранаўся. Будзённа гучала малітва па-старaславянску. Сярожка прыціскаў левай рукой да грудзей белага трусіка. Бухматая жывёлінка глядзела чырвонымі вочкамі на яркія скрылькі морквы і часта дыхала.

Двое чэкістаў увайшлі ў дом без папярэджання, нават брудныя боты не выцерлі. Яны не сказалі ані «добры дзень», ані «смачна есці». Міхайлаў выцягнуў з-за пазухі складзены напалам аркуш паперы, разгарнуў яго і паказаў святару. Краеўскі нягучна паведаміў.

— У нас ордэр, грамадзянін Сяміpадзкі.

— Ваша воля, — адказаў айцец Павел, яго рукі бязвольна апалі.

Ён глядзеў на прыціхлых дзяцей, на спалоханую цяжарную жонку, якая апусцілася на крэсла, і вінавата міргаў. Святар быў дробненькі, яшчэ малады мужчына з рэдкай, кранутай сівізной бародкай.

— Мы, вядома, можам і панятых паклікаць, — самаўпэўнена прамовіў Міхайлаў. — Але, давайце, грамадзянін-бацюшка, без залішніх цырымоній. Мы не сыдзем ад вас, пакуль вы не перадасцё нам — прадстаўнікам савецкай улады — каштоўнасці, якія хаваеце ў сваім доме.

— Якія?

— Вам лепш ведаць. Золата, срэбра, ланцугі, крыжы, пярсцёнкі, кубкі, падсвечнікі, кандэлябры і іншыя прадметы культу. Карацей, здавайце падчыстую ўсе вашыя папоўскія цацкі, — Міхайлаў слізгануў позіркам па стале, паліцах, старым буфеце, выглядаў бутэльку, альбо графін.

Айцец Павел кpануў свой сціплы медны крыж, што вісеў паверх сутаны:

— Месяц таму з царквы вашы ўсё забралі.

— Ведаем, — адрэзаў Міхайлаў, расчыніў буфет, дастаў графінчык, адкаркаваў, пацягнуў носам. — Віно?

— Кагор… — разгублена адказала цяжарная пападдзя.

— А гарэлкі няма? — Міхайлаў каўтануў сліну.

— Прабачце, не трымаем, — жанчына паклала далонь на высокі, ледзь не пад самыя грудзі, жывот.

— Нам татарам… — Міхайлаў узяў шклянку, наліў паўнюткую і выпіў адным махам.

У пакоі запанавала насцярожанае маўчанне. З кожнай хвілінай яно рабілася ўсё больш гнятлівым.

— Можна, я яго пакармлю? — папрасіў у Краеўскага хлопчык і палашчыў трусіка.

— Кармі, — пагадзіўся Станіслаў.

Але дазволу незнаёмага чалавека для хлопчыка было мала і ён паглядзеў на бацьку. Той нічога не адказаў. Краеўскі ўзяў скрылік морквы з талеркі і падсунуў пад нос трусіку.

— Ён не бярэ з чужых рук, — патлумачыў сын святара.

— То, трымай моркву, сам кармі свайго разумніка.

Міхайлава ад выпітага нарэшце крыху адпусціла, нават вочы заблішчэлі, а на нyголеных шчоках з'явілася чырвань.

— Бачыш, таварыш Краеўскі? І цёпла ў яго тут, і баба пад бокам, і віно, і хлеб, і морква нават ёсць. Зайцоў ёй кормяць. А там, — ён няпэўна махануў рукой з графінам, — людзі ад голаду, як тыя мухі, дохнуць. Каштоўнасці гані!

— Таварышы… людзі добрыя. Я ўсё аддаў. Паперы магу прад'явіць, — занерваваўся святар.

— Ты сваёй паперай можеш падцерціся. Мне з яе што?

— Ну, як жа так? Што я магу яшчэ здаць? Усё вынеслі, храм амаль пусты. Сцены голыя.

Хлопчык пасадзіў свайго трусіка на стол, каб таму было ямчэй грызці сырую моркву. Дзеці сачылі за сваім улюбёнцам.

— Здавайце, грамадзянін Сямірадзкі, — спакойна прапанаваў Краеўскі, — усё адно знойдзем.

— Воля ваша, шукайце, — прашаптаў святар і перахрысціўся.

І пападдзя перахрысцілася.

Міхайлаў зрабіў тры крокі да стала, сагнутым пальцам пачухаў трусіка паміж вушэй. Сярожка, да гэтага зацяты, пасміхнуўся, бо і нyголенаму дзядзьку яго гадаванец спадабаўся. Былы кулямётчык нетаропка правёў колькі разоў пяцярнёй па дрыготкай спінцы, схапіў за заднія ляпы і садануў з усяе моцы дзіцячага ўлюбёнца аб стол. З галавы трусіка густа пырснула кроў.

Пападдзя войкнула.

Трусік ляжаў на стале і дрыгаў заднімі лапамі.

Дзеці закрычалі. Святар таргануўся, але Краеўскі прытрымаў яго:

— Спакойна.

— Што ж вы робіце? Дзеці ж глядзяць… — па шчоках айца Паўла пакаціліся слёзы.

Пападдзя хацела схапіць сына, прыціснуць да сябе, але той вырваўся, зайшоўся ў істэрыцы. Міхайлаў схапіў дзіцяня за плечы, моцна страсянуў:

— Змоўкні, гадзяня. Дзе скарбы? Дзе цацкі папоўскія? — Міхайлаў ужо завёўся, ён заціснуў дзіцяці рот рукой і правішчэў: — І бацьку твайго зараз кончым. Дзе схаваў?!

— Там, пад буфетам, у скрыначцы… — здолеў прашаптаць у далонь Сярожка.

— Даставай, — узрадавана адпусціў хлопчыка былы кулямётчык.

Малы падбег да буфета, апусціўся на каленцы, выцягнуў дыктавую скрынку, усярэдзіне забразгаў метал.

— Бярыце, бярыце. Мне нічога не трэба.

Міхайлаў выхапіў скрыню, адкінуў вечка.

— Ах ты, паскуднік папоўскі!

У скрыні і, сапраўды, былі схаваныя ўсе каштоўнасці шасцігадовага хлопчыка: драўляны конік, стракатая бляшанка з-пад манпанс'е, павелічальнае шкло, манеткі-дра-

бяза, цвічкі, калейдаскоп, фаянсавы анёльчык, каляровыя алоўкі, жалезны ланцужок ад гадзінніка, тры рознакаляровыя аптэчныя бутэлечкі, два грэцкія арэхі з пацёртай пазалотай, дзве іржавыя гіркі.

Усё гэтае багацце пасыпалася на падлогу. Маленькія крылцы каляднага анёла адбіліся і бялелі пад нагамі пялёсткамі ружы.

— А цяпер ты пакажаш мне тое, што бацька схаваў, — Міхайлаў тыцнуў наганам у грудзі маломy.

— Не трэба! — крыкнула маці, паспрабавала падняцца, але тут жа абсела, пачала хапаць паветра пасінелымі вуснамі.

Дочкі-блізняты стаялі побач са сталом насупраць Міхайлава і глядзелі на апошнія ўздрыгі трусіка.

Ніхто не чакаў, што святар не вытрымае… А ён схапіў вялікі нож, якім кроіў хлеб, і кінуўся на былога кулямётчыка.

Краеўскі скочыў на пярэймы і паспеў перахапіць ускінутую руку з занесеным для ўдара нажом:

— Стой! — крыкнуў Станіслаў.

У гэты момант прагучалі два стрэлы. Святар расціснуў пальцы, нож упаў на падлогу. Айцец Павел хіснуўся, паспрабаваў абаперціся на край стала, але аб’ехаў, сцягнуў за сабой абрус са сняданкам і забітым трусікам.

— Ты бачыў, бачыў, Краеўскі? Ён жа зарэзаць мяне мерыўся. Нажом, як свінню. Ты глядзі, падла якая. А яшчэ поп з крыжам. З імі трэба быць пільнымі. Вока ды вока. Каб не ты, усадзіў бы мне ў самае сэрца.

Мёртвы айцец Павел ляжаў на падлозе…

...чэкісцкі грузавік калываўся па разбітым гарадскім бруку. Цела святара — айца Паўла, прыкрытае лапленым мехам, падскоквала на выбоінах, абцасы чаравікаў глуха грукалі аб дошкі кодаба. Краеўскі ціснуўся ў куце і стараўся не глядзець на нябожчыка. Калі грузавік пачаў з’язджаць з моста, чыстыя падэшвы святаровых чаравікаў упёрліся Станіславу ў пах. Ён спалохана падхапіўся. А тут яшчэ наляцеў вецер, здзёр лаплены мех і шпурнуў на Краеўскага. І гэтага хапіла. Станіслаў замалаціў кулаком па кабіне.

— Стой! Я каму сказаў?! Спыняйся!

Грузавік стаў. Краеўскі пераваліўся праз борт.

— Ты чаго, Станіслаў? — пацікавіўся Міхайлаў.

— Нічога, — выціснуў з сябе Краеўскі.

Міхайлаў прыўзняўся на падножцы, зазірнуў у кодаб і сплюнуў.

— Маць-перамаць. Раскрыўся. Я ж добра-такі падтыкаў.

Краеўскі цяжка дыхаў, аблізваў сухі рот.

— Сядай на маё месца, тут цяплей, — прапанаваў былы кулямётчык.

— Лепш прайдуся, — як сам сабе, сказаў Краеўскі.

Вадзіцель таргнуў Міхайлава за рукаў.

— Не чапай ты яго, Сямён. Чуеш? Кепска яму.

— Ды бачу я. Не сляпы. А ў нас яшчэ дзве царквы не абіходжаныя. Паехалі.

Машына кранулася. Краеўскі застаўся стаяць каля дрэва.

— Слімак, — прамовіў былы кулямётчык і глынуў папоўскага кагору з прыхопленага ў доме графіна, размазаў, як кроў, па няголенай шчацэ салодкае чырвонае віно.

*...праз паўтара месяца я згадала пра той, набыты ў аптэцы, тэст. Але і без яго я ўжо ведала, што цяжарная. Калі б сказала пра гэта Феліксу, то ўсе нашы грандыёзныя планы засталіся б нерэалізаванымі. Ён пасадзіў бы мяне ў фатэль, загарнуў у коўдру і пачаў бы карміць са срэбнай лыжачкі. А мне такога не хацелася. Я кроў ад крыві сваёй прабабкі. Упэўнена, што і Ванда не сказала Станіславу пра сваю цяжарнасць. Мы такія — зацятыя. Цяжка, страшна, балюча, але ўсміхацца будзем, сцяўшы зубы. Думаю, што ён здагадваўся. Хаця ўсе мужчыны ў падобных справах аднолькавыя дурні. Яшчэ ў дзяцінстве, калі бачыла ў кіно, як жанчына прызнаецца мужу, што яна цяжар-*

*ная, а ён шчыра здзіўляецца і робіць вялікія вочы: «Не можа быць. Як гэта?», — я істэрычна рагатала...*

Карчма на Гарохавай была месцам страшным. Туды сцякалася і спаўзалася розная набрыдзь з усяе Масквы. Там сустракалі і радаваліся кожнаму, хто мог заплаціць. А калі ў цябе грошы канчаліся, выкідалі на вуліцу.

Ванда Мятліцкая глядзела на дзверы карчмы, на расколатае шкло і разважала: зайсці ўсярэдзіну ці вярнуцца дадому і там чакаць Станіслава. Потым падабралася, спусцілася на тры шчарбатыя прыступкі, налегла на дзверы і апынулася ўсярэдзіне.

У прыцемках, за слаістым тытунёвым дымам яна не адразу згледзела Краеўскага. Да яе пацягнуліся мужчынскія рукі. Такія жанчыны, як Ванда, заходзіць сюды не рызыкавалі.

— О, барышня! Хадзі да мяне. Вінoм пачастую.

— Адвалі! — нервова крыкнула ў чырвоны азызлы твар тэлеграфістка ЧК.

— А што так? Барышня нервовая? Добра, добра… Я без рук.

За бруднымі сталамі сядзелі, стаялі, спалі апранутыя і паўраспранутыя мужчыны: рамізнікі і балаголы, грузчыкі і грабары, салдаты і рабочыя. П’яна крычалі, сварыліся, лаяліся, спявалі і плакалі. Ванда праціскалася паміж узмакрэлых мужчын, нарэшце ўбачыла Станіслава. Яна ўзмахнула рукой, гукнула, але той не ўбачыў, не пачуў.

Краеўскі ў накінутай на плечы скуранцы сядзеў у самым дальнім ад увахода куце. За адным сталом з ім узвышаліся два абыякавых да ўсяго, што адбывалася вакол, мужчыны ў шынялях.

Ванда праціснулася да Краеўскага.

— Станіслаў, ты што тут робіш? Я цябе абшукалася.

— П’ю. Хіба не бачыш? — Краеўскі падняў поўную чарку і ўліў сабе ў рот, абярэжна паставіў.

Адзін з таварышаў Станіслава ўклаў яму ў левую руку лустачку хлеба са скрылікам сала, другі таварыш падліў у чарку.

— Гэта Ян Ліндэрган, — ледзь вымавіў прозвішча Краеўскі, — а гэты — Урмас Пельш.

Латышы, пачуўшы свае гучныя прозвішчы, падняліся, ледзь не ўпёрліся ў столь, схілілі галовы.

— Ненавіджу, ненавіджу… — скрушна прамовіў Краеўскі і выпіў, — сябе ненавіджу.

— Яго дадому трэба, — сказала Ванда латышам.

— Дадому? У мяне ёсць ты, Ванда, а вось дома — няма. Ды мяне забіць мала. Чуеш, Ян?

Ліндэрган згодна хітнуў.

— Што здарылася, Станіслаў? — Ванда кранула руку Краеўскага.

— Нічога. Забіць мяне трэба.

— Вы дапаможаце завесці яго дадому?

Латышы паглядзелі адзін на аднаго, маўляў, не пакінем яго тут.

— Я не пайду адсюль — нікуды, — Краеўскі не дачакаўся покуль яму падліюць гарэлкі і ўзяўся наліваць сам…

Праз гадзіну латышскія стралкі — Ліндэрган і Пельш — лёгка ўсцягнулі непрытомнага Краеўскага на другі паверх. Усё зрабілі без слоў і моўчкі сышлі з кватэры Яна Карлавіча…

...нараніцу былы настаўнік каліграфіі далікатна пагрукаў у дзверы да сваёй пляменніцы. Тая сядзела пры ложку і лашчыла руку Краеўскага.

— Я зараз пайду, у мяне справы ёсць на вакзале. А яму, Вандачка, прачнецца — кепска будзе, — з-за спіны, як фокуснік труса, Ян Карлавіч дастаў шкалік з гарэлкай. — Ты дай яму потым. Падобнае лечаць подобным. Па сабе ведаю.

Ён паставіў на стол шкалік і ціха сышоў.

Краеўскі адкрыў вочы.

— Ванда, я больш не магу з імі. Я раблюся зверам, жывёлай.

— Супакойся, не плач. Ян Карлавіч табе лекі прынёс.

— Добры ён чалавек, шкада мне яго. Усіх шкада. А сябе ненавіджу. Я не буду гарэлку.

— І што нам з табой рабіць?

Краеўскі адвярнуўся да сцяны, маўчаў.

— А я ўчора не паспела тэлеграму аддаць, з Мсціслава адбілі. Прыбегла ў кабінет, а старшыня з’ехаў у Піцер.

— Зноў спісы?

— Не, золата царкоўнае — два пуды.

— Мсціслаў, золата?.. — перапытаў Станіслаў.

*...я купіла бутэльку чырвонага віна, нагатавала на хуткую руку, зрабіла на стале прыгажосць, нават кветку паставіла ў вазачку. Самой есці не хацелася. Я глядзела на Фелікса і радавалася сваім патаемным думкам. І Феліксу было весела, ён жартаваў. Я паставіла перад ім талерку з мясным асарці. Ён бессаромна браў скрылькі мяса рукой, хрумсцеў агурком, шчаслівым школьнікам паглядаў на мяне і хваліў мае кулінарныя здольнасці. Раптам у яго носам пайшла кроў. Яна капала на абрус, талерку, а ён глядзеў на мяне, пасміхаўся і не заўважаў, што робіцца з ім. Мяне, як спаралізавала. Гэта быў ці не самы мой моцны сполах за ўсё жыццё. Хаця б, здавалася, нічога надзвычайнага і не здарылася. Фелікс закінуў галаву, пайшоў у ванны пакой. Я ж не магла падняцца з крэсла, глядзела на крывавыя кропкі. А думала, што зусім і не баюся крыві...*

Краеўскі прыйшоў у ЧК раней як звычайна чыста паголены, у свежай кашулі. Але твар яго быў злосны, і шэрыя вочы суха блішчэлі. Да папірос ён не дакрануўся, хоць партсігар і запалкі ляжалі на стале. Станіслаў заправіў у друкарку чысты ліст паперы, рукі пасля ўчорашняга па-здрадніцку калаціліся.

Былы кулямётчык-балтыец Сямён Міхайлаў нацерушыў з кісета тытуню, зрабіў самакрутку, хацеў узяць са стала Краеўскага запалкі, але той прыкрыў скрыначку далонню.

— Станіслаў, — вымавіў Міхайлаў, — ну, ты ж разумееш, ён бы ўдарыў мяне нажом. Паклаў бы мяне там, пры буфеце.

— Не факт, — сказаў Краеўскі.

— Факт — забіў бы.

Станіслаў ператоргнуў карэтку машынкі, зашчоўкаў па тугіх клавішах.

— Ты гэта і хочаш адляскаць? — Міхайлаў глядзеў на друкарку.

Пачалі з’яўляцца радкі, набраныя вялікімі літарамі: «СТАРШЫНІ ЧК таварышу Ф. Э. ДЗЯРЖЫНСКАМУ ад старэйшага оперупаўнаважанага С. С. КРАЕЎСКАГА».

Краеўскі ператоргнуў карэтку:

«Даводжу да Вашага ведама, што 2 лістапада бягучага года пры выкананні Вашага асабістага распараджэння і ў адпаведнасці з выданым ордэрам, падчас канфіскацыі царкоўных каштоўнасцяў у святара Мікольскага храма, грамадзяніна Паўла Сяміградскага оперупаўнаважаным С. Д. Міхайлавым, які знаходзіўся ў нецвярозым стане, былі перавышаны службовыя паўнамо…

Міхайлаў з перакошаным тварам схапіў Краеўскага за руку:

— Станіслаў, ты што? Табе нейкі поп даражэй за мяне — марака-балтыйца? Я ж праліваў кроў за справу рабочых і сялян. Мяне ж двойчы ворагі паранілі: адзін раз у руку, другі ў нагу.

— Рукі прыбяры, — строга сказаў Краеўскі. — У папа, між іншым, трое дзяцей і жонка цяжарная.

Міхайлаў падышоў да акна, хапануў паветра. Станіслаў нядобра пасміхаўся, калі глядзеў у шырокую спіну былога кулямётчыка.

— А ведаеш, што, Сямён? Я гэтую паперу магу і перапісаць.

Міхайлаў павярнуўся.

— Правільна, Станіслаў, правільна. Напішы, што ён… Ну, ты ж сам ведаеш, як напісаць.

Краеўскі высунуў шуфляду, расцягнуў перад сабой, як кравецкі метр, стужку тэлеграмы і афіцыйным голасам прамовіў:

— Каб не новае даручэнне, здаў бы я цябе, Сямён. І разбіралася б з табой камісія. А ты з іх метадамі знаёмы. Ты таварыша Маркава ведаеш?

— Якога-такога Маркава? — разгубіўся Міхайлаў.

— Нашага, каторы ў Мсціславе галоўны.

— Зараз, даведаюся, — узрадваўся былы кулямётчык, ён ужо адчуў, што Краеўскі вырашыў змяніць гнеў на літасць.

— Я павінен ведаць пра яго ўсё.

Міхайлаў прыгладзіў валасы.

— У мяне ж знаёмы сядзіць, там дзе нашыя асабістыя справы стаяць…

Краеўскі не прамовіў ані слова.

— Дык я гэта, на паўгадзінкі адскочу. А ты, Станіслаў, адпачні пакуль. На тэлеграф схадзі, пакуль я туды-сюды. Во, Ванду сваю пачастуй, — высыпаў побач в партсігарам тры цукеркі і паглядзеў на Краеўскага адданым сабачым позіркам.

Станіслаў у адказ усміхнуўся, падсунуў Міхайлаву запалкі. Былы кулямётчык акуратна выкруціў з друкарскай карэткі паперу, капірку паклаў на стол.

— Я на самакруткі вазьму?

— Добра, — пагадзіўся Краеўскі і скінуў у далонь цукеркі.

У дзвярах чэкіст азірнуўся:

— Я аднаго Маркава ведаў, з берагавой аховы — балтыйца. Мо і ён. Зараз дазнаюся.

Краеўскі выйшаў следам, прымкнуў дзверы…

...праз паўгадзіны ўспатнелы Міхайлаў увайшоў у кабінет.

— Так і думаў, наш, той самы, — дастаў з кішэні паперу, верхняя частка якой была неакуратна адарваная, паклаў перад Краеўскім, — во!

Міхайлаў счакаў, пакуль старэйшы оперупаўнаважаны прачытае расплывістыя літары, выведзеныя хімічным алоўкам, разбярэцца ў іх, а потым загаварыў:

— Мужык ён гаўністы. Ніякі не матрос. На беразе служыў, склады ў Віндаве вартаваў. А потым яго на бронецягнік узялі, там ён з таварышам Дзяржынскім і пазнаёміўся, у Гомель з ім ездзіў, мяцеж душыў. Я з ім сустракаўся — гаўністы. А глядзі, у начальнікі выбіўся. Але скажу табе: лепш быць звычайным оперупаўнаважаным у цэнтральным апараце, чым начальнікам павятовага ЧК. Правільна я мяркую?

Краеўскі ціха хітнуў, але згадаў фразу, якую часта паўтараў яго настаўнік гісторыі ў мінскай гімназіі: «Лепш быць першым у Галіі, чым другім у Рыме». Якому рымляніну належала гэтае выслоўе? Станіслаў не стаў напружваць памяць.

— Летась яму ордэн далі… У партыі з васемнаццатага года, — прамовіў Краеўскі.

— А я з семнаццатага, — не без гонару дадаў Міхайлаў і запаліў.

*...магчыма, Ванда не аднойчы спрабавала ўявіць Станіслава мёртвым. Я ведаю — яе пераконвалі, гаварылі правільныя словы, запэўнівалі, што Краеўскага больш няма і не трэба пра яго думаць. Але яна так і не змагла паверыць, што тое ёсць праўдай...*

Чацвёртага лістапада ўдзень Міхайлаў замкнуў кабінет з сярэдзіны, падышоў да стала Краеўскага і пачаў перабіраць паперы ў шуфлядках. Зразумела, ён шукаў рапарт на імя Дзяржынскага. Ператрос усе папкі, не знайшоў, і гэта крыху супакоіла. Не той

гэта дакумент, каб Краеўскі яго ў сейф схаваў. Дый замкі ў сталёвай дзверцы такія, што не заўсёды і ключом адамкнеш. Станіслаў ужо другі дзень не з'яўляўся на службе. Але ж і не папярэдзіў нікога!

Міхайлаў падаўся на тэлеграф. Ён ціха ўвайшоў у вялікае памяшканне, дзе працавала пяць тэлеграфістак. Ляскала, шумела, круціліся бабіны, паўзлі, скручваліся папяровыя стужкі. Дзяўчаты абрывалі іх, рэгістравалі і беглі разносіць па кабінетах.

Ванда сама падышла да Міхайлава.

— Прывітанне, — сказаў Сямён.

— Ты чаго?

— Дзе наш Краеўскі?

— А што такое?

Міхайлаў схлусіў:

— Яго начальства шукае.

— Якое? — строга пацікавілася Ванда.

— А табе ведаць не трэба. Дзе ён?

— Адкуль я ведаю?

— А хто тады ведае?

Ванда наблізалася да Міхайлава, прашаптала:

— Нікому не скажаш?

— Магіла, — паабяцаў чэкіст.

— Яму даручылі аднаго начальніка ўзяць.

Міхайлаў радасна ўсміхнуўся:

— Браць паехаў? Ведаю каго. Мог бы і мне сказаць, — і тут жа насцярожыўся. — А мяне чаму з сабой не ўзяў? Не давярае? — паглядзеў на Ванду запытальна і крыху спалохана.

— Вашы справы — самі і разбірайцеся. Мне працаваць трэба.

Яе апарат побач з акном ажыў, папаўзла стужка.

— Я табе цукерку прынёс буржуйскую. На, — Міхайлаў быў падаўся да стала Ванды.

— Нельга табе туды. Сакрэтная, — але цукерку Ванда ўзяла.

Увечары таго ж дня Сямён Міхайлаў ужо дакладна ведаў, што афіцыйных папер ні на якія камандзіроўкі,ператрусы і арышты Краеўскі не атрымліваў. Куды, з кім паехаў, так і не высветліў. А, можа, той наогул нікуды не выпраўляўся. Не падабаўся яму Станіслаў Краеўскі. Ніколі не падабаўся, не тая кроў цякла ў яго жылах.

*...так, я ведаю, што згадаў Краеўскі ў апошія імгненні жыцця. Маленькую карычневую радзімку. Такую ж, як у мяне...*

Перад кабінетам каменданта Беларуска-Балтыйскага вакзала было шматлюдна, не праціснуцца. Дужыя чырвонаармейцы ў даўгіх шынялях, прапахлыя тытунём і потам, матросы ў чорных бушлатах, кавалерысты з шаблямі… будзёнаўкі, фуражкі, бесказыркі, папахі, картузы-васьміклінкі… і ніводнай жанчыны.

Ванда Мятліцкая ў кароткім каракулевым футры з рыдыкюлем і муфтай на грудзях, у зграбных шнураваных боціках спалохана глядзела на знерваваны натоўп, які аддзяляў яе ад дзвярэй каменданта. Яна і думаць не думала, што цяжкасці пачнуцца адразу, яшчэ ў Маскве. Ванда выцягнула з кішэні свой мандат супрацоўніка цэнтральнага апарата ЧК, набрала поўныя грудзі паветра і пачала праціскацца да дзвярэй.

— Прапусціце, калі ласка, ЧК, прапусціце ЧК…

Не на ўсіх дзейнічаў дакумент. А вось маладосць і прыгажосць дапамагалі. Нейкі няголены матрос-балтыец самахоць вырашыў дапамагчы, ён пайшоў перад Вандай, некага адштурхоўваў, некага адцягваў, а некаму біў кулаком у спіну. А ў вырачаныя, набрынялыя крывёй вочы незадаволеных шаптаў:

— ЧК. Ты што, аглух, салдат?

Ванда пераступіла парог кабінета, праціснулася да вялікага стала, засыпанага тэлеграмамі, паперамі. Паверх іх стаяла жалезная конаўка з кіпенем.

— Таварыш, — звярнулася Ванда да немаладога сівавалосага мужчыны ў гімнасцёрцы. — Для нашага супрацоўніка — квіток, — Мятліцкая паказала мандат.

Камендант глынуў кіпеню:

— Свірыдаў, маць тваю, ты тэлеграму чэкістам адбіў?

— Яшчэ гадзіну таму, — пачуўся бадзёры голас з кута.

— Не паштовым, а ліцерным ваш Міхайлаў да Менска паедзе. Роўна ў восем. З адным прыпынкам. Ну няма ў мяне другіх квіткоў. Што мне, памерці? — развёў бездапаможна рукамі немалады, ушчэнт змораны мужчына і падаў Вандзе квіток.

— І на гэтым дзякуй, — сказала Мятліцкая. — Не хвалюйцеся так.

— Дзе ж тут не будзеш хвалявацца? То кампалка, то камісар, то вагон для коней, то ЧК. І ўсім ехаць трэба, — камендант паглядзеў на Ванду і ўсміхнуўся. — Выбачайце, паненка, хай ваш Міхайлаў у буфеце адпраўлення чакае…

...знерваваны нядобрымі прадчуваннямі Сямён Міхайлаў ужо выйшаў з кабінета, калі ўбачыў дзяўчыну-тэлеграфістку, якая шпарка ішла да яго.

— Вам з вакзала, тэлеграма.

— Мне, — крыху здзівіўся Міхайлаў, — з якога?

— Беларуска-Балтыйскага, — аддала і пайшла.

Міхайлаў вярнуўся ў кабінет, стаў пад святло, разгарнуў стужку. Асабіста яму нейкі Свірыдаў паведамляў: у сувязі з тым, што адправіць яго трыццаць другім паштовым цягніком няма магчымасці, яму прадастаўлены квіток на ліцерны да Менска, які адыходзіць сёння ў восем вечара.

— Што ж гэта можа быць? — прамармытаў Міхайлаў, і самыя змрочныя прадчуванні адбіліся на ягоным твары. — Здраднікі. Пся кроў, — рука легла на кабуру.

На гадзінніку было без якой хвіліны сем.

— Брэшаш, не сыдзеш…

— … хутчэй, хутчэй, — падганяў вадзіцеля грузавіка Міхайлаў.

Твар яго быў злосны і рашучы. Дзе-нідзе вуліцы ўжо прыхапіў лядок, машыну кідала з боку ў бок. Адзін раз пад колы ледзь не трапіла бабуля, другі раз саданулі ў вазок, але нават не спыніліся. З запаленымі фарамі чэкісцкі грузавік вылецеў на людную плошчу Цвярской заставы да Беларуска-Балтыйскага вакзала.

— Ад Міхайлава не сыдзеш, курва. Ой, не сыдзеш, — прамармытаў былы кулямётчык.

— Я з вамі.

— Тут чакай! — абсёк вадзіцеля оперупаўнаважаны і выскачыў з машыны.

Ён бег да перона, да якога яшчэ не падышоў ліцерны. Ані Краеўскага, ані Мятліцкай чэкіст не згледзеў. Міхайлаў спыніўся, аддыхаўся, расшпіліў бушлат, выцер рукавом успатнелы твар, выхапіў з кабуры наган, крутануў барабан і схаваў зброю ў глыбокую цёплую кішэнь. Зняў шапку, схаваў за пазуху, наставіў высокі каўнер, каб не адразу пазналі. Няспешна насыпаў на паперку тытуню, паслініў, скруціў цыгарку.

Міхайлаў паліў і няспешна хадзіў па шматлюдным пероне, пільна ўглядаўся ў ад’язджаючых. Людзей набралася так шмат, што было незразумела, як яны ўсе ўваб’юцца ў цягнік. Вакол гаманілі, сварыліся, спявалі, смяяліся. Нехта плакаў…

Ванда ў адной руцэ несла вялікую валізу з рэчамі, у другой скураны рыдыкюльчык. Яна выйшла з вакзала на перон, калі ліцерны ўжо падавалі, цягнік цяжка сунуўся ўздоўж платформы, ляскаў вагонамі. Яна пачала працярэблівацца да другога вагона, да «галавы» цягніка. Чорны паравоз пыхкаў дымам і парай. Пасажыры ламануліся да вагонаў, каб, як мага хутчэй, першымі заняць месцы.

Перед Вандай ішлі, счапіўшыся за рукі, і брудна лаяліся тры чырвонаармейскія камандзіры. Крайні прытрымліваў левай рукой шаблю. Такую п’яную кампанію не аб’едзеш, не абыдзеш. Ванда рушыла ўбок і твар у твар сутыкнулася з Міхайлавым.

— Прывітанне, — сказаў Сямён і паглядзеў на рэчы ў руках Мятліцкай. — Відаць, далёка сабралася.

Ад нечаканасці і сполаху ў Ванды заняло мову, яна адно міргала і спрабавала ўсміхнуцца.

— А хто барышню будзе сустракаць у Менску? Ці не сам старшы оперупаўнаважаны ЧК таварыш Краеўскі? Тут тэлеграмку мне твая сяброўка прынесла, я і скеміў, што да чаго. Ледзь паспеў…

— У мяне дакумент ёсць. Цябе гэта не тычыцца.

— Які такі дакумент? Калі ёсць, прад'яві.

Ванда падала цяжкую валізу:

— Патрымай, Сямён. І чаму ты мне не верыш?

Міхайлаў не чакаў такога нахабства, таму і ўзяў багаж.

— Не ўспомню, куды паклала.

— Ну-ну, пашукай. Я адразу адчуў, нячыста ў вас. Пся кроў. Здраднікі.

— Ты што? — прашаптала Ванда, паглядзела на чорны цягнік, які спыніўся амаль побач з імі.

— Можаш і не шукаць. Няма ў цябе, Мятліцкая, ніякага дакумента. Не дуры галавы. Усе паедуць, а ты застанешся. І валіза твая мне нахрэн трэба, — ён кінуў багаж на платформу ў плыткую калюгу.

Засвістаў паравоз, даў сігнал. Міхайлаў не адводзіў позірку ад Ванды. Рукі Мятліцкай хаваліся ў чорнай футраной муфце, рыдыкюль вісеў на локці. У той момант, калі Міхайлаў сунуў правую руку ў кішэню па наган, Ванда крыкнула:

— Ёсць у мяне дакумент.

У чорнай адтуліне муфты бліснуў нікелем кароткі дамскі рэвальвер, прагучалі два стрэлы.

Міхайлаў стаяў і глядзеў, як сыходзіць Мятліцкая. Ён бачыў, як яна ступіла на прыступку другога вагона, павярнула да чэкіста бледны твар. Яму нават падалося, што Ванда здзекліва ўсміхнулася. Злева пад рэбрамі нясцерпна пякло, быццам туды ўвагналі выхаплены з горна шворан. Хуткая кроў лілася з раны, зацякала ў шырокія матроскія штаны, запраўленыя ў боты. Міхайлаў баяўся варухнуцца і крыкнуць, так яму балела.

— Стой, сука, — праз сілу вымавіў ён, апусціўся на калені і паваліўся тварам у плыткую брудную калюгу.

Ліцерны свістаў, пыхаў густой парай, чорным дымам, і паволі адпаўзаў ад перона.

*...я заўсёды верыла ў існаванне анёлаў, а ў гараскопы і розную варажбу не верыла ніколі. Мяне дзівіла, што мае сяброўкі кідаюцца да тэлевізара слухаць сівавалосага, гладка паголенага дзядзьку з пажадлівым позіркам, які на поўным сур'ёзе расказвае з экрана, што чакае скарпіёнаў, шаляў, рыб, панну... заўтра, на наступным тыдні, праз месяц, праз год… У кожнага ў жыцці бываюць такія перыяды, калі ўсё адно, чым займацца. Абы пры справе, абы табе грошы плацілі. Пасля таго, як сышла з турыстычнага часопіса, я амаль год адпрацавала на тэлевізіі — пісала тэксты гараскопаў для сівавалосага ідыёта-акцёра, што нават па-за студыяй не заўсёды здымаў шапачку магістра. Праз колькі месяцаў я зрабілася сапраўдным спецыялістам-астролагам. Спачатку сумленна складала гараскопы па мудрагелістых кніжках псеўдавучоных. Маўляў, Марс у сёмым доме, экліптыка Венеры вось такая, а ў пятым доме Сатурн... ваш камень гранат віннага колеру, а колер сукенкі мусіць быць блакітным, дрэва ваша граб, кветка — рамонак звычайны альбо архідэя балотная... Цяжка, нудна, нецікава. Галава мая трашчала. Вось тады я і вынайшла свой сакрэтны рэцэпт хуткага прыгатавання пераканаўчых прадказанняў. Я згадвала сяброў, добрых знаёмых, сваякоў, суседзяў. Я ведала іх дні нараджэння, а самае галоўнае, ведала іх патаемныя жаданні. І калі які-небудзь «стралец» расказваў мне, што праз пару тыдняў купіць аўтамабіль, а нейкая «рыбіна» прызнавался, што зацяжарыла, я так і пісала. І ўсё здзяйснялася самым неверагодным чынам. Рэйтынг сівавалосага магістра-астролага так шугануў*

*угору, што ён ездзіў на запіс таксоўкай. Мне сталі плаціць шалёныя грошы. Сяброўкі і знаёмыя мне зайздросцілі. Пры ўсім гэтым я не верыла аніводнаму ўласнаручна напісанаму слову. Аднойчы, ад няма чаго рабіць, я склала сапраўдны гараскоп Станіслава Краеўскага і Ванды Мятліцкай. І спалохалася, сышлося ўсё, акром некаторых дэталяў. На наступным тыдні я звольнілася з тэлевізіі. І не стала тлумачыць сапраўднае прычыны…*

Ніколі раней Фасманскі не заўважаў, якая брудная кабінка ліфта ў пад’ездзе Ганны Мятліцкай. А цяпер ён нават пальчатку не зняў, калі націскаў прапаленую цыгарэтай, учарнелую кнопку. Гэтым разам хваляванне Алекса было зусім іншага кшталту. Прыкладна так ён пачуваўся, калі кіраваўся на дзелавую сустрэчу з банкірам, патэнцыйным інвестарам — з людзьмі, ад якіх залежаў яго бізнес.

Ён вагаўся, пазваніць у дзверы, ці не. Але падумаў, што для яго будзе лепш з’явіцца зусім нечакана. Часцей перамагае той, хто наносіць удар першым. Алекс павярнуў ключ у замку і ўвайшоў у кватэру. Адразу адчуў знаёмы водар французскіх духоў, менавіта тых, водар якіх яго хваляваў. Паглядзеў на раскладзеную канапу. Усё было да драбніц знаёмае: падушкі, грэцкі арнамент на махровых прасцінах. Аж сэрца сціснулася, і кроў прыліла да твару. З-за няшчыльна прычыненых дзвярэй ваннага пакоя даносіўся перарывісты шум вады, плёскат і задаволены смех. Так сябе паводзіць чалавек, калі застаецца сам-насам і ўпэўнены, што яго ніхто не бачыць і не чуе.

Алекс хацеў прысесці на край канапы і дачакацца, калі Ганна выйдзе з душу, але перадумаў. Ён паляпаў складзенымі пальчаткамі па рукаве скуранога паліто. Пад вусамі прамільгнула крыху садысцкая ўсмешка. Фасманскі зняў паліто і кінуў яго не на разабраную канапу, а на спінку крэсла, падышоў да ваннага пакоя і тройчы клацнуў выключальнікам.

Смех змоўк.

— Можа, хопіць, Фелікс? Я скора выйду.

Фасманскі адчыніў дзверы, зайшоў. Паміж Алексам і Ганнай заставалася паўпразрыстая цыратавая штора. Фасманскі разглядаў праз яе Ганну.

— Можаш не спяшацца, я пачакаю, — сказаў ён усхваляваным глыбокім голасам.

— Ну што, трапіў пад дождж? — данеслася з-за фіранкі, і вада перастала шумець.

Алекс рэзка адсунуў штору. Яны стаялі насупраць адно аднаго. Мужчына ў афіцыйным цёмна-шэрым строі пры гальштуку і абсалютна голая жанчына. На твары Ганны з’явіўся і застыў сполах. Яна памкнулася пацягнуць на сябе край шторы, але Фасманскі трымаў цырату моцна.

— Пусці! — загадала Ганна, колькі разоў тарганула, але зразумела, Алекс не адпусціць.

— А ты прыгожая, — прамовіў Фасманскі.

Яго позірк поўз па вільготным целе Ганны, быццам кіпенем абліваў.

— Я пагаварыць прыйшоў.

— Халат падай.

— А так, што — слабо? Раней мы з табой гэтак і гаварылі.

— Гэта раней, а цяпер усё інакш, — Ганна баялася зрабіць крок, бо такім чынам магла наблізіцца да Алекса. — Мне халодна, — сказала яна.

— А мне здаецца, што тут нават горача. Ажно распрануцца захацелася, — Алекс дастаў з кішэні пачак цыгарэт, запальнічку, прапанаваў Ганне. — Ну, тады, як сабе хочаш… — ён запаліў, зацягнуўся, выпусціў дым на Мятліцкую. — Ведаеш, Ганна, у мяне ёсць вельмі багатыя знаёмыя ў Германіі.

— Ну і што? — сказала Ганна.

— А можна я да цябе дакрануся? — Алекс спачатку выцягнуў руку, потым апусціў, ён, як зачараваны глядзеў на радзімку паміж грудзямі.

— Толькі паспрабуй, — Мятліцкая прыкрыла радзімку далонню.

— Ну, добра, не хочаш, як хочаш. Тады буду проста глядзець. Я не вялікі аматар стрыптызу, ты ж ведаеш, але на цябе палюбуюся. Ёсць на што.

Ганна адчувала сваю бездапаможнасць і безабароннасць. Пераступіць край ванны яна не магла, ведала, адразу трапіць у абдымкі. Прыкрывацца рукамі? Ну як ты прыкрыешся?

— Давай сваю цыгарэту, — папрасіла яна разгублена.

Алекс падаў запаленую цыгарэту. Ганна прыняла яе кончыкамі пальцаў, попел цёмным снегам пасыпаўся на бліскучую эмаль ванны.

— Табе не здаецца, што гэта нахабства — вось так уваліцца ў чужы дом, убіцца ў ванны пакой і не даць чалавеку апрануцца?

— Мне так прасцей.

— Чаго ты хочаш? Кажы і выбірайся.

— Я дапамагу вам вывезці і збыць карціну. Без мяне і маіх сувязей вам ніяк. Павінцяць. Няўжо не разумееш. Я і грошы змагу легалізаваць. А без мяне вам турма. Добра, калі замежная. А калі нашая, з гвалтам, баландой, пацукамі-прусакамі, ватоўкамі? Ну як, а?

— Якую карціну? — нервова зацягнулася Мятліцкая, у гэты момант яна нават забылася, што стаіць голая.

— Альбрэхт Дзюрэр, мастак нямецкага адраджэння… Няважна, калі ён нарадзіўся і памёр. Без мяне ў вас нічога не атрымаецца. Гарантую. І не трэба ўпарціцца. Грошы вялікія, усім хопіць.

Ганна спрабавала асэнсаваць пачутае. Не магла зразумець: адкуль, дзе, як? Адзінае, што прыходзіла ў галаву — Фелікс расказаў. Але паверыць у гэта яна не магла, зацята маўчала.

— Спалохалася. Аж мурашкі па скуры пабеглі, — Алекс дакрануўся пальцам да вільготнага жаночага пляча, яно было халоднае, як з каменю. — Пяцьдзесят працэнтаў мне, пяцьдзесят — вам. Фіфці-фіфці, Ганна Станіславаўна. Нічога асабістага, адно бізнес.

— Трыццаць і халат дай.

— Сорак.

— Добра, — Алекс узяў халат, які ляжаў на пральнай машыне, што ціха вуркатала, расправіў яго і накінуў на плечы Мятліцкай. — Што, я дарма вам грошай падкінуў на вышукі?

— Чорт! Ніякага альтруізму. Я спадзявалася, што гэта светлая памяць рухала вамі.

— Не ўсё так проста і светла ў гэтым жыцці.

— А цяпер, Аляксандр Францавіч, пакіньце ванны пакой.

— Разумею. Інтымная працэдура. Праз дзве хвіліны я вас чакаю, каб завяршыць перамовы. Кава, гарбата, «аква мінерале кон газ»?

— Пліз. Кава. І без цукру. Спадзяюся, паперы падпісваць не будзем.

— Лішняе! Словы бізнесмена, — з усмешкай кінуў Фасманскі.

Ганна зачыніла дзверы…

Праз паўгадзіны Алекс Фасманскі сышоў. Гэтым разам кабінка ліфта бруднай яму не падалася…

...Макс, які сядзеў у мікрааўтобусе, абсталяваным для праслухоўвання кватэры, прыціскаў навушнікі далонямі да галавы, да максімуму павялічваў гучнасць, ганяў запіс туды-сюды, але так і не зразумеў, пра якія працэнты спрачаліся Ганна Мятліцкая і вядомы беларускі бізнесовец Фасманскі.

Яго справаздачу Альшанскі выслухаў з каменным тварам.

— Вылюдкі, не здагадаліся жучкі паўсюль паставіць.

— Адкуль я ведаў, шэф, што яны статнуць справы ў ваннай вырашаць? Вада шуміць, дзверы зачыненыя.

— На чым, ты кажаш, сышліся?

— На сарака працэнтах.

— Сур'ёзны мужчына.

*...за два дні да паездкі ў Мсціслаў я склала свой гараскоп і гараскоп Фелікса. Я парвала дзве гэтыя старонкі на дробныя шматкі. Я спаліла іх у попельніцы. Я веру ў існаванне анёлаў...*

Ветэранаў Вялікай Айчыннай з прозвішчам Іваноў дваццаць пятага года нараджэння нямерана. Некалькі тысяч. Дапамагло пошукам рэдкае для Івановых імя — Карней. Такіх адшукалася дванаццаць чалавек. А з імем па бацьку Сільвестравіч адзін.

Напалову спаралізаваны былы гвардыі капітан Карней Сільвестравіч Іваноў дабіваў сваё жыццё сярод такіх жа небаракаў у доме для ветэранаў, куды яго, ганаровага грамадзяніна Смаленска, уладкавалі дзеці.

Стары чалавек у інваліднай калясцы не адразу і ўцяміў, хто такія Ганна Мятліцкая і Фелікс Рэй.

Санітарка выкаціла старога на тэрасу і пакінула з беларускімі журналістамі. Нарэшце ветэран загаварыў.

— Карней Сільвестравіч Іваноў мог загінуць разоў семнаццаць. Смерць праходзіла зусім побач. Як цяпер памятаю…

Ганна з Феліксам задаволена зірнулі адзін на аднаго. Гэта было тое, што трэба.

— Захварэў я на залатуху. Відаць і не ведаеце такой хваробы? Было мне тады два гады. Бацькі мае вырашылі — усё. Не жыць болей Карнейчыку на гэтым свеце. Маці плача, бацька плача. А бацькаў брат дзядзька Хведзя… Не сядзець жа, склаўшы рукі, і чакаць, зрабіў мне труну. А маленькі Карней Іваноў узяў, ды не памёр, выкараскаўся. Суседка мёдам і алеем кедравым мяне адкатала.

— Дык гэта ж даўно было, — сказаў Фелікс.

— У дваццаць сёмым, дакладна.

— Гэта цікава, вядома ж, Карней Сільвестравіч, але нас вайна больш цікавіць, — Ганна кранула руку ветэрана.

— Дык вось, пра вайну. Вяртаюся я пасля вайны ў пяцьдзясят другім. Гімнасцёрка на мне новая, пагоны капітанскія, боты хромавыя, партупея, медалі звіняць. Прыходжу да дзядзькі Хведзі. Па чарцы выпілі. А ён мне і кажа: «Хочаш, пляменнічак, я труну тваю пакажу». Я так спалохаўся, мову адняло, на вайне так не баяўся. Узяў ён мяне пад локаць і ў хлеў вядзе. А там свінні рохкаюць. Паказвае мне ночвы брудныя, свінямі пагрызеныя. Во, кажа, Карней, як труна твая прыдалася, не згрызлі яшчэ.

Ганна зразумела, што старому пагаварыць няма з кім, і будзе ён ім расказваць усё сваё жыццё ў падрабязнасцях. Выцягнула з партфеля ноўтбук, паставіла на калені ветэрану і паказала фотаздымак, той самы, зроблены Якавам Міхайлавічам Рэем у маёнтку барона фон Штайна.

Стары заміргаў, слёзы па шчоках пабеглі, ледзь камп'ютэр на падлогу не скінуў, сморкацца пачаў.

— Сокал — сяржант. А гэта Сярожка Мацкевіч. У Германіі здымак зроблены, гэта я вам скажу дакладна. І Сярожку тады немцы забілі, і сяржанта Сокала, і ўсіх нашых паклалі. А я жывы застаўся. Труну ж дзядзка Хведзя маленькую змайстраваў. Як у такую мяне пакласці? Вось смерць мяне і абмінула. А перад гэтым у сорак чацвёртым у немца пісталет заела. Дык я яго рыдлёўкай па чэрапе хрась, а пісталет сабе забраў. «Вальтэр», між іншым.

— А што за карціна такая была, на якой Мацкевіч сяржанта маляваў?

— Ат, не памятаю, што на ёй было. Там карцін тых, на кожнай сцяне, як у царкве абразоў. Потым я гэты партрэт жонцы сяржанта аддаў.

— Дзе яна вас знайшла?

— Яна? Гэта я яе адшукаў. Ведаў, што мы з Сокалам амаль землякі. Я з-пад Смаленска, ён з Мсціслава. Завёз — аддаў, пасядзелі — выпілі.

— А звалі яе як?

Стары засмяяўся:

— Прыгожае імя. Антанінай звалі. А нашто вам гэта? Можа, яе ўжо і на свеце няма?

— Гэты здымак яго дзед зрабіў, лейтэнант Рэй.

— А я гляджу, твар быццам знаёмы. А дзе бачыў, пазнаць не магу… Такі ж чарнявы і рухавы…

Яшчэ з гадзіну прасядзелі Ганна з Феліксам на тэрасе дома ветэранаў. Былы гвардыі капітан здолеў расказаць яшчэ пяць выпадкаў, калі напэўна мусіў загінуць. Але маленькая труна-ночвы скрозь выратоўвала салдата ад немінучай смерці самым таямнічым чынам. І сустрэчу з франтавым фотакарам у шпіталі ў прыгарадзе Берліна стары прыгадаў.

На дыктафончык у руках Ганны ветэран не глядзеў, як і не было прыборчыка, які фіксаваў кожнае прамоўленае слова, кожны ўздых.

*«...а што ж ты не патэлефанавала, Ганначка?» Вера Сяргееўна нават не здзівілася, калі мы з Феліксам забеглі да яе. Яна замітусілася, расчырванелася. Зноў на стале з'явіліся самаробныя прысмакі. Гаспадыня падалася ў спачывальню, каб разабраць нам ложак. Фелікс пайшоў з цыгарэтай на ганак. Пуховая пярына, падушкі-сумёты, карункі. Як мне хацелася тут застацца! Вера Сяргееўна ўзяла мяне за руку, паглядзела ў вочы: «А ты, дзеўка, цяжарная». Я не стала спрачацца. А гаспадыня ціха прамовіла: «Ён — тваё шчасце, трымайся яго». І я адказала: «Ведаю». Мы заплакалі. А Феліксу нічога не сказалі...*

Маленькі слоік закалаціўся ў турцы, забулькала вада. Шарпей вялікай лыжкай акуратна памяшаў кашу зеленкавата-няўежнага колеру, пакаштаваў, удаў, нібыта вельмі смачна. Маленькая Аліса сядзела ў дзіцячым крэселку. Яна забаўлялася тым, што адной лыжачкай бомкала па другой. Шарпей сеў насупраць дачкі, пасміхнуўся, і дзяўчынка ўсміхнулася ў адказ. Бацька ледзь стрымаўся, каб не заплакаць.

— Ну, добра, добра. Зараз будзем палуднаваць. Спачатку каша, потым сок. Не, я ж табе сказаў, каша спачатку.

Шарпей паправіў цыратавую сліняўку на грудзях у дачкі, набраў у лыжку кашы. Ён трымаў слоік у кулаку — каб ежа не так хутка стыла.

— Якая ж смаката, Аліса, — Шарпей аблізаў губы, — ну, паехалі.

Пасля трэцяй лыжкі ў дзверы пазванілі. Шарпей пайшоў адчыняць.

— Што гэта ў цябе? — спытаў вадзіцель Фасманскага Алег.

— Разувайся. Дачку кармлю. Не бачыш?

— А ты што на працу не з'явіўся?

— Мая ў паліклініку пайшла. А я з малой.

— Ты што, якая паліклініка? Алекс цябе падзярэ.

— А малую я на каго кіну? Чуеш, кліча ўжо. Гульня гульнёй, а сняданак па раскладзе.

Шарпей пайшоў на кухню. Глядзець, як саракатрохгадовы мужчына корміць гадавалае дзіця, Алегу не хацелася. Ён сеў на канапу ў пакоі і стаў чакаць. Праз чвэрць гадзіны з'явіўся і Шарпей з дачкой на руках. Дзіця ціскала бацькаў твар маленькімі ручкамі, хапала за нос, цягала за вушы, парола вочы. Шарпей шчасліва мружыўся і задаволена пасміхаўся.

— Ну і што, Алекс без мяне не абыдзецца? Ніяк?

— Абыдзецца. Толькі ці ты абыдзешся без яго.

— Не хвалюйся, Алег, абыдуся.

— Ён сказаў, што дапаможа табе з кватэрай.

— Мне і тут някепска.

— Я разумею, з маладой жонкай… Гэта ўсё пакуль. А калі дачка падрасце, што рабіць станеш?

— Я і так на Алекса папрацаваў. Мне вось яе гадаваць трэба.

Алег падняўся і сувора прамовіў:

— Слухай, Шарпей, калі ты абкураны-абсаджаны палонных афганцаў пастраляў, то хто цябе ад турмы ўратаваў? Што, не было, скажаш, такога? Забыўся, як Фасманскі тады па начальстве бегаў? Як ён следчых і пракурораў паіў? Не сябе ён тады ратаваў, не свае пагоны, а цябе, Шарпей, з турмы выцягваў.

— Не крычы, Алег, дзіця не палохай. Памятаю я ўсё. Скажы Алексу, заўтра буду. А сёння — ніяк. Сам бачыш. І не за кватэру прыбягу. А таму, што я сёння сярод ночы прахапіўся і згадаў.

— Так мне Алексу нічога не казаць? Заўтра будзеш?

— Я ж абяцаў.

Алег ціхенька тыцнуў у ружовую дзіцячую шчаку. Малая Аліска схапіла яго за ўказальны палец.

— Бачыш, дыятэз які пайшоў? Не ведаем ужо, чым і карміць.

— Папраўляйцеся. Бывайце.

Шарпей падышоў да акна з малой на руках.

— Давай, дзядзьку правядзём, — ён падняў Аліскіну ручку і памахаў.

Але Алег нават галавы не падняў, сеў у машыну і з’ехаў.

*...большасць спраў у жыцці чалавека застаюцца недаробленымі, не даведзенымі да ладу. Я так і не паспрабавала прабіць праз е-нет прозвішчы Пельш і Ліндэрган, адшукаць іх след у гэтым свеце, прасачыць лёсы. Збіралася, часам нават набірала іх прозвішчы, але спынялася і не націскала кнопку «пошук». Што мяне стрымлівала? Магчыма, баялася расчаравацца. Даведацца, што двух маўклівых і мужных латышскіх стралкоў перахапілі і забілі ў Рызе падасланыя чэкісты Дзяржынскага. А магчыма, параход, на якім яны плылі ў Амерыку, патануў. Ці яны маладымі загінулі там — за Атлантычным акіянам. Але мне хочацца верыць, што і Пельш, і Ліндэрган ацалелі, і ўсё ў іх склалася, як яны планавалі... Ажаніліся, у іх нарадзіліся дзеці, унукі, праўнукі. Анёл, ты ж ведаеш, скажы — я не памыляюся, у іх усё добра? Лепш, чым у мяне з Феліксам? Маўчыш...*

Альшанскі і Макс тры гадзіны запар гаманілі і пілі гарбату з Карнеем Івановым у кабінеце галоўурача «Дома ветэрана».

Былы гвардыі капітан паспеў расказаць усе тыя семнаццаць імгненняў свайго жыцця, у якія ён мусіў загінуць, але ацалеў самым неверагодным чынам. Цудоўнае шанцаванне Карней Сільвестравіч спісваў на кароценькую труну, якая была своечасова зроблена гаспадарлівым дзядзькам Хведзем.

Іваноў паказваў гасцям свае франтавыя фотаздымкі, а яны паказалі яму свой, зроблены фотакарам Якавам Рэем. Гэты здымак ветэрана не здзівіў абсалютна.

— І што гэта ўсе зацікавіліся сяржантам Сокалам і яго ўдавой? І вы, людзі ваенныя, і журналісты мінскія.

Альшанскі і Макс падрабязна распыталі пра журналістаў, пра іх пытанні, а галоўнае, пра адказы ветэрана.

— На жаль, доктар забараніў вам выпіць з намі, то частуйцеся цукеркамі.

— Я сваё адпіў, а вось цукерачку пасмакчу.

Макс разадраў тонкі празрысты цэлафан і падсунуў да ветэрана невялікую кардонку шакаладнага асарці. Як і ўсе старыя людзі, Карней Сільвестравіч любіў салодкае.

Альшанскі з Максам з’елі толькі па адной — па круглай, прысыпанай арэхамі. А ветэран Вялікай Айчыннай — аж пяць штук. Развіталіся Альшанскі з Карнеем Сільвестравічам, як сапраўдныя франтавыя сябры. Гвардыі-капітан пажадаў Альшанскаму поспехаў у службе. А сівавалосы інтэрполавец — моцнага здароўя і доўгіх гадоў жыцця.

Блага Карнею Сільвестравічу Іванову зрабілася на наступны дзень у сталоўцы. Спачатку на стол сыпануўся цукар, дзынькнула на падлогу алюмініевая лыжачка, потым кульнуўся і паляцеў кубак з недасалоджаным кампотам. Ветэран каратка ўскрыкнуў, двойчы хапануў паветра бяззубым ротам, узмахнуў рукамі, і яго сэрца перастала біцца, раптоўна спынілася.

І Альшанскі, і Макс з Маратам ведалі, што так здарыцца менавіта ў той дзень, хоць і былі яны ўжо ў Мсціславе.

Смерць імгненна абвастрыла і памаладзіла профіль нябожчыка.

Нават калі б і трапіў ганаровы грамадзянін Смаленска на халодны жалезны стол да паталагаанатама, нават калі б і зрабілі ўсе даследаванні, то ніводнае не паказала б, што ў арганізме знаходзілася атрута. Менавіта яна і спыніла сэрца. Дзеці і ўнукі далі згоду на крэмацыю дзеда-ветэрана, каб асабліва не напружвацца з пахавальнымі працэдурамі.

*...і ў мамы была радзімая плямка паміж грудзямі. Карычневая, як кропелька расплаўленага шакаладу. І ў мяне такая самая. Мама не дазваляла мне дакранацца да яе. Цяпер я разумею, чаму. Я толькі Феліксу расказала пра таемную кнопку. Варта пацалаваць, альбо ціхенька дакрануцца да яе, як я пачынаю «плыць», губляю над сабой кантроль, і тады ўжо не спыніцца. Яна — пускавы механізм майго арганізма. Ніхто з маіх мужчын, што былі да Фелікса, пра маю таямніцу не ведаў...*

**Медсястра Анжэла з дазволу рэаніматолага прынесла ў палату газеты, рассунула белыя шторы, села пры акне і пачала чытаць. Як і ўсіх жанчын з нешчаслівым лёсам, яе пераважна цікавілі плёткі з жыцця кіназорак і спевакоў. А тут у газеце была цэлая разгортка з фотаздымкамі і інтэрв'ю.**

**«Жывуць жа людзі цікавым жыццём», — падумала трыццаціпяцігадовая, заўчасна распаўнелая медсястра, якая пра фітнэс і салярый ведала адно з рэкламы.**

**Раптам газета перастала шамацець у руках Анжэлы. Яна павярнула галаву, уважліва паглядзела на хворую, адклала газету на падаконне і ціхенька падышла да ложка. Вейкі Ганны затрымцелі, вочы расплюшчыліся.**

**— Дзе я? — варухнуліся бяскроўныя вусны.**

**Анжэла войкнула, прыклала далонь да свайго роту:**

**— Ціха, а мая ты харошая.**

**— Дзе я? — паўтарыла Мятліцкая.**

**— Ажыла, — спалохана прамовіла медсястра.**

**— Ты хто? Не магу пазнаць. Усё плыве.**

**— Ціха, ціха, я Анжэла, медсястра рэанімацыйнага аддзялення.**

**— Фелікс дзе? — тарганулася Ганна, спрабуючы адарваць галаву ад падушкі.**

**— Ляжы. Можа, дзякуй Богу, усё і абыдзецца?**

**— Ты Анжэла. А Фелікс дзе? Чаму маўчыш?**

**— Пачакаеш крышку? Я табе тады ўсё і раскажу, — прашаптала Анжэла і адступілася на крок ад ложка.**

**— Пачакаю, — вочы Мятліцкай нязрушна глядзелі ў белую роўнядзь столі.**

**На дыбачках, нячутна Анжэла выслізнула з палаты і амаль пабегла доўгім бальнічным калідорам.**

**— Доктар дзе? — яна ўляцела ў кабінет.**

**Там побач са сталом з запаленай цыгарэтай у пальцах сядзеў Альшанскі. Перад ім паблісквала пляскатая аптэчная шклянка з недапалкам.**

**— Што здарылася?**

**— Дзе доктар?**

**Не паспела Анжэла адказаць, як Альшанскі падхапіўся ўжо, выскачыў з дзвярэй. Медсястра кінулася следам. Яшчэ на калідоры яны пачулі грукат і звон разбітага шкла.**

**Альшанскі ірвануў дзверы палаты. Белыя шторы на акне надзьмуліся вялізнымі пухірамі. Мятліцкая стаяла каленьмі на падаконні, трымалася за адчыненую фрамугу, а другой рукой упіралася ў шкло.**

**— Фелікс, Фелікс… — нямоцна гукала Ганна.**

**Альшанскі са сполахам на твары пераступіў перакулены штатыў кропельніцы, аблытаны трубачкай катэтара, наблізіўся да Мятліцкай, абхапіў яе за плечы, паставіў перад сабой. Медсястра адразу ж зачыніла акно, павярнула ручкі.**

**Ганна адхінулася ад Альшанскага.**

**— Фелікс?**

**Альшанскі згодна хітнуў.**

**— Фелікс, — узрадавана прашаптала Мятліцкая і правяла далонню па твары сівавалосага мужчыны. — Што з табой сталася?**

**Альшанскі перасмыкнуў плячыма і сувора зірнуў на медсястру, каб не падавала голасу.**

**— Што ты маўчыш? — пальцы схаваліся ў мяккіх сівых валасах, — ты пастарэў, Фелікс. І нарэшце пагаліўся. Для мяне, ці для яе? Чаму яна ўвесь час побач са мной?**

**Альшанскі маўчаў. Ён разумеў, што да разгадкі зусім блізка і трымаў паўзу, як сапраўдны акцёр.**

**— Слабасць у мяне нейкая, — прамовіла Ганна. — Давай, паедзем адсюль. Толькі весці будзеш ты. А я сяду побач. У мяне і ў вачах усё плыве, не магу кіраваць — разаб'ёмся.**

**Альшанскі ўзяў Мятліцкую за локаць і ціха-ціха прамовіў:**

**— Куды ехаць?**

**Ганна ўсміхнулася:**

**— Ты, хіба, забыўся?.. У Аргенціну.**

**Альшанскі не прыдумаў нічога лепшага, як крыху сціснуць руку Ганны. З ранкі, што засталася ад голкі, пабегла кроў. Яна кропнула на падлогу.**

**— Ой, — ускрыкнула Анжэла, — кроў!**

**Твар Ганны зшарэў, зрэнкі перасталі пульсаваць. Яна страціла прытомнасць і, каб Альшанскі з Анжэлай не падтрымалі яе, абсела б на падлогу.**

**— Доктара! Хутчэй давай! Што стала?! — прасычэў сівавалосы інтэрполавец.**

***Заканчэнне ў наступным нумары.***

Максім КЛІМКОВІЧ, Уладзімір СЦЯПАН

# ЦЕНЬ АНЁЛА*

## *Раман*

### ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

**— На ложак яе трэба, памажыце, — крыкнула медсястра.**

**Разам з Альшанскім яна перанесла Ганну на высокі ложак.**

**— Я пастаўлю кропельніцу. А вы па доктара.**

**Альшанскі хвіліну вагаўся. Магчыма б, ён застаўся, але ў кішэні плашча затрэнькаў мабільнік. Сівавалосы выхапіў трубку, глянуў на дысплейчык, незадаволена скрывіўся, націснуў кнопку і хутка выйшаў з палаты.**

**Анжэла пачула, як сівавалосы прывітаўся па-нямецку. Гэта было адзінае, што яна зразумела з усёй размовы. І крокі, і голас Альшанскага хутка аддаляліся.**

**Барон фон Штайн быў незадаволены — высілкі Альшанскага дагэтуль не далі чаканага выніку. Пра тое, што Мятліцкая на кароткі час вярнулася да свядомасці, інтэрполавец змаўчаў. Але запэўніў барона, што неўзабаве абяцанае выканае, і той можа не пераймацца.**

**Ганна расплюшчыла вочы і, гледзячы ў столь, ледзь чутна трызніла. Анжэла падтрымлівала яе галаву.**

**— Супакойся, супакойся. Пра які такі рай ты гаворыш? У бальніцы мы, мілая, у бальніцы. Чуеш?**

*...свята ўпэўнена: не цвёрда-каменным яблыкам спакусіла Ева Адама, а мякка-цёплай і вязкай хурмой. Гэты залаты і падатлівы райскі плод — сапраўднае ўвасабленне эротыкі. Толькі хурма вымагае, каб яе елі на адзіноце...*

Партрэт гвардыі сяржанта Сокала, абгорнуты мясцовай газетай і запакаваны ў вялікія чорныя пакеты для смецця, ужо ляжаў у багажніку опеля, прыкрыты рыфлёным гумовым дыванком. Паверх карціны Фелікс паклаў «запаску» і аварыйны знак-трохкутнік.

Машына стаяла перад аўтавакзалам. Фелікс пабег па мінералку. З кожным днём таксікоз рабіўся ўсё больш невыносным. Ганне то раптам хацелася піць, і тады рот запаўняла вязкая сліна, не пракаўтнуць, то нечакана пачынала круціцца галава. І тады рэальнасць расплывалася, набывала неверагодна яркія «хімічныя» колеры. А Фелікс лічыў, што гэта наступствы хвалявання, недасыпання.

Ганна апусціла шкло, але ўсё адно паветра не ставала. Яна выйшла з машыны, абаперлася на багажнік, паглядзела ў нізкае восеньскае неба, прасачыла позіркам голуба, які апусціўся побач са стракатымі шапікамі. З чатырох працаваў толькі адзін, перад ім расцягнулася чарга. Фелікс стаяў перадапошнім. І тут Ганна сутыкнулася позіркам з няголеным мужчынам у чорнай бейсболцы, які выглядаў яе з-за шапіка. Забінтаваная левая рука бязвольна вісела, правая камячыла грошы.

---

* Заканчэнне. Пачатак у № 1, 2.

Мятліцкая спалохалася, яна імгненна згадала, дзе бачыла яго раней. Гэта быў адзін з «афганцаў» — баявых таварышаў Фасманскага. У пямяці ўсплыло нават тое, як клікаў яго Алекс — Шарпей. Выпадковай такая сустрэча быць не магла. З'яўленне ў Мсціславе чалавека Фасманскага не абяцала для яе з Феліксам нічога добрага.

Шарпей абмінуў чаргу, азірнуўся па баках і рашуча скіраваўся да Ганны.

— Не бойся, — адразу ж сказаў ён.

— А я і не баюся, — схлусіла Мятліцкая.

— Чаго тады такая зялёная? Атруцілася?

— Галава круціцца, — прызналася Ганна. — Табе Алекс загадаў сачыць за мной? Каб не збегла?

— Алекс больш нічога нікому не загадае, — скрушна прамовіў Шарпей. — Ён мне грошы на кватэру даў, — і з недаверам зірнуў Ганне ў вочы. — Ці ты тэлевізар не глядзіш?

— Што, Фасманскага арыштавалі?

— Горш, забілі яго.

— Кінь, гэтага не можа быць. За што?

— За Дзюрэра. І Алекса, і майго сябра Андрэя, ты ж яго ведаеш. А мяне не змаглі. Пашанцавала. Вось, адно руку пашкодзіў. Але гэта нічога, пальцы згінаюцца.

Шарпей падняў забінтаваную руку, і яго ўказальны палец двойчы сагнуўся, нібыта на курок ціскаў.

— Хто? — спытала Ганна.

— Відаць, сама здагадваешся.

Мятліцкая адмоўна хітнула.

З бутэлькай мінералкі падбег Фелікс:

— Што здарылася?

— Пачакай, Фелікс, Фасманскага забілі, — Ганна адкруціла накрыўку і глынула прахалоднай вады.

— Яны і вас заб'юць, ім карціна трэба, — Шарпей правёў указальным пальцам па багажніку опеля.

— Каму ім? — насцярожыўся Фелікс.

— Упэўнены, скора яны будуць тут. Магу вам даць адну параду. Кідайце ўсё. Звальвайце адсюль, уцякайце.

— Куды?

Шарпей паціснуў шырокімі плячыма:

— І яшчэ — тэлефонамі не карыстайцеся. Але, думаю, што ўжо позна, яны вас вылічылі. Калі карціна ў вас, яны не адчэпяцца. Заб'юць.

— Дык хто яны такія? — спытала Ганна.

— Адно ведаю, не бандыты і не ўлада, але людзі яны сістэмныя. Кіруе імі сівавалосы такі, салідны. Мяркую, з нейкай спецслужбы.

— Паслухайце, а навошта вы нам усё гэта расказваеце? — насцярожылася Ганна. — Вам з гэтага што? Падазроны гуманізм.

— Я вашых размоў наслухаўся. Сам быў маладым. І стала мне вас шкада. А іх — не шкада. Яму чалавека забіць, як пад ногі плюнуць, — Шарпей дастаў з кішэні фотаздымак і паказаў Ганне.

— Я яго не ведаю, — адказала Ганна, гледзячы на выяву сівавалосага мужчыны. — Калі забілі Алекса?

— Заўчора. А Андрэя ўчора.

— І Андрэя? — здзівілася Ганна, быццам гэтага не магло быць таму, што не магло ніколі быць.

— І яго.

— У нас няма карціны, — сказаў Фелікс.

— Валіце адсюль, і як мага хутчэй, калі жыць хочаце, — Шарпей нацягнуў брылёк на вочы, сунуў правую руку ў кішэню і пайшоў на аўтастанцыю, нібыта сабраўся з'язджаць з горада.

***...«Сан Мігель», «Сан Мігель». Якая гучная назва для карабля. Ты чуеш, што я кажу? Так павялося ўжо, людзі любяць даваць караблям імёны святых, багоў, герояў, каханых, любімых, быццам гэта здольна аберагчы. Караблёў з назвай «Сан Мігель» я налічыла ў тагачасных рэестрах страхавых кампаній колькі дзесяткаў. Але толькі адзін з іх выйшаў з Гданьскага порта 5 студзеня 1924 года. Гандлёва-пасажырскі параход меў чатыры тысячы васемсот сорак тон водазмяшчэння і належаў аргенцінскай гандлёвай кампаніі братоў Хіменас. Уначы 7 студзеня «Сан Мігель» наскочыў на старую нямецкую якарную міну ў сарака марскіх мілях на паўднёвы захад ад шведскага горада Гётэборг. Вада была халоднай. З трыццаці дзевяці чалавек каманды і васемнаццаці пасажыраў ніхто не ўратаваўся. Я адшукала гэтае трагічнае паведамленне ў «Варшаўскім кур'еры». На пажоўклай ад часу крохкай газетнай паперы чарнела жалобная рамка, а ў ёй — спіс польскіх грамадзян, якія знаходзіліся на параходзе. Знаёмых прозвішчаў сярод ахвяр марской трагедыі я не знайшла. Іх і не магло там быць, бо Станіслаў Краеўскі перад ад'ездам з Варшавы здолеў выправіць сабе і Вандзе новыя дакументы. Я не веру, што гэта выпадковасць. Адкуль у праліве ўзялася тая страшная міна часоў Першай сусветнай вайны? Ты хочаш сказаць мне, што гэта плынь сарвала яе з якара і кінула пад «Сан Мігель»?..*

Паравоз даў моцны гудок, пыхнуў густой парай. Берлінскі цягнік таргануўся, бразнуў, пасажыры махалі з вокнаў, дасылалі паветраныя пацалункі. Па пероне за паравозам бег задыханы камендант Беларуска-Балтыйскага вакзала.

— Стой, маць тваю! Куды?! — ён ускочыў на прыступку, замалаціў рукаяткай нагана ў ніз жалезных дзверцаў.

Памочнік машыніста высунуўся ў акно.

— Што такое? — крыкнуў хлопец.

— Стоп машына!

Заскрыгаталі тармазы, цягнік спыніўся. Камендант вакзала саскочыў на перон.

— Без майго дазволу не ехаць! — загадаў ён машыністу і выцер успатнелы твар.

Па пероне крочыў Дзяржынскі: доўгі незашпілены шынель, фуражка, высокія боты, завостраны ад хваробаў і бяссоння твар. Па пероне нёсся спалоханы шэпт:

— Глядзіце...

— Дзяржынскі, Дзяржынскі...

І зусім ужо ціха:

— Злыдзень. Некага браць прыехалі.

Паперадзе Фелікса Эдмундавіча беглі двое чэкістаў у кароткіх скуранках, з наганамі ў руках. Яшчэ трое паспяшалі следам. Людзі, хто стаяў на пероне, шугаліся ў бакі. Пасажыры пульманаўскіх вагонаў спалохана пазіралі на гэтае шэсце.

— Адчыняй, ЧК! Аглух? Заснуў? — грукнуў у шкло дыпламатычнага вагона раз'ятраны чэкіст.

Дзверы адчыніліся. Немалады мужчына ў форме чыгуначніка спалохана міргаў і прыцiскаў фуражку да грудзей.

Дзяржынскі падняўся ў дыпламатычны вагон. Спыніўся перад зачыненымі дзверцамі купэ, тройчы пагрукаў:

— Свае, Вацлаў, адчыняй!

Шчоўкнуў замок. Дзверцы крыху адсунуліся. На бледным твары маладога мужчыны паблісквала шкельцамі пенснэ.

— Фелікс Эдмундавіч? — разгублена прамовіў дыпламат і апусціў кароткі бельгійскі рэвальвер-бульдог.

— Не па тваю душу, — Дзяржінскі ўвайшоў у купэ, правёў далонню па абцягнутай барвовым аксамітам канапе, глянуў спачатку на жонку дыпламата, а потым на бялявага хлопчыка, яны пасунуліся да самага акна, — выбачайце, што затрымаць давялося. Колькі табе ўжо?

— Дзесяць яму споўнілася, — адказаў Вацлаў.

Фелікс Эдмундавіч ускудлаціў хлопчыку валасы:

— Рыхтык, бацька. Вучыцца хоць добра?

— Стараецца, — азвалася жанчына.

— Ну тады пагуляйце крыху, пакуль дарослыя свае справы вырашаць.

Жанчына і хлопчык выйшлі на калідор.

— Што стаіш, як саляны слуп? Сядай, — прапанаваў Дзяржынскі і сам сеў на мяккую канапу, паклаў побач фуражку, пацёр далонямі твар. — І калі я нарэшце высплюся? — прамовіў ціха. — Дзеці — гэта нашае ўсё. Бачыў, колькі іх па Маскве беспрытульных бегае? Нават паесці чаго не маюць.

Позірк Дзяржынскага ўпёрся ў разгорнутую шакаладку на століку. Вацлаў сядзеў, паклаўшы рукі на калені.

— У мяне да цябе асабістае даручэнне, — Фелікс Эдмундавіч паклаў перад супрацоўнікам савецкай дыпламатычнай місіі ў Варшаве фотаздымак.

— Станіслаў Краеўскі, былы наш супрацоўнік. Знаёмы твар?

— Першы раз бачу.

— Гэта няважна, — сказаў Дзяржынскі, — я моцна ў ім памыліўся. Яго вярнуць трэба. А як не атрымаецца, ліквідаваць. Апошні раз Краеўскага бачылі ў Вільні, кіраваўся нібыта да Варшавы. Гэта было два тыдні таму.

— Дакладная інфармацыя? — дыпламат разглядаў выяву Краеўскага.

— Абсалютна.

— Ён што, здрадзіў?

— Горш. Абрабаваў беспрытульных дзяцей.

— Зразумела, — дыпламат схаваў фотаздымак у кішэню пінжака.

— З ім могуць быць два латышы і жанчына. Маладая і прыгожая. Але шкадаваць іх не трэба. Усе яны ворагі.

— У мяне ёсць надзейныя людзі.

— Дакладаць будзеш асабіста мне. Зрабіць гэта трэба як мага хутчэй. Пакуль яны далей не збеглі. А сыну скажы, каб вучыўся, стараўся. Нам патрэбны не проста адданыя справе, але і адукаваныя, — Дзяржынскі падняўся.

І дыпламат падхапіўся.

— Шчаслівай дарогі, Вацлаў, праводзіць мяне не трэба. Не паненка.

Дзяржынскі ў атачэнні сваіх людзей няспешна ішоў па пероне. На яго вуснах блукала стомленая ўсмешка. Ён разумеў, што ягоны загад будзе выкананы.

Ніхто з чэкістаў не здагадаўся махнуць рукой каменданту Беларуска-Балтыйскага вакзала, ніхто з іх нават не азірнуўся на яго.

— Пайшоў! На перагоне дабярэш! — крыкнуў машыністу цягніка камендант і саскочыў з падножкі паравоза.

Два моцныя гудкі скаланулі паветра. Засіпела пара, цягнік таргануўся і павольна рушыў па мокрых бліскучых рэйках.

*...Як сталася так, што я ніколі не была на магіле Станіслава Краеўскага? Цікава, захаваўся помнік, пра які расказвала бабуля? Вялікі шэры камень з выбітым на ім крыжам... Заўсёды ведала, калі і нараджу дзіця, то толькі ад таго, каго пакахаю. Але ніколі не думала, як назаву. Так, так... Калі хлопчык, то Станіслаў. Калі дзяўчынка, то Ванда. Упэўнена, Фелікс супраць не будзе. «Фелікс, табе падабаецца, што твайго сына будуць зваць Станіслаў?..»*

**Нарэшце Альшанскі вярнуўся з доктарам. Анжэла трымала Ганну за руку. Медсястра прыклала палец да вуснаў:**

**— Усё ўжо добра. Заснула.**

**Рэаніматолаг паглядзеў на Альшанскага. Той знізаў плячыма і сказаў:**

**— Самі разумееце. То ляжала без руху, як нябожчыца. А тут падхапілася, да акна кінулася.**

**— Мяркую, горшае мінула. Я пайшоў, у мяне пацыент пад наркозам. Хвілін праз трыццаць вызвалюся.**

**— Ідзіце, — дазволіў Альшанскі.**

**Анжэла зачыніла акно, ціхенька паклікала інтэрполаўца.**

**— Я вам вось што скажу, — зашаптала яна, — толькі не тут, — Анжэла ўзяла Альшанскага пад руку і вывела з палаты.**

**— Яна яшчэ нешта сказала? — прымружыўся сівавалосы.**

**Медсястра хітнула.**

**— Што менавіта? — прагучала асцярожнае.**

**— А вы доктару не раскажаце? — пачырванела медсястра.**

**— Навошта ж так?**

**— А што мне за гэта будзе?**

**Альшанскі пасміхнуўся. Ён лёгка прачытаў у вачах Анжэлы патаемныя жаданні пакінутай мужам жанчыны. Ёй хацелася лёгка-хутка зарабіць. І інтэрполавец мог дапамагчы немудрагелістаму жаданню здзейсніцца. Ён асцярожна выцягнуў з кішэні тоўсты чорны партманет з залатымі вугалкамі, паляпаў ім па далоні.**

**— Я разумею. Слухаю.**

**А праз хвіліну Альшанскі ўжо бег па калідоры. Анжэла, угнуўшы галаў, шамацела банкнотамі, глядзела на іх і шаптала:**

**— Ну во, ён жа так прасіў ровар... Тры зарплаты.**

**Медсястра адвярнула да сцяны збялелы твар і схавала грошы ў станік. Ёй было не па сабе, быццам тыя грошы яна скрала. Але тут жа ўявіла, як узрадуецца яе Косцік і імгненна супакоілася, абцягнула халат.**

**Ганна спала, па катэтары ў вену няспешна сцякала празрыстая вадкасць. Анжэла падышла да акна, пачала ціха ссоўваць шторы. Яе рука на нейкае імгненне затрымалася. Праз бальнічны двор да чорнага мікрааўтобуса бег сівавалосы. Бакавыя дзверцы ад’ехалі. Мужчына спрытна заскочыў усярэдзіну, і машына паляцела да брамы.**

**— А і нічога, — сама сабе прамовіла Анжэла. — Я ж іх не ўкрала.**

**На павароце Альшанскі прытрымаўся за спінку пярэдняга сядзення:**

**— Вуліца Куляшова, дваннаццаць. Гэта за касцёлам.**

**— Прыкладна ведаю, — адказаў Марат, выварочваючы руль.**

**Макс глядзеў на шэфа, па вачах Альшанскага ён ужо зразумеў, адбылося нешта важнае.**

**— А што там, шэф? — пацікавіўся Марат.**

**— Дамок, а ў ім жанчына, якая можа нам дапамагчы.**

**— Прыгожая? — засмяяўся Макс.**

**— Не ўпэўнены, мяркую, у гадах.**

*...а гэта праўда, што мора з’явілася раней за анёлаў?.. Мне было чатыры гады. Я ляжала хворая. І ўсё не адпускала ад сябе бабулю, а ёй трэба было адысціся ў краму. Я ж баялася застацца адна. І тады баба Стася дала мне вялікую ракавіну. Глыбокую, слізка-ружовую ўсярэдзіне і шурпата-рудую звонку. Тая ракавіна была падобная да нетутэйшай кветкі. Але самае галоўнае, у гэтай каменнай кветцы жыло мора. Я не адразу паверыла. А бабуля сказала, каб я маўчала, заплюшчыла вочы і слухала. Я так і зрабіла. Тая ракавіна падалася мне жывой, чароўнай. Яна хавала ў сабе тысячы гукаў: плёскат хваляў, пошум ветру, шоргат каменьчыкаў... Самым дзіўным было тое, што кожнага разу, як я падносіла ракавіну да вуха, мора было іншым. То ціхім і ласкавым, то пагрозлівым. І ніколі голас мора не быў надакучлівым. Я прыкладала яе да аднаго вуха, да другога, зазірала ўсярэдзіну, засоўвала палец у коўзкую ружовую глыбіню. І не магла зразумець, як атрымліваецца, што ў пустой ракавіне жывуць вада і вецер. А больш за ўсё дзівілася, што я не магу іх убачыць, толькі чую. Доўга, можа, цэлы год,*

*я бавілася з той ракавінкай, пазабылася на плюшавага мядзведзіка, закінула лялек, алоўкі, паперу і нажніцы. Я засынала і прачыналася з ёй. А потым, калі нарэшце пабачыла сапраўднае мора, то мы з ім ужо былі добра знаёмыя. Відаць, у плёскаце хваляў я заўсёды чула мару маіх продкаў, якія хацелі жыць на беразе цёплага акіяна. І я хачу да вады, да мора, і каб мы былі ўтраіх: я, Фелікс і нашае дзіця. Ты чуеш? Пакінь мне гэтую мару, не забірай яе. Мы ж нікому не зрабілі ліхога...*

Светлафор на скрыжаванні заміргаў зялёным. Фелікс скінуў хуткасць.

— Нашто спыняешся? Праскочылі б, — упэўнена заўважыла Ганна і зрабіла глыток вады.

— Я не люблю парушаць правілы. Ды й ніхто за намі не гоніцца. Мой дзед аднойчы вылічыў і прадэманстраваў мне, што, калі ехаць праз увесь Мінск з захаду на ўсход і нідзе не парушаць правілы, то набягае ўсяго тры «лішнія» хвіліны дарогі.

Опель спыніўся за метр да «зебры» абсалютна пустога скрыжавання.

— А я не люблю стаяць, калі можна ехаць, — запярэчыла Мятліцкая.

— Раблю выснову — ты вадзіцель у першым пакаленні.

— Лагічна.

— Цікава, а нашыя дзеці будуць лічыцца вадзіцелямі ў якім пакаленні?

— У другім з паловай, — сказаў Фелікс.

Ганна глядзела на светлафор, і ледзь ён міргнуў жоўтым, ляпнула далонню па прыборнай панелі:

— Паехалі. А то і да ночы ў Мінск не заедзем.

Фелікс равёў рычаг хуткасці. Жахліва храбуснулі шасцерні, машына тарганулася, штуршкамі выкацілася на сярэдзіну скрыжавання і мёртва стала.

— Адразу бачна вадзіцеля ў трэцім пакаленні, — помсліва нагадала Ганна.

Рухавік маўчаў. Фелікс спрабаваў зрушыць рычаг каробкі перадач:

— Заклініў.

— Больш за руль маёй машыны не сядзеш.

Вайсковы грузавік з кунгам паволі абмінуў опель і пасунуўся па сваіх справах. Доўгія чарацiны антэн бязладна хісталіся.

— Чаму так? Як беднаму жаніцца, то і ноч кароткая, — Ганна адшпіліла рэмень бяспекі, — я пажартавала. Сварыцца мы не будзем.

Фелікс выбраўся з машыны, дастаў з багажніка аварыйны трохкутнік і задумаўся. Машына стаяла акурат пасярэдзіне скрыжавання, пагроза магла ўзнікнуць з любога боку. Мятліцкая паляпала па даху:

— Стаўляй наверх. Здалёк будзе відаць.

— Табе весела?

— А што, плакаць цяпер? Цяжкасці і перашкоды альбо яднаюць маладую сям'ю, альбо разбураюць.

Навюткі міліцэйскі уазік спыніўся за опелем. За рулём сядзеў сяржант, побач з ім пасміхаўся чырванатвары маёр Маліноўскі.

— А вось і міліцыя. Чуеш, патомны вадзіцель, у цябе хоць правы ёсць?

— Не смешна.

Маёр нетаропка выбраўся з уаза:

— Ну што, мінчане, праблемы?

— Ды, ужо ж... — Фелікс так і стаяў з аварыйным трохкутнікам у руках.

— Добры дзень, а мы журналісты, таварыш маёр, — прафесійна падключылася Ганна.

Маёр зазірнуў у салон, таргануў рычаг:

— Ха... не жартам захрас. З тэлевізіі, ці з газеты?

— Ён фотакар, я журналістка. З камандзіроўкі вяртаемся.

— Сяржант, дапамажы журналістам сталічным.

Фелікс разам з сяржантам выкацілі опель за скрыжаванне.

Маёр Маліноўскі, які паспеў абмаляваць гаваркой журналістцы аператыўную абстаноўку ў горадзе, выцягнуў з кішэні мабільнік, патлумачыў:

— Калі я асабіста патэлефаную механіку, шмат з вас не возьме і зробіць сумленна.

Маёр дамовіўся з нейкім Паўлам, пажадаў гасцям Мсціслава поспехаў, пакінуў Ганне візітоўку і з'ехаў. А праз чвэрць гадзіны з'явіўся Павел — злосны, няголены, у брудным камбінезоне.

— Ды тут працы! — вызначыўся ён, — а ў мяне заказ тэрміновы. Камерсант свой мерс лупаты прыгнаў.

— Мы добра заплацім. Толькі зрабіце хутчэй.

— Тут ужо як атрымаецца, — Павел замацаваў трос пад бамперам опеля. — А вы за руль сядайце, — звярнуўся ён да Фелікса. — Каб я на мінулым тыдні добра паддатым у ментуру не трапіў, хрэн бы за вашу машыну ўзяўся. Пляменніка ў войска выпраўлялі.

Ганна з карцінай, загорнутай у газету і пакеты для смецця, села да Паўла ў цесную кабіну грузавічка.

Трос напяўся, і даўно нямыты грузавічок павалок опель да майстэрні. Павел тыцнуў пальцам у скрэмзаную лічбамі паперку, якую да панелі прыцiскаў магніт:

— Тэлефончык свой пакіньце. Як зраблю, адразу і блямкну.

Ганна напісала свой нумар.

— І калі тое здарыцца?

— Хто ж вам скажа! Сёння. Гэта ж механізм.

Майстэрня мсціслаўскага аўтамеханіка месцілася непадалёк ад аўтавакзала ў двары прыватнага недабудаванага дома.

*...стаяла халодная імжыстая восень з ранішнімі туманамі. І настрой быў тужлівы, як пасля пахавання. Алекс спытаў, чаму я такая сумная? Я падумала і адказала, што хачу да мора. Ён моўчкі развярнуў сваю машыну пасярод вуліцы, праскочыў на жоўтае святло, і мы паімчалі з праспекта за паўночны захад. Тралейбусы і аўтобусы мільгацелі за мокрым шклом. Алекс маўчаў, а я не пыталася, куды мы так ляцім. Мінулі горад. Пачаліся зялёныя палі, рудыя ўзлескі... Алекс адключыў свой тэлефон, які настойліва блямкаў. Ён спыніў машыну на доўгай грэблі. Вада злівалася з даляглядам, ці гэта даляглгяд распускаўся ў ёй? Яна была шэрая і спакойная, як застылы свінец. «Ты хацела мора? Гэта бліжэйшае». Я выйшла з машыны і спусцілася па коўзкіх бетонных плітах да вады. Я ішла і ішла ўздоўж грэблі. Вялікія белыя чайкі ўзляталі з камянёў, кружлялі нада мной, крычалі. Мне хацелася зноў зрабіцца маленькай. Я разумела, што заблыталася ў жыцці, усё мне здавалася несапраўдным, фальшывым, як і гэтае Мінскае мора, уздоўж якога я ішла. Хацелася заплакаць, але не атрымлівалася. Алекс з машыны так і не выйшаў. А дзе тады быў ты?..*

Краеўскі перайшоў плошчу. Ён быў задаволены сённяшнім вечарам. За чатыры гадзіны паспеў ператварыць два залатыя ланцугі ў польскія грошы і памяняць іх на амерыканскія долары. Справа была небяспечная, рызыкоўная. На незнаёмца, які прадае золата, заўсёды глядзяць падазрона. Але трэба было як мага хутчэй выбірацца з Варшавы. Станіслаў не сумняваўся — яго з Вандай ЧК у спакоі не пакіне. Дзяржынскі зробіць усё, каб затрымаць і знішчыць таго, хто яму здрадзіў.

Станіслаў звярнуў на Маршалкоўскую, азірнуўся. Нічога падазронага не заўважыў. Варшава — гэта не Масква, дзе загуслы страх лунаў у паветры. Тут людзі працягвалі жыць, усміхаліся, гандлявалі, спяшаліся па сваіх справах, прызначалі спатканні. Краеўскі ўскінуў руку, але тут жа ж апусціў, бо заўважыў у фурманцы пасажыра, які хаваўся пад чорным раскладным тэнтам.

— Станіслаў! Ты?! — з падножкі саскочыў высокі малады мужчына ў доўгім паліто і модным капелюшы.

Перад Краеўскім стаяў яго аднакласнік па Віленскай гімназіі Караль Бонч, сын вядомага гінеколага.

— А я ўсё выглядаю: Краеўскі ці не Краеўскі? Быццам ты, Стась. Каб руку не падняў...

— Я, Караль, я, — ціха прамовіў Станіслаў.

— Во, каго не чакаў тут на Маршалкоўскай сёння спаткаць, дык гэта цябе.

Караль кінуў рамізніку манету:

— Пайшоў. Што стаў? Не бачыш хіба, сябра сустрэў? Сто гадоў не бачыліся.

— А ты добра выглядаеш. Доктарам працуеш? Сваю практыку ў сталіцы адкрыў? — пацікавіўся Станіслаў.

— Якое там, — Караль пстрыкнуў пальцамі. — Зялёны стол, рулетка. Учора прайграў, сёння выйграў. Жыццё вірам ідзе. А я ад нашых чуў, што ты ў ЧК служыць падаўся. Праўда?

— Караль, кінь дурное. Я што, падобны да чэкіста?

— Ну, ведаеш, на лобе ані ў кога не напісана. Я і не паверыў. Не тая ў цябе кроў, — раптам Караль спалохана азірнуўся. — Што на вуліцы стаяць? Не лета.

— Некага баішся? — насцярожыўся Станіслаў.

— Паліцыя і тут жыць не дае. Пайшлі адсюль. Я частую, — былы аднакласнік схапіў Станіслава за локаць.

Неўзабаве яны ўжо сядзелі ў рэстарацыі пры казіно «AS». Станіслаў рабіў выгляд, што слухае Караля, а сам думаў пра Ванду, якая чакала яго, адказваў коратка і не заўсёды трапна, паглядаў на гадзіннік.

Тэмы для размовы вычарпаліся хутка. Краеўскі хацеў разлічыцца за выпітае і з’едзенае, але прыяцель дзяцінства запярэчыў. Ён выцягнуў з кішэні пульхны партманет і шчодра адмовіўся ад рэшты.

— За добрую працу, — кінуў ён афіцыянту і зірнуў на Краеўскага, — не жадаеш шчасця за зялёным сталом паспытаць?

— Не цяпер. Спяшаюся я.

— Да жанчыны?

Ужо ў шатні, калі Караль папраўляў белы шаўковы шалік перад вялікім люстэркам, да іх падышоў мужчына ў цывільным, прадэманстраваў купюру:

— Гэтымі грашыма панове разлічыліся ў рэстарацыі?

Караль адштурхнуў мужчыну і кінуўся да дзвярэй, але на вуліцы ўжо чакалі два паліцыянты.

Грымнулі стрэлы, пачулася лаянка.

Калі Краеўскага ў кайданках вывелі з рэстарацыі, то ён убачыў забітага Караля. Былы аднакласнік ляжаў на ходніку, у правай руцэ паблісквай маленькі рэвальвер. Мужчына ў цывільным крычаў на паліцыянта:

— Гэта фальшываманетчык Караль Бонч! Я яго тры месяцы высочваў. А цяпер кату пад хвост уся мая праца.

— Пан інспектар, дык гэтага ж, другога жыўцом узялі.

— У пастарунак яго.

— Пся крэў, — выдыхнуў Станіслаў і аблізаў рассечаную губу.

*...нячаста здаралася, каб у Алекса быў добры настрой, каб ён жартаваў сам і разумеў мае жарты. У такія імгненні ён мне падабаўся, яго суворы напружаны твар рабіўся па-дзіцячы адкрытым, вочы ззялі. Перада мной тады сядзеў зусім іншы чалавек — неабцяжараны мінулым. Мы вячэралі ў яго дома. Гучала музыка. Раптам Алекс спахмурнеў, закрыў твар рукамі. А калі я адняла яго моцныя далоні, на мяне няўцямна глядзелі халодныя вочы. Ён сціснуў мае пальцы. Я ледзь стрывала боль. І Алекс прамовіў, як не мне: «Калі ты мяне кінеш, табе не жыць». Я потым часта згадвала і словы, і яго позірк. Няўжо ён тады казаў праўду? Няўжо ён бачыў наперад? Не трэба было мне пра гэта згадваць. Правільна кажуць — пра нябожчыкаў альбо добра, альбо нічога... На наступны дзень Алекс Фасманскі ахвяраваў вялікую суму на будоўлю храма...*

Тэлевізар Вера Сяргееўна не любіла. Але, як шмат у якіх пенсіянерак, ён быў адзіным таварышам, асабліва вось такімі змрочнымі восеньскімі днямі. Пажылая жанчына сядзела за круглым сталом і глядзела навіны. Каляровыя блікі экрана сполахамі адбіваліся ў лінзах акуляраў. І ад гэтага твар Веры Сяргееўны выдаваў сляпым.

Недарэчна ўсмешлівы дыктар нагадаў гледачам пра нядаўняе забойства вядомага мінскага бізнесмена Аляксандра Францавіча Фасманскага, труп якога быў знойдзены вартаўніком у більярднай яго сталічнага офіса. Следчы меркаваў, што забойства здзейснілі асабістыя ахоўнік і вадзіцель бізнесмена...

Вера Сяргееўна слухала няўважліва, пра забойства Фасманскага перадавалі яшчэ заўчора, нават фотаздымкі мяркуемых злачынцаў паказвалі. Жанчына ажывілася, калі на экране раптам узнік будынак Мсціслаўскага аўтавакзала. Начальнік мсціслаўскай міліцыі маёр Маліноўскі паведаміў гледачам, што сёння раніцай пры спробе затрымання быў забіты ахоўнік Фасманскага. А ўчора міліцыянеры знайшлі і паднялі з затопленага кар’ера легкавы аўтамабіль, у салоне якога знаходзіўся труп вадзіцеля.

У дзверы пагрукалі. Вера Сяргееўна прыцішыла гук і пайшла адчыняць.

На ганку стаялі трое незнаёмцаў. А побач з брамкай паблісквাў чорны мікрааўтобус. Альшанскі стрымана павітаўся, назваўся і папрасіў дазволу прайсці ў дом. Вера Сяргееўна імгненна адчула нядобрае. А калі ўбачыла ў руцэ сівавалосага фотаздымак Ганны і Фелікса, ледзь не самлела. Маладзейшы з мужчын падаў ёй шклянку вады. Па тэлевізары паказвалі прагноз надвор’я на заўтра.

— Фелікс Рэй загінуў. А вось Ганна Мятліцкая пакуль жывая, — тлумачыў сівавалосы мужчына. — Яны заязджалі да вас...

Вера Сяргееўна верыла кожнаму яго слову.

— Я прапаноўвала ім заначаваць у мяне. Раніцай паехаць, але яны спяшаліся. Маладыя.

— Вы ані ў чым не вінаватая, Вера Сяргееўна. Так лёс склаўся, — Альшанскі дакрануўся да рукі гаспадыні. — Я ведаю, яны нешта ў вас пакінулі. Калі ласка, гэта вельмі можа дапамагчы.

— А яны нікога не збілі?

— Не, што вы. Іх машына зляцела з дарогі на пяцьдзесят трэцім кіламетры.

— Хто машыну вёў, не ведаеце?

— Не ведаю, высвятляем яшчэ.

Вера Сяргееўна глынула вады, зняла акуляры, выцерла насовачкай пачырванелыя вочы.

— Шпалеры яны мне пакінулі.

— Так, так... менавіта шпалеры, — Альшанскі прабег позіркам па пакоі. — І дзе яны?

— Няма іх у мяне. На пошту раніцай занесла.

— На якую пошту?

— На нашу, у нас адна. За аўтастанцыяй. Не ведаю, чаму яны іх везці з сабой не захацелі.

— Квітанцыя захавалася? — строга спытаў Альшанскі і сеў насупраць гаспадыні.

Вера Сяргееўна павагалася, але чалавек выдаваў на прыстойнага.

— Канечне, — яна адгарнула сурвэтку на тэлевізары і паклала перад Альшанскім паштовую квітанцыю. — А Ганна ў нашай бальніцы ляжыць?

— Тут, але да яе нельга пакуль. Рэанімацыя.

— А, Божа ж Ты мой, яна ж цяжарная...

— І гэта ведаем, — спачувальна ўздыхнуў сівавалосы і ўзяў квітанцыю.

Ужо ў машыне Альшанскі пераможна загадаў:

— На пошту, яна тут адна, — і ўзяўся чытаць квітанцыю. — Ракаў, Мінская вобласць... Чаму Ракаў? Як мяркуеш, Марат?

*...куды ты сыходзіш? Мне без цябе цяжка. А... Ты ўсё адно будзеш мяне чуць і разумець усе словы, думкі. Я табе абяцаю згадваць толькі добрае. Хочаш, раскажу табе пра паветранага змея? Які ён быў прыгожы і вялікі, і хвост у яго быў — тры доўгія шаўковыя стужкі. Змея зрабіў хлопчык са сваім бацькам. Гэта было каля мора. Мне тады купілі сукенку — белую ў сінія «гарохі», і каўнерык белы, шаўковы з празрыстымі карункамі. А вецер дзьмуў цёплы, шчыльны, і пах ён горнымі кветкамі, воскам, жывіцай. Паветраны змей быў прыгажэйшы за маю сукенку. А хлопчык той на год старэйшы за мяне: ён перайшоў у пяты, а я скончыла чатыры. Бацька дапамог яму запусціць змея. Я стаяла ў сваёй гарохавай сукенцы і не наважвалася падысці. Ён сам паклікаў мяне і даў патрымаць катушку з суворымі ніткамі. Змей вісеў высока-высока, там, дзе кружлялі чайкі. Птушкі не баяліся яго. Нацягнутая нітка трымцела, гула. І мне хацелася паляцець над морам. Я тады не разумела — змей лётае, бо прывязаны да зямлі, бо я трымаю яго. Мы ішлі па мокрым пяску, глядзелі ў неба, хвалі набягалі, залівалі нашыя сляды. Шаўковыя стужкі нагадвалі ў небе танюткія рыскі — сляды нагостранага каляровага алоўка. Гаспадар змея не заўважыў, як раскруцілася, скончылася нітка. Папяровы змей кульнуўся і параненым анёлам пачаў падаць. Мы плакалі, але нічога не маглі зрабіць. Да позняга вечара мы хадзілі каля вады, кідалі каменьчыкі, размаўлялі пра розныя гарады, чакалі, што хвалі вернуць нашага анёла. Мы сядзелі на выбеленым сонцам і марскімі хвалямі бервяне, елі вязкую недаспелую хурму. Ад яе сціскала горла, рабілася цяжка гаварыць. І ён сказаў, трымаючы ў пальцах лакавую костачку, што ніколі ў жыцці не бачыў такой прыгожай сукенкі, як у мяне. Калі сцямнела і запаліліся нізкія паўднёвыя зоры, дарослыя прымусілі нас разысціся. Калі ты мяне чуеш, анёл, то падкажы імя таго хлопчыка, які навучыў мяне запускаць папяровага змея і кідаць каменьчыкі...*

Ішоў снег. Такі моцны, быццам там, у нізкім небе, разадралі вялізную падушку, і з яе пасыпаліся пёры. Ванда глядзела на яго і плакала. Яна моцна стамілася за гэтыя дні, пакуль шукала свайго Станіслава.

Засыпаная снегам брычка больш за гадзіну стаяла насупраць брамы Варшаўскага «цэнтрала». Змерзлы рамізнік ужо двойчы абтрасаў снег з каня, абыходзіў брычку.

— А пані ўпэўнена, што яе мужа сёння выпусцяць?

Ванда паціснула плячыма, працягнула рамізніку грошы.

Фортка ў вялікай турэмнай браме адчынілася нячутна. На вуліцу выйшаў Станіслаў. Ён доўга мружыўся, гледзячы на белы свет. Грабануў жменю снегу з бляшанага карніза, адкусіў ад яго, як ад хлеба, выцер схуднелы нязголены твар.

— Станіслаў! — крыкнула Ванда.

Краеўскі разгублена зірнуў па баках. Засыпаны снегам рамізнік махаў яму пугай. Станіслава хіснула, і ён пабег да брычкі. На бруку заставаліся яго чорныя сляды.

— Вандачка, — Краеўскі схапіў яе азяблыя рукі, узяўся цалаваць. — Прабач, прабач, я не хацеў, так атрымалася...

— Не плач. Усё добра. Мы зноў разам.

— Пані, можам ехаць? — цераз плячо спытаў рамізнік.

— Цяпер — так.

Шчоўкнула пуга. Застаялы конік шпарка пабег. З чорнага тэнта з’ехала брыла пульхнага снегу.

— Ты галодны?

— Нават не ведаю.

— Нашы білеты на параход ляснуліся. Я трымала іх да апошняга. Усё спадзявалася, што паспеем... Я плаціла і плаціла ўсім, ад каго нешта залежала. А яны цябе не адпускалі. Ты ж нічога нікому, ты ж не вінаваты.

— Яны хацелі зрабіць з мяне саўдзельніка Караля Бонча. Нібыта мы з ім разам збывалі фальшывыя злотыя.

— Ведаю. Мне адвакат казаў. Каб цябе вызваліць, давялося шмат золата прадаць.

— Куды едзем, панове? — азваўся рамізнік на скрыжаванні.

— Як мага далей ад гэтага месца! — бадзёра крыкнула Ванда. — Гані!

Станіслаў схіліўся да Ванды, прыціснуў яе да сябе:

— А ты дзе зараз? Там жа?

Мятліцкая зашаптала:

— Туды нельга. Я сядзела і чакала цябе, калі яны пачалі ламаць дзверы. Я пачала страляць... — і прыклала палец да вуснаў, — нават не ведаю, хто яны: чэкісты ці Дэфензіва?

— Трэба паспець з'ехаць да Калядаў. Тут небяспечна. Я гэта адчуваю.

— Цяпер, з табой, хоць на край свету, — шчасліва засмяялася Ванда.

— Трэба купіць газету, паглядзець расклад.

— Я ўжо глядзела. Бліжэйшы параход з Гданьска праз Атлантыку ў панядзелак. На Буэнас-Айрэс.

— Аргенціна? Чаму б і не? Там зараз цёпла. І акіян там сонечна-ласкавы. А тут холадна і снег.

*...была нядзеля. Першая нядзеля летніх вакацый. Я спазнілася на свой сеанс у кінатэатр «Перамога». У летнюю залу таксама білетаў не было. Я купіла сабе марожанае з разынкамі — самае звычайнае і самае смачнае. Выйшла да ГУМа. Доўга разглядала вітрыны, а калі марожанае скончылася, падалася ў магазін. Паглядзела дарослыя сукенкі. Спынілася перад аддзелам, дзе прадаваліся грабеньчыкі, запальнічкі, заколкі, пальчаткі, голкі, напарсткі і іншая драбяза. Позірк зачапіўся за маленькую калоду сувенірных карт. Бубновая дама падалася падобнай да мяне. Я палічыла свае грошы, разам з медзякамі — ставала. Касірка прабіла квіток, а прадаўшчыца паклала на шкло вітрыны маленькую кардоначку, загорнутую ў папяросную паперу. Гандлярка яшчэ сказала, што прадаваць карты дзецям забаронена, але ў мяне ўжо быў прабіты квіток і ёй давялося парушыць правілы. Я прыехала дадому, села ў сваім пакоі на канапу і пачала раскладаць карты. Я так захапілася, што не заўважыла — бабуля стаіць побач і сочыць за маімі рухамі. Яна не сказала ані слова, проста ссунула карты і выйшла з імі на кухню... Я чула праз дзверы, як шчоўкаюць нажніцы, а калі выйшла з пакоя, то аслупянела. Баба Стася сядзела за сталом і рэзала карты. Адну за адной, крыжам, вялікімі кравецкімі нажніцамі. Потым сабрала шматкі-абрэзкі і кінула ў сметніцу. Я так спалохалася, што нават не спытала, чаму яна так зрабіла, і доўга не магла заснуць. Цяпер ведаю, што прымусіла яе забраць у мяне і знішчыць тыя сувенірныя карты...*

**У памяшканні Мсціслаўскай пошты было холадна і пуста. Загадчыца аддзялення сувязі Наталля Адамаўна Кардонская грэла рукі над каларыферам. Дзверы яе маленькага пакойчыка з закратаваным акном адчыніліся. Саракагадовая жанчына адняла рукі ад цяпла і ўзялася папраўляць чорны берэт. Пакойчык імгненна зрабіўся яшчэ цяснейшым, бо ў яго зайшлі адразу трое мужчын.**

**— Вы тут галоўная? — афіцыйна спытаўся Альшанскі.**

**— А што такое? — разгубілася жанчына.**

**— Нам трэба вось гэтая пасылка, — Альшанскі адсунуў бухгалтарскі калькулятар і паклаў на тоўстае шкло стала квітанцыю.**

**Наталля Адамаўна глянула на паперку, потым на мужчын. Ёй зрабілася крыху не па сабе. Па-першае, ніводнага з іх яна не ведала. Па-другое, не прывыкла, каб з ёй так размаўлялі.**

**— Вы што, не чуеце? — сказаў Макс.**

**— А хто вы такія?**

**Альшанскі паказаў сваё пасведчанне.**

**— Ну і што? Гэта ж не міжнародная пасылка. І чаму я павінна яе вам выдаваць? — жанчына зірнула на квітанцыю. — Вы што, Ганна Мятліцкая?**

**І тут Альшанскі не стрываў, яго як прарвала.**

**— Вы праверылі, што ў ёй? Не праверылі!**

**— А чаго вы на мяне крычыце? Гэтай пасылкі даўным-даўно няма.**

**— Дзе яна? Хутка!**

**— Едзе ўжо. На станцыю паехала, а адтуль цягніком у пункт прызначэння, — Наталля Адамаўна зірнула на адміністрацыйную карту Беларусі, а потым на гадзіннік. — Праз паўгадзіны будзе ў вагоне.**

**— Спыніце машыну, — загадаў Альшанскі.**

**— На якой падставе? — загадчыца пошты пераможна ўсміхнулася.**

**— А калі вам тое ж самае скажа начальнік вашай міліцыі?**

**— Вось калі скажа, тады і будзе, — працягвала ўсміхацца Кардонская.**

**Альшанскі хутка дастаў з кішэні мабільнік, набраў нумар.**

**— Маёр, прывітанне. Альшанскі турбуе... Ну, паказалі цябе па тэлевізары, і добра. Дапамога трэба...**

**Сівавалосы інтэрполавец сунуў трубку паштарцы.**

**— ...дык ім жа яшчэ газеты забіраць, спозняцца, — паспела прамовіць яна і асеклася, — тады зразумела. Ну, не ведаю, ці змагу датэлефанавацца. Экспедытар мне не падпарадкоўваецца. Ён з вобласці, мужчына самастойны... Запісвайце тэлефон... — сказала яна і ткнула пальцам у шкло, пад якім бялеў спіс нумароў.**

**Наталля Адамаўна прадыктавала нумар экспедытара і аддала тэлефон Альшанскаму. Нейкі час у пакоі панавала напружанае маўчанне. Чулася, як булькоча разагрэтым алеем, пстрыкае калАрыфер. Заціўкаў мабільнік.**

**— Дзякуй, Маліноўскі, — коратка прамовіў у трубку Альшанскі, і ўсе трое хутка, як і зайшлі, пакінулі пакойчык.**

**Мікрааўтобус ірвануў з месца.**

*...мяне блажыла, я адчувала млосць. Мы з Феліксам сядзелі ў пачакальні Мсціслаўскага аўтавакзала. Час цягнуўся нясцерпна доўга. Мне не трэба было піць распушчальную каву ды яшчэ з папяровага кубка. Кепская кава з прысмакам правошчанай паперы. Я баялася прапусціць званок механіка і аддала свой мабільнік Феліксу. Каб ён адказаў, што мы хутка будзем, калі той патэлефануе. Фелікс застаўся са сваёй цёплай кавай, а я адышла ў прыбіральню. На вакзале было няшмат людзей. Пры ўваходзе я сутыкнулася з маладой цыганкай, якая трымала на руках бязгучнае немаўля. Яна прытрымала дзверы, прапусціла мяне. Як разумела, што мне блага. Я не магла бачыць, як цыганка падышла да майго Фелікса і села побач. Магчыма, яна павіталася, назвала яго маладым-прыгожым і, не дачакаўшыся адказу, прапанавала паваражыць. Чаму ён згадзіўся? Хто ж не хоча ведаць сваю будучыню? Яна ўзяла яго руку ў свае халодныя далоні. Папяровы кубак з недапітай кавай Фелікс паставіў на падлогу. Ён заўсёды так робіць і ніколі не перакульвае. Цыганка сказала, што яго чакае далёкая дарога, пра «казённы дом» не прагучала ані слова. З дарогай зразумела — варажба вялася на вакзале. Яна сказала, што ён жыве ў вялікім горадзе ў прыгожым доме, і з вокнаў кватэры далёка відаць. А потым, водзячы пальцам па далоні Фелікса, спалохана прамовіла, што на мужчыну абрынулася вялікае каханне... а на яго жыццё нехта паставіў вялікія грошы. Яшчэ яна сказала, што ў яго няма бацькі, а маці жыве за морам-акіянам. Фелікс слухаў яе і па-дзіцячы плямкаў вуснамі. Наіўны, ён не ведае, як падобнае робіцца. А потым яна сказала пра мяне і апісала мой партрэт, гэта я ўжо чула, стаяла непадалёк. Цыганка сказала, што бачыць на дарозе траіх. Фелікс спытаў — а хто той трэці? Цыганка не адказала. Я кашлянула. Фелікс сумеўся, даў варажбітцы грошы. І тут я ледзь не страціла прытомнасць, калі цыганка сказала, гледзячы Феліксу ў вочы, што яго імя Станіслаў. Яна прамовіла гэта вельмі ціха, але я пачула. «Феліксам яго завуць, ён Фелікс», — нервова запярэчыла я. «А хіба я сказала інакш?» — прагучала ў адказ спакойнае. Каб яна прапанавала свае паслугі мне, я б адмовілася. Заблямкаў мой тэле-*

*фон. Аўтамеханік паведаміў, што ён сваю нялёгкую справу зрабіў і чакае нас у сваёй майстэрні. Цыганка зашамацела спадніцамі, хавала грошы, і сышла са сваім бязгучным дзіцем. «Навошта табе гэта?» — спытала я. Фелікс вінавата ўсміхнуўся: «Хачу ўпэўніцца, што ў нас усё будзе добра». «Як будзе, так і будзе», — сказала я і папрасіла Фелікса прыбраць кубак з падлогі. «А хто трэці з намі будзе ехаць?» — спытаў тады Фелікс. Наіўны...*

На сцэне Варшаўскай оперы, як звычайна падчас Калядаў, давалі «Чароўную флейту» Моцарта. Вацлаў Навіцкі першы раз пасля вяртання з Масквы надзеў смокінг, а яго жонка — вечаровую сукню і сціплыя ўпрыгожанні. Яны сядзелі ў ложы бельэтажа, выкупленай савецкай амбасадай да канца тэатральнага сезона.

У паўцёмнай зале прагучала уверцюра, а госць, якога чакаў Вацлаў, так і не з'явіўся. Ён ужо тройчы здымаў і праціраў пенснэ. Дыпламат хваляваўся.

— Ты некага выглядаеш? — шэптам спытала жонка.

— Чакаю, — Вацлаў слепавата паміргаў і прыладзіў пенснэ на нос.

Хіснулася цяжкая парцьера.

— Добры вечар, — прагучала ў іх за спінамі з паўзмроку.

— Я ненадоўга, — Вацлаў падняўся і крануў жончына аголенае плячо.

Польскі дыпламат, разы ў два старэйшы за Вацлава, прагульваўся са сваім савецкім калегам па пустым фае оперы.

— Як рухаюцца нашыя справы, пан Адам?

— Рухаюцца. Каб вы крыху раней парупіліся нас праінфармаваць, Краеўскага б ужо затрымала Дэфензіва. І цяпер з вашай краінай ішлі б перамовы — на каго з нашых грамадзян яго памяняць.

— Гэта ўсё, пан Адам, справядліва. Але ж ён быў у руках паліцыі па справе вядомага фальшываманетчыка.

— Так, так, пан Вацлаў, Краеўскі быў затрыманы. Але ж, ведаеце, Дэфензіва сама па сабе, паліцыя — таксама. Дый адвакат Бычкоўскі аказаўся ўвішным. Знайшоў сведкаў, каго трэба, я разумею, купіў. І адкуль у вашага Краеўскага ўзяліся такія грошы? Бычкоўскі ці не самы дарагі ў Польшчы. Ён што, злодзей?

— Пан Адам, не забівайце сабе гэтым галаву. А Бычкоўскі ведае, дзе яго кліент цяпер?

— На жаль, не ведае. Ці не хоча ведаць.

— Нават Дэфензіва не мае магчымасці націснуць на адваката?

— Бычкоўскі з'яўляецца зяцем аднаго вельмі набліжанага да маршалка чалавека. І ціснуць на яго небяспечна.

— А калі за добрыя грошы? — асцярожна пацікавіўся Вацлаў і згадаў каменны твар старшыні ЧК.

— Наколькі мне вядома, у Расіі голад.

— Хлусня, пан Адам. Не верце прапагандзе.

— Не сёння, дык заўтра Краеўскага схопяць. Але гэта пры той умове, што ён усё яшчэ ў Польшчы. І грошы тут нічога не вырашаюць. Як мяркуеце, пан Вацлаў, ён яшчэ тут?

— Спадзяюся, што ўсім нам пашанцуе. Так каго вы хацелі выклікаць?

— Далёкі жончын сваяк. Праз сваякоў заўсёды клопат. Але, што зробіш? Здаецца, зараз пачнецца, — паляк прыслухаўся. — Гэта мая любімая арыя. Дзеля яе і прыйшоў. Моцарт — геній.

— Бясспрэчна, пан Адам.

Дыпламаты пацiснулі адзін аднаму рукі і разышліся па сваіх ложах.

Вацлаў Навіцкі сеў побач з жонкай.

— Усё добра? — спытала яна.

— Слухай, слухай. Зараз будзе выдатная арыя, — сказаў дыпламат і злавіў пенснэ за ланцужок.

А ў гэты час у бенуары да выхаду прабіраліся мужчына і маладая жанчына. Яны прыпыніліся каля цяжкой парцьеры, даслухалі арыю да канца, а калі пачаліся воплескі, выйшлі ў фае.

— Як прыгожа, не хочацца сыходзіць, — сказала Ванда. — Дзякуй. Ты зрабіў мне маленькае свята. Гэты калядны падарунак я буду памятаць усё жыццё, — яна прыўзнялася на дыбачкі, пацалавала Станіслава ў шчаку.

— Я ж абяцаў, што мы сходзім у оперу.

І ўжо ў шатні Краеўскі дадаў:

— Да гданьскага цягніка — гадзіна. Усё мы з табой паспяваем.

*...быў цёплы травеньскі вечар. Я стаяла на балконе, глядзела на горад, на асветленыя з сярэдзіны тралейбусы, аўтобусы. Я сціскала ў руках тую самую ракавіну. Што адбылося? Адчыніліся ўваходныя дзверы. Ракавіна выслізнула з пальцаў, разбілася. І я не заплакала, хоць ведала, другой такой ужо ніколі не будзе. Не заплакала і зразумела чаму, бо я — дарослая...*

Мужчына ў доўгім чорным паліто і ў шырокім фетравым капелюшы дапамог сваёй жанчыне спусціцца з падножкі трамвая. Ён ямчэй перахапіў ручку цяжкага саквояжа. Жанчына ўзяла яго пад локаць. Блямкнуў званочак, вагон паехаў. У святле прывакзальных ліхтароў кружлялі сняжынкі.

Мужчына і жанчына ішлі моўчкі, няспешна. Яны выглядалі на людзей заможных, упэўненых у сабе і сваёй будучыні. Пры цэнтральным уваходзе двое паліцыянтаў спынілі нейкага маладзёна з паненкай, узяліся правяраць у яго дакументы.

— Не хвалюйся, — сказаў Станіслаў, — адпусці руку. Я пайду першы, ты за мной.

— Ты думаеш, яны нас шукаюць?

— Не ведаю. Але лепш паасобку, — Краеўскі паскорыў крок, азірнуўся.

Ванда стаяла пад ліхтаром, папраўляла шалік.

Станіслаў сутыкнуўся позіркам з немаладым паліцыянтам, які стаяў пры ўваходзе. Той адступіўся ўбок, каб не замінаць. Краеўскі крануў капялюш, скінуў з рукава паліто снег і ўвайшоў у вакзал, паклікаў да сябе хлопчыка са стосам вечаровых газет. Набыў адну, разгарнуў.

Газета прыемна пахла свежай фарбай. Краеўскі паверх яе сачыў за ўваходам. Нарэшце з’явілася Ванда. Яна ледзь хавала свой сполах. Убачыла Станіслава, але падысці адразу не наважылася.

Краеўскі падаў знак, што кіруецца да буфета.

— Ды не хвалюйся ты так, здаецца, праскочылі. Ці мала каго яны ловяць. Варшава вялікая.

— Неяк мне не па сабе.

— Хочаш, я цябе гарачым шакаладам пачастую? Ты ж любіш. А сам піва вып’ю.

— Дзякуй, другім разам.

— Апошні ж раз у Варшаве.

Непадалёк ад іх прыпынілася маладая цыганка, апранутая надзіва ахайна. Яна глядзела на Станіслава і Ванду так, быццам тыя вінныя ёй грошы.

— Пачастуем яе? — ледзь чутна спытаў Краеўскі.

Ванда не паспела адказаць, як цыганка ўжо стаяла побач з іх столікам.

— Маладыя-прыгожыя. Карты ўсё скажуць. Там усё напісана: што было, што ёсць, што будзе, чым сэрца супакоіцца.

— Мы і так усё ведаем, — сказаў Станіслаў. — Дальняя дарога нас чакае.

Цыганка ўсміхнулася, як з няўдалага жарту, паклала перад Краеўскім картачную калоду.

— Здымі пан.

— Левай — ад сэрца? — ён ссунуў ці не палову калоды на абрус.

Цыганка падраўняла карты, заціснула іх у далонях, нешта пашаптала і ўзялася раскідваць па адной.

— Ёсць дальняя дарога.

— Па зямлі ці па моры? Вялікі карабель ці ёсць? — прымружыўся Краеўскі.

— Не бачу пакуль. А вось казённы дом бачу, сам пан глядзі, — палец з вялікім срэбным пярсцёнкам дакрануўся да карт.

— Не трэба, — запярэчыла Ванда.

— А далей? — папрасіў Краеўскі і ўзяў Ванду за руку.

— Дачка ў цябе будзе, пан. Пра мора цёплае і белы дом марыш.

— Ёсць такое, — прамовіў Краеўскі.

Цыганка раптам ссунула карты, сціснула іх у далонях, схавала ў складках шалёсткай спадніцы — у буфет зайшоў паліцыянт.

— А далей што? — Станіслаў дастаў з кішэні грошы.

— Усё будзе добра, — сказал цыганка, і яе вочы вільготна бліснулі.

— Грошы вазьмі.

— Не трэба, пан.

Паліцыянт купіў запалкі, дачакаўся, пакуль цыганка сыдзе, і падаўся за ёй следам.

У буфеце Ванда і Станіслаў счакалі да апошняга. Калі да цягніка на Гданьск заставалася пяць хвілін, Краеўскі з Мятліцкай шпарка ішлі па пероне да свайго вагона.

Супрацоўнік Дэфензівы ў цывільным заступіў ім дарогу, калі да чацвёртага вагона заставалася дзесяць крокаў. Тут жа з вагона выйшаў паліцыянт, папрасіў прад'явіць дакументы.

— Мы спазняемся, панове, — Краеўскі паказаў на цягнік. — Ды і жонка кепска пачуваецца.

— Гэта не зойме шмат часу, — прамовіў цывільны.

Ванда цяжка ўздыхнула, і твар яе пачырванеў. Яна пачала адкрываць рыдыкюльчык. Пальцы не слухаліся. Краеўскі ўзяў Мятліцкую за руку:

— Каханая, і твой пашпарт у мяне.

Станіслаў выцягнуў з кішэні паліто пашпарты і білеты на цягнік, падаў паліцыянту, той перадаў пашпарты цывільнаму. Супрацоўнік Дэфензівы спрактыкавана прагартаў дакументы.

— І даўно пан атрымаў грамадзянства Аргенціны? — прымружыўся цывільны.

— Трэці год пайшоў, — спакойна прамовіў Краеўскі.

— Прабачце, што патурбаваў, і шчаслівага падарожжа.

Паравоз даў кароткі гудок. Краеўскі дапамог Вандзе падняцца ў вагон. Цягнік крануўся.

Цывільны глядзеў на асветленыя вокны, за якімі ўладкоўваліся пасажыры.

— А пан аргенцінчык падобны, — сказаў паліцыянт, — ды і парай яны на вакзале з'явіліся.

— Я таксама з жонкай, бывае, на ўзбярэжжа выпраўляюся. Пашпарты ў іх сапраўдныя, ды і выглядаюць прыстойна. Дакуль яны едуць?

— У вольнэ място Гданьск.

— Да Гданьску... чацвёрты вагон... — цывільны задуменным позіркам праводзіў цягнік.

*...мы ехалі да мяне. Нашы тэлефоны ляжалі побач на прыборнай панелі. Феліксаў заблямкаў, і на экранчыку высвеціўся ўсмешлівы дзявочы твар. Фарбаваная бландзінка, паспела заўважыць я. Фелікс прыціснуў трубку да вуха, гаварыў ціха, але я чула кожнае слова: так, я ў Мінску... ну, і што я абяцаў?.. не, не магу... так, я цяпер не адзін... Я рэзка спыніла машыну і выйшла. Ніколі раней за сабой падобнага не заўважала, а тут мной апанавала такая злосць, што нават дыхаць не магла. Я стаяла пад дрэвам, з вачэй беглі слёзы. Ён мой і толькі мой. І Фелікс адчуў гэта, зразумеў. Калі я села ў машыну, ён ціскаў клавішы мабільніка, на экранчыку мільганула некалькі дзявочых тва-*

*раў і знікла. «Усё, — сказаў Фелікс і паклаў свой тэлефон побач з маім. — Я хачу, каб ты ведала. Іх больш няма. І тэлефонных нумароў у памяці майго мабільніка няма». «А ў тваёй?» — спытала я. «А ў маёй яны зніклі яшчэ там, у Франкфурцкім аэрапорце, калі ўбачыў цябе. Можам ехаць?» І я забылася на ўсіх сваіх знаёмых кавалераў, на былых каханкаў і нават сяброў...*

Ванда, закалыханая аднастайным рухам цягніка, спала. Неспакойна. Яна ўздрыгвала, шаптала скрозь сон. Клікала Станіслава. І тады ён браў яе за руку:

— Я тут. Не хвалюйся, — супакойваў Краеўскі, папраўляў коўдру. — Я тут. Я побач з табой.

— Чаму ты не кладзешся?

— Не спіцца.

— Адпачні.

— Потым, на караблі.

— Калі мы будзем у Гданьску?

— Я пайду, удакладню. Здаецца, спазняемся крыху. Спі.

Ванда ўсміхнулася і заснула.

Станіслаў ціха прычыніў дзверы і пайшоў праз цьмяна асветлены вагон да рэстарацыі. Замовіў каньяк. Калі заспаны афіцыянт паставіў перад ім келіх, Краеўскі пацікавіўся:

— Які апошні прыпынак перад Гданьскам?

Афіцыянт на імгненне задумаўся, пачаў загінаць пальцы — лічыць, нарэшце сказаў назву станцыі і дакладны час, папярэдзіў, што стаянка ўсяго дзве хвіліны.

Станіслаў зірнуў на гадзіннік. Да станцыі «TCZEW» заставалася крыху больш за гадзіну.

Краеўскі вярнуўся, крануў Ванду за плячо, тая імгненна прахапілася.

— Нешта здарылася?

— Я думаю, нам лепш сысці з цягніка раней.

— Мяркуеш, яны будуць чакаць нас на вакзале?

— Могуць.

— Ой, баюся.

— Усё абыдзецца. Мы іх падманем. Збірайся паціху, — Станіслаў пераклаў рэвальвер у кішэню паліто.

Калі цягнік пачаў скідаць хуткасць, уцекачы выйшлі з купэ. Праваднік зірнуў на іх здзіўлена.

— Мы ведаем, што цягнік стаіць толькі дзве хвіліны, — пасміхнуўся Краеўскі.

Пасля горача напаленага вагона ранішні перон сустрэў мужчыну і жанчыну мокрым снегам і падазроным позіркам паліцыянта, які стаяў пад стрэшкай ганка.

— А далей як, Станіслаў?

— Яшчэ не ведаю.

Краеўскі рашуча падаўся да змрочнага праваахоўніка:

— Перапрашаю пана. Дзе тут бліжэйшы тэлефон?

— Тут, на станцыі, — пасміхнуўся паліцыянт і спагадліва зірнуў на азяблую Ванду Мятліцкую.

*...мы сядзелі ў машыне і чакалі, калі нарэшце адчыніцца музей. З завулка выйшла мсціслаўская цётка ў выцвілым вайсковым бушлаце і чырвоным берэце. Яна несла яркасіняе эмаліраванае вядро — поўнае, нават з каптуром, крамянымі мочанымі яблыкамі. Я аж зайшлася слінай, ледзь не спаўзла з сядзення. Фелікс перахапіў мой позірк, якім я праводзіла мсціслаўскую прыгажуню. Ён выскачыў з машыны і пабег следам. Яны пра нешта гаварылі. Вярнуўся Фелікс з трыма яблыкамі, якія трымаў проста ў далонях: «Яна ўнукам несла. Пачаставала». А мне было ўсё адно: каму яна іх несла, пачаставала, ці ён забраў іх гвалтам, ці цётка саступіла іх Феліксу за сто еўра. У той момант*

*мне іх нясцерпна хацелася, нават больш, чым жыць. Я не забуду смак тых антонаўскіх яблык да самага скону, як не забуду і тыя пацалункі за калонай у Франкфурцкім аэрапорце. А калі я дагрызла костачкі, то Фелікс сказаў: «Цяпер я веру, што ў нас усё атрымаецца», — і падаў мне свой яблык, ад якога паспеў адкусіць усяго раз...*

Вольны горад Гданьск у параўнанні з Варшавай выглядаў змрочна. Ані снегу, ані сонца не было. З мора дзьмуў вільготны вецер. Таксоўка разбівала тонкі лёд калюгаў, імчала ў порт.

Краеўскі трымаў рукі Ванды ў сваіх далонях.

— Усё будзе добра. Не хвалюйся, — шаптаў ён. — З капітанам карабля дамоўлена. Апоўдні нас зябярэ кацер. А там на караблі для нас падрыхтаваная каюта. Там будзе цёпла.

— Хутчэй бы. Я так стамілася ад усяго гэтага. Лягу і буду спаць. А колькі нам плыць да Аргенціны?

— Забыўся спытаць. Відаць, тыдзень-два. Карабель гандлёва-пасажырскі.

— А карабель той хоць вялікі?

— Не хвалюйся, вялікі.

— І тут маніш. Хіба ты яго бачыў?

Праз чвэрць гадзіны Краеўскі з Мятліцкай ужо стаялі каля вялізнага акна і глядзелі на свінцова-шэрую Гданьскую затоку. Караблёў было шмат. Адны стаялі каля «сценкі», другія чакалі сваёй чаргі на рэйдзе.

Станіслаў перадаў тэатральны бінокль Вандзе:

— Вунь ён — той, другі, з дзвюма трубамі. Бачыш?

— Дзе? Яны ўсе з трубамі.

— Самы вялікі бачыш?

— Так, — узрадавалася Мятліцкая.

— А цяпер правей бяры, доўгі такі.

— І гэты маленькі — наш?

— Не такі ўжо і дробны. Табе здалёк здаецца.

Людзей у порце было шмат. У кожнага меўся свой клопат. Нехта сустракаў, нехта праводзіў, нехта чакаў... Ванда не магла адвесці вачэй ад парахода.

— А не такі ён ужо і малы. Ён мне нават падабаецца. Толькі назву разабраць не магу.

— «Сан Мігель» называецца.

— Ну калі, калі за намі прышлюць лодку? — Ванда па-дзіцячы прыўзнялася на дыбачкі, углядалася ўдалячынь. — Каб былі мы птушкамі, узялі б і самі паляцелі... Станіслаў, Станіслаў, плывуць. Гэта яны?

Краеўскі ўзяў бінокль. Ад парахода набліжаўся кацярок. Ён падскокваў на хвалях, пакідаў за кармой белапенны след.

— Ты стой тут, — строга сказаў Краеўскі, — а я пайду і даведаюся. Раптам што змянілася.

— А што можа змяніцца? Яны адмовяцца?

— Стой тут. Нікуды не сыходзь, — Краеўскі паставіў на каменнае падаконне каштоўны саквояж.

Мятліцкая абаперлася на яго і стала глядзець на мора.

Станіслаў не спяшаўся наблізіцца да вады. Ён выйшаў з-за дашчатага буданчыка вартаўніка толькі пасля таго, як здолеў прачытаць надпіс на борце кацярка «Сан Мігель».

Марак пераскочыў на «сценку», закруціў паміж кнехтаў белы канат, выцягнуў з кішэні кароткую люльку, запаліў, з асалодай прайшоўся па бруку і пачаў аглядацца. Краеўскі стаў насупраць смуглага марака:

— *Буэнас дыас, сеньёр*, — крыху насцярожана прамовіў аргенцінец.

— *Буэнас дыас.* Сан Мігель?

— *Сі, сі, сеньёр.*

— Пасажыр, — Краеўскі тыцнуў сабе пальцам у гузік паліто.

— *Дос*, — марак паказаў два пальцы. — *Сеньёр, сеньёра.*

— *Уна* мамент, дарагі ты мой *аміга*, — Краеўскі расчулена ўсміхаўся, — так, так, зараз будзе і сеньёра.

Станіслаў павярнуўся, каб махнуць Вандзе, паказаць, што ўсё ў парадку. Але ўскінуць руку не паспеў. У пяці кроках ад яго стаялі двое ў аднолькавых шэрых плашчах, яшчэ двое няспешна падбіраліся да яго з боку горада. Памыліцца Краеўскі не мог. Вочы ва ўсіх спецслужбоўцаў аднолькавыя, што ў Маскве, што ў Мінску, што ў Варшаве... І ў гэтых позіркі былі халодныя, бясколерныя.

Краеўскі зірнуў паўзверх ворагаў. Ён убачыў далоні Ванды, якімі яна ўпіралася ў шкло, твару было не разгледзець.

— Спакойна, — ціха прагучала з вуснаў супрацоўніка Дэфензівы. — Паедзеш з намі, пан-таварыш Краеўскі.

— Пся крэў, — прашаптаў Станіслаў і сціснуў у кішэні халодны рэвальвер.

— Стаяць, — пачулася справа.

Станіслаў пабег. Ён даўно не бегаў так хутка, можа, ніколі раней у жыцці. Краеўскі нават не азірнуўся, калі прагучалі два стрэлы. Ён ляцеў, каб звесці ворагаў як мага далей ад Ванды, каб яна мела магчымасць схавацца, знікнуць. Ён пераскокваў праз бярвёны, скрыні, скруткі канатаў, мяхі...

Ванда прыціснулася лобам да шкла. Краеўскі знік за штабелем скрыняў, зніклі і яго пераследнікі. А маленькі кацярок з надпісам «Сан Мігель» ужо падскокваў на хвалях, спяшаўся да свайго парахода.

Магчыма б, Станіслаў і ўцёк. Але вузкі калідор паміж вышэзнымі сценамі скрыняў вывеў яго на самы край пірса. Уцякач азірнуўся. Па вузкім калідоры да яго набліжаліся трое ўзброеных мужчын.

Краеўскі кінуў свой рэвальвер у ваду і падняў рукі.

*...я расказала Феліксу пра белы аднапавярховы дом на ўзбярэжжы. І абавязкова, каб побач меўся маяк. Дом павінен быць стары, і ва ўсіх пакоях вокны мусяць глядзець на акіян. І вялікі сад вакол дома. «Каб там былі толькі мы і больш нікога». «А дзеці?» — спытаў Фелікс. «Ты хочаш гэтага?» «Вельмі, — адказаў ён. — Бо каму я стану чытаць кніжкі ўголас?» Мяне гэта вельмі здзівіла, бо пра дзіця ў той момант і не думала, забылася, што цяжарная. «А мне можна будзе слухаць?» «Ты станеш пісаць кніжкі», — сказаў Фелікс. «Толькі паабяцай ніколі не чытаць дзецям пра Папялушку, — папрасіла я. — З усіх казак яна ў мяне самая нелюбімая». Я не стала нават тлумачыць — чаму так. Спадзяюся, ён зразумеў. Я ўявіла сабе Фелікса сталым, у акулярах, сівавалосым, ён сядзіць на тэрасе дома ў плеценым фатэлі-гушкалцы з тоўстай кніжкай на каленях. Вецер гартае старонкі. І побач, каля ног, стаіць вялікі кубак з недапітай састылай кавай. А голас Фелікса гучыць, як і цяпер, бадзёра, усхвалявана. Сябе ж пасталелай — дарослай жанчынай, нават саракагадовай, як не намагаюся, уявіць не магу. У чалавека абавязкова павінен быць утульны дом. Ты мяне чуеш, анёл? І яшчэ я ў яго спытала, ці ўмее ён рабіць і пускаць паветраных змеяў? Ён прызнаўся, што ніколі не спрабаваў. Але, калі я пажадаю, то ён навучыцца і зробіцца майстрам па вырабе паветраных цудаў...*

Начальнік турмы Зыгмунд Тарлецкі, як і ўсе турэмшчыкі, адвакатаў не любіў, бо яны, з аднаго боку, забіралі яго хлеб і стваралі праблемы на роўным месцы. З другога, адвакаты жылі заможна, атрымоўвалі шалёныя ганарары і пры гэтым ні за што не адказвалі. Па разуменні начальніка турмы, адвакаты толькі і ўмелі, што балбатаць і падманваць. Да каго б другога Тарлецкі не выйшаў, але гэтым разам прыехаў сам Адальф Бычкоўскі. Знакаміты прыгажун, які меў грунтоўныя сваяцкія сувязі ў Бельведэры, а таму і браўся за відавочна безнадзейныя справы. І часцей за ўсё перамагаў.

Зыгмунд Тарлецкі абцягнуў кіцель і сам выйшаў у передпакой свайго кабінета насустрач знакамітаму адвакату. Адальф Бычкоўскі весела пасміхнуўся:

— З Калядамі, пан начальнік.

— Кава, каньяк, гарбата? У мяне ёсць цудоўнае дацкае пячэнне, — прапанаваў турэмшчык.

Адвакат расхінуў футра і элегантным рухам выцягнуў залаты гадзіннік, шчоўкнуў накрыўкай.

— На жаль, не змагу скласці кампанію. На дзве гадзіны прызначана судовае паседжанне. Але за прапанову ўдзячны.

Тарлецкі правеў наведвальніка ў кабінет.

— А я думаў, мы пасядзім, пагаворым. І я пачую навіны адтуль, — начальнік турмы закаціў вочы ўгару.

— Другім разам — абавязкова, — пан адвакат паклаў перад начальнікам турмы паперу на дазвол спаткання з кліентам.

— Па гэтай справе другога разу можа і не быць, пан Адальф. Я чуў, што праз тыдзень Краеўскага забяруць ад нас.

— Хто казаў? — насцярожыўся адвакат.

— Пан міністр. Гэта не я, а ён сённяшнюю сустрэчу дазволіў.

— Паглядзім, паглядзім, — працягваў усміхацца адвакат, але позірк быў бязрадасны.

— А які інтарэс пана? Не разумею. Розгаласу ніякага. Пра затрыманне Краеўскага нават у газетах не пісалі, — Тарлецкі падпісаў паперу, пасунуў яе да адваката.

— У нашых газетах не пра ўсё пішуць.

— Не першы год тут працую. Мяркую, нават да суда не дойдзе. І пану не давядзецца красамоўнічаць на публіцы.

Праз колькі часу перад Адальфам Бычкоўскім ахоўнікі адамкнулі дзверы адзіночнай камеры. Краеўскі падняўся, паціснуў адвакату руку.

— Прашу садзіцца, — прапанаваў Бычкоўскаму зэдлік побач са сталом.

Адвакат скінуў футра, распусціў шалік.

— Дарма, пан Адальф, тут холадна.

Бычкоўскі паклаў на стол срэбны партсігар і запальнічку, зірнуў на заледзянелае акенца з прахуканым вочкам.

— Як яна? — насцярожана спытаў Станіслаў.

— Трымаецца, хвалюецца. Яе можна зразумець.

— Вінаваты я перад ёй. Каб не я, і ў яе не было б клопату.

— Не магу яе спыніць, — прызнаўся Бычкоўскі, — не разумее, што цяпер гэтую справу грашыма не вырашыць. Хабар, вядома ж, возьмуць. А зрабіць нічога не зробяць.

— Я гэта ведаю. Тут асабістае. Маё і Дзяржынскага. Ніякай палітыкі за гэтым не стаіць.

— Яны пра ўсё дамовіліся. Я спрабаваў гаварыць з вельмі ўплывовымі палітыкамі, безвынікова. Спакуса для іх вялікая. Польшча і Саветы спрабуюць наладзіць адносіны. Мы ж суседзі, агульная мяжа. І перадача пана на Усход — узаемавыгадная справа. Не ведаю і не хачу ведаць, адкуль за Нёманам да пана такая нянавісць. Слова гонару, пан мне сімпатычны, я рабіў усё. Але суда не будзе.

— Калі мяне перададуць? — спакойна, без хвалявання ў голасе, спытаў Краеўскі.

— Мяркую, абмяняюць праз тыдзень.

— Дзякуй за шчырасць, пан Адальф. Рады быў даведацца, што і сярод адвакатаў ёсць сумленныя людзі.

— Пра сумленне не трэба, за сваю працу я атрымліваю неблагія грошы. Так, я прынёс, што пан прасіў, — Бычкоўскі раскрыў партсігар, — вось гэтая, крыху пакамечаная, пасярэдзіне ляжыць.

Краеўскі крануў папяросу, адвакат згодна хітнуў. Станіслаў пакруціў папяровы муштук у пальцах, памацаў і абярэжна прыладзіў папяросу за вуха.

— Пан Адальф, Вандзе — ані слова. Ні цяпер, ні потым.

— Абяцаю.

— І яшчэ ў мяне будзе адна просьба. Я разумею, што гэтая сустрэча — апошняя. Дапамажыце ёй потым з'ехаць. Пераканайце, што тут ёй шчасця не будзе.

— Куды?

— У Амерыку. Няхай паспрабуе знайсці маіх сяброў-латышоў. Яна іх ведае. Яны дапамогуць.

— Усё, што будзе ад мяне залежаць, я зраблю.

Адвакат узяў партсігар і высыпаў усе папяросы на дашчаты спрэс пакрэмзаны стол. Мужчыны падняліся.

— Ну вось і ўсё.

Краеўскі згодна хітнуў, моцна паціснуў руку. Бычкоўскі грукнуў у дзверы:

— Ахова! Адчыніце!

Ён нават не азірнуўся, калі выходзіў з камеры.

*...хто не кахае, той так і застанецца стаяць на вышэзнай рачной строме. І будзе баяцца наблізіцца да краю, будзе баяцца зрабіць апошні крок. Хто не кахае, той ніколі не абрынецца, а таму і не паляціць, і не ўбачыць уласны цень, што слізгаціць па вадзе. Не адчуе, як за спінай разгортваюцца нябачныя крылы. Ты мяне разумееш, анёл?..*

**Анжэла, як і загадаў ёй доктар, адключыла кропельніцу, вызірнула ў калідор, прычыніла дзверы і набрала сына. Яна гаварыла амаль шэптам.**

**— ...ты дзе зараз?.. Забраў?.. Малайчына... Не, гэта не на дзень нараджэння. Проста так. Падарунак куплю адмысловы... Адкуль грошы? Потым раскажу... А цяпер ідзі дахаты... Не, у лядоўню не стаў. Скора буду. А што гэта шуміць? Машыны? Сынок, сынок, не чую цябе. Ты дзе?**

**Празрыстая пластыкавая скрыначка са свежым торцікам храбуснула пад заднімі коламі чорнага мікрааўтобуса. Пырснулі салодкія крэмавыя кветкі.**

**Са слухаўкі, што слізганула пад бардзюр па мокрым апалым лісці, неслася спалоханае:**

**— ...сынок, сынок! Касцік, дзетачка! А божачкі ж!**

**Дванаццацігадовы Касцік адляцеў на ходнік, яркая кроў паплыла з разбітай галавы. Мікрааўтобус з таніраваным шклом нават не спыніўся, адно мігалка запульсавала на даху.**

*...толькі бабуля Станіслава ўмела заходзіць у мой пакой ціша за анёла. Яна цалавала мяне ў скроню і нячутна сыходзіла. Даруй, што кажу табе пра гэта...*

**Чорны мікрааўтобус спыніўся побач з паштовым фургонам, што стаяў на ўзбочыне шашы. Экспедытар і вадзіцель у аднолькавых сініх ватоўках выбраліся з кабіны.**

**— Адчыняйце будку! — нецярпліва загадаў Альшанскі і зірнуў на гадзіннік.**

**— Пломба, — нагадаў экспедытар.**

**— А па мне, хоць замок.**

**— Калі толькі пад адказнасць начальніка міліцыі.**

**Альшанскі хітнуў, экспедытар асцярожна зняў пломбу з дзверцаў фургона.**

**— Святло запалі, — нервова азваўся сіпаваты голас ужо з цёмных нетраў фургона.**

**— Няма там святла, паважаны, — прамовіў вадзіцель і клацнуў запальнічкай.**

**— Макс, ліхтарык!**

**Альшанскі з памагатымі тройчы перабралі ўсе пасылкі і бандэролі, перамацалі мяхі з лістамі і паштоўкамі.**

**— Слухай, — паклікаў Альшанскі экспедытара і паказаў квітанцыю. — Дзе гэтая пасылка?**

**Той уважліва прагледзеў паштовы бланк, разгрануў свае паперы:**

**— У маім спісе ёсць, — прамовіў і пачырванеў экспедытар, ён таксама залез у фургон, але пасылкі не адшукаў. — А насамрэч, дзе яна?**

**— Думай, — прашаптаў Альшанскі.**

**Экспедытар паглядзеў на шафёра.**

**— Можа, мы яе не ўзялі з пошты? Памятаеш, як летась скрыня з яблыкамі прапала? А колькі праблем потым было. Быццам яблыкі тыя з чыстага золата.**

**— Адзін раз толькі і спыняліся па дарозе, рухавік заглух. Але ж самі бачылі, пломба на месцы вісела, — патлумачыў вадзіцель-маладзён.**

**— Ды знойдзецца. А што там такое? Сапсавацца можа? Вось...**

**— Д'ябал! — Альшанскі ўжо не слухаў, што там далей расказваюць пра яблыкі і сапсаваныя свежаніну з кілбасамі спалоханыя супрацоўнікі Белпошты.**

**Марат паднёс запальнічку да цыгарэты напарніка:**

**— Не магла ж яна сама па сабе знікнуць.**

**— Не магла, — выдыхнуў дымам Макс.**

**Паштовая машына з'ехала. Альшанскі стаяў і тупа глядзеў на дарогу. Ён пачуваўся разгубленым і расціснутым. Яго мара пра шчаслівае і заможнае жыццё знікла. Інтэрполавец пракручваў у галаве самыя розныя варыянты. Кола замкнулася, зноў апошняй надзеяй зрабілася пацыентка мясцовай бальніцы — Ганна Мятліцкая. Толькі яна ведала праўду.**

**У кішэні плашча заблямкаў тэлефон. Альшанскі стаяў нерухома, як не чуў.**

**Марат з Максам пераглянуліся.**

**— Шэф, — гукнуў Марат, — ваш тэлефон.**

**— Што, а?.. — як прачнуўся Альшанскі, — так, тэлефон... Слухаю, калега... З пачатку, маёр, калі ласка... Прабач, не ўехаў... Як, знік труп? Гэта што табе, пачак цыгарэт, запальнічка?.. Са стала ў зале?.. З лядоўні?! Маёр, ты не перабраў часам?.. Еду... Якое дзіцянё? Пра дзіцянё нічога не ведаю, гэта не да мяне. Ці мала па тваім Мсціславе мікрааўтобусаў ездзіць? Чакай у бальніцы. Адбой.**

**— Што здарылася, шэф? — напружыўся Макс.**

**— Труп Феликса Рэя з лядоўні знік, — Альшанскі нервова таргануў пашчэнкай і рагатнуў. — Тут усё не дзякуй Богу. Тут нават законы прыроды не заўсёды дзейнічаюць. Вар'яцтва...**

**Чорны мікрааўтобус развярнуўся на пустой шашы і памчаў да горада...**

*** * ***

**Анжэла заломлівала рукі, мітусілася перад дзвярыма. У аперацыйную яе не пусцілі. Яна, як кожная маці, шаптала малітву, каб толькі ўсё абышлося, і дактары ўратавалі яе дзіцятка — самае лепшае на свеце. Словы малітвы ўзнікалі і прамаўляліся самі сабой...**

**З аперацыйнай выйшаў рэаніматолаг.**

**— Ну-ну, не раві. Што я табе скажу? Выцягнулі, спадзяюся, усё абыдзецца. Добра, што хуткая па вуліцы ехала.**

**— Ну, як жа так? Ён жа ж такі спакойны.**

**— Спакойны-спакойны, а пад машыну трапіў. З гэтымі тэлефонамі-плэерамі павар'яцелі. Па вуліцы ідуць, пад ногі не глядзяць.**

**— Гэта я з Косцікам гаварыла, а потым усё раптам і абарвалася. Машына зашумела.**

**— Ты? — здзівіўся доктар і кранаў Анжэліна плячо, — ну я пайшоў, трымайся. Не замінай людзям працаваць, не сядзі тут.**

**Але як яна магла сысці? Анжэла села на крэсла, сціснула далоні паміж каленяў, а потым згадала, што ў яе на шыі крыжык. Яна выцягнула яго і ўзялася цалаваць.**

**— А божачкі, а што ж мне рабіць?.. — шаптала жанчына.**

**На матавым шкле дзвярэй аперацыйнай з'явіўся цень. Абрыс быў незразумелы, расплывісты. Ці то вялікая птушка, ці то чалавек, які скідае халат. Дзверы хіснуліся, але ніхто не выйшаў. Нешта мяккае і лёгкае, як дым, ці туман, кранула твар медсястры. Анжэла павярнула галаву, бо падалося, што чуе крокі, але не пабачыла таго, хто ідзе. Па шэрай сцяне калідора слізгацеў, аддаляўся цень.**

**Жанчына падхапілася і рушыла следам...**

**Дзверы палаты, ў якой ляжала Ганна Мятліцкая, адчыніліся. Анжэла падышла, зазірнула ў пакой. Ганна спала.**

**Медсястра вярнулася да аперацыйнай, каб быць бліжэй да сына.**

*...і Ванда, і Станіслаў, і мая бабуля разумелі, што нават маленькая сям'я — большая за Радзіму. А я зразумела гэта толькі ў Мсціславе, калі падкошваліся ад млосці ногі і свет плыў у вачах...*

Прахуканае ў акенцы вочка зарасло шэранню.

Станіслаў Краеўскі з заплюшчанымі вачыма ляжаў на дашчаным тапчане. Ён быў чыста паголены і прычасаны. На вуснах то з'яўлялася, то знікала ўсмешка. Станіслаў пракручваў у памяці ўсе шчаслівыя імгненні свайго кароткага жыцця. Ён згадваў кожную сустрэчу з Вандай, яе голас, пах валасоў, смак пацалункаў, трапяткія дотыкі яе чуйных пальцаў. Усяго гэтага было шмат, але ўсё адно — мізэрна мала.

— Ванда, — прамовіў ён уголас. — Калі ты мяне чуеш, ведай, што акрамя цябе ў мяне нікога няма. Мне не шкада майго жыцця. Божа, ты ўсё адно возьмеш яго. Я сам яго табе аддам, толькі зрабі так, каб яна была шчаслівай.

Краеўскі падняўся, стаў на зэдлік, прыклаў далонь да акна. Лёд не падаўся яму халодным. З-пад рукі пабеглі кроплі вады.

— Дзе ты зараз, Ванда?

У дальнім канцы турэмнага калідора гучна бразнулі краты, пачуліся галасы і крокі аховы. Аднастайны тупат набліжаўся. Краеўскі адняў руку ад шкла. Праз след далоні ён згледзеў вялікія сняжынкі, што ляцелі, успыхвалі ў святле турэмнага ліхтара і адляталі ў цямрэчу. Сняжынкі былі залатыя, як тады, у Маскве, у першы вечар, калі яны з Вандай былі разам.

Станіслаў ступіў на каменную падлогу.

Крокі набліжаліся.

Мокрыя пальцы разадралі папяровы муштук папяросы. Маленькая ампула выслізнула на вільготную далонь.

З калідора даляцеў нягучны смех ахоўнікаў. Бразнула вязка ключоў.

Краеўскі паклаў ампулу ў рот, сеў на тапчан. Тонкае шкло храбуснула. Гаркаватая вадкасць разлілася па языку.

— Ванда... — прамовіў Краеўскі і глынуў.

Яго маладое цела сціснулася. Ён скрыгатнуў ад імгненнага болю зубамі і прываліўся да шурпатай сцяны.

Ён так і сядзеў: малады, прыгожы, з нерухомым позіркам, быццам глядзеў на любімую радзімку шэрымі, як мокры лёд, вачыма.

*...у восьмым класе я пайшла з сяброўкамі на каток. І так здарылася, што моцна падвярнула нагу. Мая першая экскурсія ў Вільню накрылася. Але я не шкадую. Цэлы тыдзень праседзела дома разам з бабуляй. З раніцы да позняга вечара я распытвала яе пра маладосць, пра Ванду, пра Станіслава. Яна прыходзіла да мяне ў пакой, сядала ў фатэль, вязала шалік. А паколькі ўвесь час расказвала, то памылялася, рабіла лішнія петлі, працу даводзілася рабіць наноў. За цэлы тыдзень яна не змагла прасунуцца і да паловы. Але я за тыя дні даведалася столькі, што хопіць на дзесяць кніг. Я і зараз чую, як звініць пруток аб пруток, як мякка гупаецца вялікі клубок у кардонцы.*

*І чую голас бабы Стасі — ціхі і зусім не стары. Калі яна расказвала пра Варшаву, Гданьск, Беласток, то незаўважна пераходзіла на польскую мову. Спачатку адно-два словы, а потым ужо гучалі цэлыя сказы. Баба спахоплівалася, калі я раптам пра нешта перапытвала і ставіла націск у нашых словах на перадапошні склад. За той тыдзень зімовых вакацый я і вывучыла польскую мову. А потым мне засталося адно навучыцца чытаць на ёй. Здаецца, у перадапошні вечар баба Стася прыйшла ў мой пакой не з вязаннем, а з пакункам. Спачатку я падумала, што яна прынесла вялікую кнігу, магчыма, Біблію. Бабуля перарэзала нажніцамі раскудлачаны руды шпагат, разгарнула шэрае палатно і падала мне... І тут я здагадалася, што гэта менавіта той партрэт, пра які яна мне расказвала, той, які ёй аддала Ванда. «Ты ўжо дарослая, і цяпер ён будзе належаць табе», — сказала бабуля. Я трымала ў руках цяжкаватую, учарнелую ад часу дошку. Разглядала суворы твар, намаляваны на ёй. Рыцар быў рыхтык такі, якім уяўляўся мне. Зведзеныя да пераносся бровы, уважлівы позірк зялёных вачэй. «А мне яго давядзецца сваёй унучцы аддаць?» — абсалютна сур'ёзна спытала я. Баба Стася разгублена пасміхнулася: «Сама вырашыш, каму ён павінен належаць». Наступным вечарам, калі я нарэшце сабралася выйсці на вуліцу, у рукаве паліто мяне чакаў новы доўгі шалік — белы, як снег...*

Ванда аддала амаль усё, што мела, каб арганізаваць Краеўскаму ўцёкі з Варшаўскай турмы, але яе падманулі. Адно, што яна здолела, не без дапамогі знакамітага адваката Бычкоўскага, гэта выкупіць за хабар цела Станіслава Краеўскага.

Яна перавезла яго ў Беласток, бліжэй да Радзімы, і пахавала на гарадскіх могілках. Рэшты золата хапіла, каб купіць кватэру на ўскраіне горада непадалёк ад кладоў. Праз пяць месяцаў яна нарадзіла дачку, а пры хрышчэнні ў касцёле назвала дзяўчынку Станіславай.

Замуж Ванда Мятліцкая так і не выйшла.

Пасля Другой сусветнай вайны дваццацідвухгадовая Станіслава Мятліцкая перабралася ў Мінск.

*...а яшчэ я хачу прыгожую сукенку: белую ў сінія «гарохі», з шаўковым каўнерыкам, аздобленым празрыстымі карункамі. Зрабі так, каб мяне ў ёй пахавалі...*

**Ганна выціскала са старога опеля ўсё магчымае. Стрэлка перапаўзла лічбу «сто дваццаць». Фелікс расціснуў парожні пачак і павярнуўся, каб узяць з задняга сядзення куртку.**

**— Табе прыпаліць цыгарэту? — спытаў ён.**

**— Найн.**

**Фелікс зірнуў у задняе шкло і застыў.**

**— Што гэта там? Хто?**

**Ганна адразу згасіла фары і габарыты.**

**— Бачу.**

**— Гэта яны? — голас Фелікса выдаў сполах...**

**...Альшанскі пераможна пстрыкнуў за акно толькі што распаленую цыгарэту:**

**— Яны!**

**— Шэф, з мігалкай пойдзем? — Макс углядаўся ў цемру, дзе толькі што пульсавалі дзве рубінавыя кропкі габарытаў старога опеля.**

**— Цяпер без розніцы, ім не ўцячы, — Альшанскі прыціснуў клавішу рацыі. — «Зямля», «зямля», я «неба». Яны на падыходзе, перакрывай дарогу.**

**— Чую вас, «неба». Мы на пяцьдзесят трэцім... — азвалася рацыя.**

**Макс прыціснуў педаль акселератара. Стрэлка спідометра зрушылася, папаўзла да лічбы «сто сорак».**

**Марат адшпіліў рэмень бяспекі, дастаў пісталет. Праз мінуту ў святле фар вымаляваўся заляпаны гразёй багажнік опеля. Легкавік крыху скідаў хуткасць.**

**— Акуратней, Макс, адлегласць трымай.**

**— Нешта не бачу нашых вайскоўцаў, — прамармытаў Марат, углядаючыся перад сабой.**

**І тут з цемры на скрыжаванне пасунуўся цяжкі вайсковы аўтамабіль з кунгам, доўгія антэны хісталіся.**

**— Стаяць, гады! — выгукнуў Альшанскі.**

**Таго імгнення, якое і пралічыць цяжка, хапіла, каб опель па ўзбочыне праскочыў перад самым носам цяжкай вайсковай машыны.**

**Макс крутануў руль управа, мікрааўтобус кінула, пукатыя фары грузавіка мільганулі за бакавым шклом, дзверцы з віскам дзеранулiся аб магутны бампер, толькі жарынкі паляцелі. Пад коламі храбуснуў гравій. Мікрааўтобус не ўтрымаўся на ўзбочыне і паляцеў пад адхон. Два разы перакуліўся праз дах і ляснуўся дзверцамі аб старое дрэва, што самотна стаяла пры дарозе. Таполю, аднаму не абхапіць, страсянула. На пакарабачаную машыну, як манеты на дамавіну, пасыпалася залатое лісце.**

**Стала ціха-ціха, быццам анёл праляцеў...**

**...праз які кіламетр у святле фар опеля з'явілася постаць у белым адзенні. На шурпатым палатне дарогі ляжаў крылаты цень, рыхтык такі, як на карціне. Анёл трымаў у руцэ важкі пакунак з сургучнымі паштовымі пячаткамі.**

P.S. Сенсацыяй Лонданскага аўкцыёну «SOTBIS», які адбыўся 21 кастрычніка 2006 года, стала з'яўленне невядомай раней карціны нямецкага мастака эпохі Адраджэння Альбрэхта Дзюрэра — «Анёл са свечкай» (палатно, алей, 580 х 440 мм). Гаспадар лота пажадаў застацца невядомым. Карціну набыў за дваццаць два мільёны фунтаў стэрлінгаў нямецкі барон Гельмут фон Штайн.

## САРМАЦКІ ПАРТРЭТ

*На сцяне кармеліцкага касцёла, збудаванага ў Мсціславе ў гонар Дзевы Марыі, ёсць дзве фрэскі. На адной невядомы жывапісец, мяркуючы па стылі, італьянец, намаляваў захоп горада Мсціслава ў 1654 годзе войскамі князя Трубяцкога. На другой — жахлівай у сваёй выразнасці — разню мсціслаўскіх ксяндзоў. Ворожыя войскі, калі захапілі і падпалілі горад, выразалі ўсіх, ці не да апошняга, каталіцкіх святароў. Катавалі, шукалі схаваныя імі скарбы...*

Задушлівай і кароткай ліпеньскай ноччу, калі са званіцаў касцёлаў і цэркваў ужо былі відаць на даляглядзе вогнішчы, чацвёра манахаў: двое з езуіцкага кляштара, двое з кармеліцкага зносілі ў сутарэнні ўсё, што лічылі самым каштоўным. Так вырашылі тыя, хто быў над імі. У каменных лёхах пад нізкімі неатынкаванымі скляпеннямі стаяў доўгі дубовы стол, побач з ім — два абабітыя жалезам куфэркі. Ярка гарэлі свечкі, цяпер іх было не шкада. Не сёння, дык заўтра горад захопяць ворагі.

— Біскуп кажа, — прамовіў самы малады з манахаў — брат Антоній, — што ўсе войны калі-небудзь канчаюцца.

— Яму добра, ён з'ехаў, — сказаў стары езуіт — брат Якуб, узяў конаўку, чарпануў з цэбра вады і прагна выпіў.

Малады манах сеў на лаву:

— Здаецца, усё сабралі.

Манахі глядзелі на залатыя манеты, ланцугі, крыжы, кубкі, на кляйноты спакойна, без хіжага бляску ў вачах.

— Мы павінны, — ціха мовіў стары езуіт, — схаваць касцёльныя скарбы ў розных месцах. А калі вайна скончыцца і захопнікі сыдуць, мы адновім храмы ў новай велічы. Мы — свой, вы — свой. Прыедуць мастакі, намалююць на сценах фрэскі.

Разьбяры зробяць і паставяць новых Найсвяцейшую Дзеву Марыю, Архангела Міхаіла, Збавіцеля, анёлаў...

— А гэта калі будзе? Скора? — нецярпліва спытаў брат Антоній.

— Мы, можа, і не дачакаемся, а ты — самы малады з нас, хоць табе і чацвёрты дзясятак пайшоў, — сумна прамовіў стары шырокі ў плячах езуіт — брат Якуб.

Двое другіх манахаў пералічылі найкаштоўнейшыя камяні, іх набралася ладная прыгаршча, перасыпалі іх у плыткі залаты кубак.

— Рыштунак тут?

Брат Антоній падхапіўся, узяў з-пад сцяны кошык, выклаў на стол сякерку, пілку, цвікі, свярдзёлкі, нож з чорным лязом:

— Вось, усё, што знайшоў.

— Гэтага хопіць, — сказаў манах-кармеліт з вузкім доўгім тварам і дужымі жылістымі рукамі — брат Філіп.

Ён агледзеўся:

— Дзе партрэт добрага чалавека?

Маўклівы брат Марк падняў века скрыні, працёр рукавом партрэт фундатара касцёла Найсвяцейшай Дзевы Марыі Караля Мадалінскага і паклаў перад кармелітам. Той зірнуў на дошку, пакруціў у руках, колькі разоў калупнуў дзюбкай нажа з тарца, паставіў на каменную падлогу, сціснуў нагамі.

— Браты, святла дайце.

Манахі са свечкамі ў руках абступілі майстра. Брат Філіп спачатку ўзяў самы вузкі свярдзёлак, намеціў чатыры дзіркі. Паклаў свярдзёлак на залатыя манеты, перажагнаўся і ўзяў большы — таўшчынёй з палец.

— Прытрымай дошку, — папрасіў маладзейшага.

Гостры рыштунак захрабусцеў, з-пад яго папаўзлі габлюшкі.

— Цвёрдае дрэва, — сказаў брат Філіп. — А ведаеце, браты, што я любіў рабіць больш за ўсё?

— Лыжкі, — азваўся стары езуіт.

— Не... Лыжку і селянін зробіць. Для гэтага вялікага майстэрства не трэба.

— Тады што? Грабеньчыкі дзявочыя? — дапусціў маладзейшы манах.

— Эх, нічога вы не разумееце. Найбольш за ўсё мне падабалася дзіцячыя калыскі рабіць.

На суворых тварах манахаў з’явіліся ўсмешкі.

— І рабіць прыемна, і аддаваць у радасць. Раблю і ўяўляю сабе дзіцятка. Маленькае, як анёльчык. Ляжыць ціхенька, а калі заплача, маці яго пагушкае, паспявае, яно зноў і засне... А як пошасць забрала ў мяне сына з жонкай, рамяство тады і кінуў... Гатова, — брат Філіп выкалаціў габлюшкі, дзьмухнуў у кожную з чатырох адтулін, праверыў указальным пальцам, ці не засталося чаго ўсярэдзіне. Ну, браты, падавайце па адным.

І вялікія, і дробныя рубіны, смарагды, сапфіры, колькі дыяментаў... Нязграбныя мужчынскія пальцы падавалі былому цесляру каштоўныя камяні. Брат Філіп па адным апускаў іх у адтуліны. Ён усё разлічыў, нават самы буйны рубін праваліўся ў дзірку.

— Трымай свечку, — сказаў стары езуіт, — а вы што пасталі? Складайце золата па куфрах і хутчэй, ноч кароткая.

Воск з тоўстай свечкі сцякаў у адтуліны. Брат Філіп вялікім пальцам зараўняў тарэц дошкі, сабраў з падлогі шчопаць пілавіння, зацёр бліскучы застылы воск, потым замазаў яшчэ і пылам.

— Цяжкаваты, — узважыў на далоні партрэт, прыціснуў да вуха, страсянуў, — не адгукаецца. Антоній, збегай, зірні — ці не падымаецца сонца?

Малады манах падаўся стромымі сходамі наверх. Калі рыпнулі і зачыніліся за ім дзверы, Філіп нягучна прамовіў:

— Брат Якуб, Антоній не здрадзіць?

Стары езуіт напружыўся:

— Усе мы людзі. А ўсё жывое смерці баіцца. І я баюся, і ты. Але спадзяюся на

Пана Бога. Што мы? Вось гэтае пілавінне — падзьме скразняк, ці агонь пыхне, і следу нашага на зямлі няма. У кім упэўнены — дык у браце Марку. Ён і імя сваё ніколі не скажа. Нямко.

Філіп з Якубам глянулі на Марка, той зразумеў, што згадалі яго і захітаў, прыклаў руку да грудзей. Як ва ўсіх нямых, у яго быў вельмі рухавы твар, як у старой малпачкі.

Брат Антоній вярнуўся хутка:

— Дымам з-за ракі цягне.

— Хаты паляць, нелюдзі, — сказаў Філіп. — Людзі будаваліся, а яны ўсё дымам пусцілі. Але нічога, усіх не заб’юць, а лесу багата.

Брат Якуб узяў партрэт, павагаўся, у якую скрыню яго пакласці, і апусціў у тую, што стаяла на крок бліжэй да дзвярэй.

Усе чацвёра ўкленчылі, памаліліся.

Згаслі свечкі. Якуб з Антоніем падхапілі куфэрак, у якім паверх золата ляжаў партрэт фундатара касцёла. Філіп з Маркам панеслі другі. Калі манахі выйшлі на двор, яны ўзялі пад сцяной рыдлёўкі, развіталіся і рушылі ў розныя бакі.

Дзесьці далёка скавытаў сабака...

...Мсціслаў пратрымаўся нядоўга. Горад захапілі і спалілі. А праз некалькі дзён уварваліся і ў замак.

Брат Якуб загінуў пад сценамі свайго кляштара, ён біўся да апошняга, але куля трапіла ў сэрца. Брат Філіп адбіваўся сякерай у касцельнай браме, стральцы паднялі яго на дзіды, а потым мёртваму адсеклі галаву. Антонія і Марка ўзялі жыўцом. Нехта падказаў, што гэтыя ведаюць, дзе схаваныя скарбы.

Антонія катавалі доўга, абухом сякеры трушчылі суглобы, палілі жалезам, адсякалі па адным пальцы. Але ён не прамовіў ані слова, як анямеў. Сканаў праз невыносны боль, перастараліся каты. Месца, дзе закапаная другая палова скарбу, паказаў ворагам Марк. Але не ўратавала гэта манаха-нямко ад смерці. Засеклі яго шаблямі і скінулі ў Віхру. Добра, хоць, доўга не катавалі.

*Калі птушка залятае ў дом, нават, калі гэта жаўтагрудая сінічка, імклівая ластаўка, ці самы звычайны верабей, кожны ведае, кепская прыкмета — да смерці. А калі птушка залятае ў храм, справа звыклая. Бо і Духа Святога малююць у выглядзе голуба. І ў Мсціслаўскім касцёле Дзевы Марыі ёсць такая фрэска.*

*У той дзень заляцеў у касцёл голуб. Банальны — шэры, з бурштынавымі пацеркамі-вочкамі і чырвонымі лапкамі. Пакружляў па храме, палапатаў крыламі. І не знайшоў сабе другога месца, як сесці на невялікі партрэт вусатага шляхціца Якуба Мадалінскага. Ксёндз, міністрант Косцік — сынок медсястры з раённай бальніцы, тры жанчыны, якія прыбіраліся пасля імшы, убачылі, як дошка хіснулася, сарвалася з іржавага цвіка, упала на каменную падлогу і раскалолася.*

*Па плітах заскакалі рознакаляровыя каменьчыкі.*

*— І хто цяпер скажа, што цудаў не бывае?..*

**Мінск. 2007—2008**